◂ № 31 (254) ◂ 26 жніўня ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



**ТАЦЦЯНА РЭВЯКА**

Стар. 6

**БЕЗГАСПАДАРНАЯ ФУНКЦЫЯ**

У прынцыпе, сіла і магчымасць улады ўтрымліваюцца не ў ёй самой, а ў яе здольнасці ўвесь час быць «сваёй» для масавай свядомасці

Стар. 4

**БІТВА ЗА БЕРЛІН**

18 верасня адбудуцца выбары ў парламент Берліну, якія шматлікія СМІ называюць рэпетыцыяй выбараў у Бундэстаг у 2013 годзе. Пра ход кампаніі журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з нямецкім журналістам Маціясам Кабенам

Стар. 29

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**

Стар. 9–24

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ТРАГЕДЫЯ ЗАХОДНЯЙ АСОБАЙ...**

Нарыс Ігара Кузняцова

▸ **З НАГОДЫ**

# НЕ МЯСАМ АДЗІНЫМ

Вольга ХВОІН

**Адсутнасць валюты ў абменніках, мяса — у крамах… Праблема імкліва перацякае з маральнай у матэрыяльную.**

Усе ведаюць, дзе ў выпадку пільнай патрэбы набыць замежныя банкноты і чым замяніць свежую ялавічыну ў сваім рацыёне. Тым больш, што мясная выразка не такі і рэдкі тавар: пяцьдзесят-шэсьдзесят тысяч, экскурсія па некалькіх крамах — і жаданы дэфіцытны прадукт у вас на руках. Але сам факт таго, што традыцыйная для свядомасці і стала прадукцыя ёсць аб'ектам здабычы, а не толькі таварна-грашовых адносінаў, уносіць істотныя карэктывы ў погляды на айчынную эканоміку і яе кіраўнікоў. А яны абяцаюць разруліць праблему цягам некалькіх тыдняў, хаця на практыцы атрымліваецца, як у казцы, — чым далей, тым больш страху.




Кошты ўзлятаюць з кожным днём усё вышэй. Не набыў учора — сёння заплаціш больш. Менавіта ў такой звязцы найперш і адчуваецца валютны дэфіцыт. У дні заробку ў сталічных супермаркетах вялікія чэргі — рублі таропка канвертуюць у тавары. Зялёныя ды рознакаляровыя наяўныя паперкі капіталістычных краін шарагаваму беларусу не надта патрэбныя — за мяжу ездзіць невялікі працэнт беларусаў, а крамы цяпер ужо з мэтай «купляць беларускае» наведваюць штодня ўсе.

Высновы ажыятажны попыт на алей і цукар цяпер выклікаў дзіцячай забаўкай. Мясакамбінаты не проста падвышаюць кошты, на што дае зялёнае святло Мінэканомікі, але і шукаюць рэнтабельныя рынкі збыту за мяжой.

У выніку невялікія крамы прапануюць сваім наведвальнікам лычы і капыты ў прамым сэнсе. Да слова, ад 24 жніўня на 10 працэнтаў павышаныя адпускныя цэны на свініну. Гэта прадугледжана пастановай Мінэканомікі ад 22 жніўня № 135. Лімітаваная максімальная адпускная цана на свініну патушную першай і другой катэгорый складзе 13 225 рублёў за 1 кілаграм (раней — 12 023), трэцяй катэгорыі — 12 348 рублёў за 1 кілаграм (раней — 11 225). Папярэдні раз гранічныя адпускныя цэны на свініну павышаліся 8 жніўня на 5 працэнтаў. Відавочна, гэтае падвышэнне далёка не апошняе.

Спадзявацца, што кошты на прадукты харчавання будуць трымацца на месцы, — наіўна. У любой гаспадарцы, дзе вырошчваюць скаціну, можна даведацца пра замежнае пахожанне камбікармоў і харчовых дабавак. І ў такой праекцыі можна чакаць ці абсалютнай забароны імпарту мяса — атрымаем банкруцтва прадпрыемстваў, ці прымусовай пастаўкі на ўнутраны рынак — але цэннік па колькасці лічбаў хутка будзе нагадваць нумар тэлефона.

Пакуль жа рэгуляваныя спажывецкія кошты на мяса для вытворцаў стратныя. На свініне губляецца каля васьмі працэнтаў рэнтабельнасці, на ялавічыне — дваццаць. Як паралель можна было б прывесці Украіну: адтуль у Расію і Беларусь экспартуецца процьма тавараў — ад цукерак да алею. Але паўднёвыя суседзі зусім не скардзяцца на голыя паліцы ў крамах. То бок праблема не ў хцівых вытворцах мяса, якія толькі і думаюць, як бы падсадзіць свайго спажыўца на вегетарыянскую дыету ды сарваць банк за мяжой.

І калі па мясу пакуль кіраўніцтва дзяржавы радыкальных захадаў не рабіла, то валютная гісторыя рэгулярна папаўняецца новымі рашэннямі. Апошняе мае шанцы заняць ганаровае месца ў рэйтынгу ідэй, якія дэмаралізуюць беларусаў. Нацыянальны банк Беларусі прапанаваў шэрагу буйных беларускіх банкаў пашырыць свае магчымасці ў набыцці ў грамадзян наяўнай замежнай валюты для яе далейшага продажу на сацыяльна значныя мэты. Адпаведны ліст Нацыянальнага банка накіраваны ў крэдытна-фінансавыя ўстановы. Ім рэкамендавана разгледзець пытанне аб ажыццяўленні іх асобнымі абменнымі пунктамі і касамі, размешчанымі на тэрыторыі буйных гандлёвых цэнтраў і рынкаў, аперацый толькі па куплі наяўнай замежнай валюты з аплатай у наяўных беларускіх рублях.

Набытую замежную валюту банк мусіць накіроўваць на продаж насельніцтву для аплаты сацыяльна значных патрэб (лячэнне за мяжой, пражыванне і навучанне студэнтаў за мяжой, выезд за межы рэспублікі ў сувязі з хваробай або смерцю сваякоў ды інш. Бывайце, адпачынкі за валюту, набытую па чорным курсе. Бывайце, пастаўшчыкі-імпарцёры. Домік на вёсцы і кухонны камбайн «Белвар» — наш адказ.

Каб атрымаць дазвол на правядзенне такіх аперацый, банку варта звярнуцца ў галоўнае ўпраўленне валютнага рэгулявання і валютнага кантролю Нацыянальнага банка за адпаведным дазволам.

Два месяцы таму прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч абяцаў: «Усе пытанні ў эканамічным жыцці Беларусі цягам бліжэйшага месяца, максімум двух, будуць вырашаны. Гэта тычыцца валютнага рынка». У ліпені было абвешчана, што Савет міністраў і Нацбанк Беларусі збіраюцца прыняць меры, каб мець поўны кантроль над валютай у краіне. Прынялі. Цяпер, як жартуюць беларусы, засталося толькі ўвесці абавязковую здачу валюты насельніцтвам па аналогіі з тым, як некалі прымушалі здаваць метал. І ўвесці прадразвёрстку — гэта адразу закрые дэфіцытныя дзіркі ў сховішчах дзяржавы.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# СПРАВА БЯЛЯЦКАГА

Вольга ХВОІН

**Жонка арыштаванага праваабаронцы Алеся Бяляцкага Наталля сустрэлася з польскімі палітыкамі. Сына — Адама Бяляцкага — ацтрафавалі за «нецэнзурную лаянку і супрацў міліцыі». А калег — звазілі ў міліцэйскі пастарунак.**

Супрацоўнікі сілавых ведамстваў захоўваюць пільную ўвагу да ўсяго, што звязана з Алесем Бяляцкім. На Кастрычніцкай плошчы Мінска 23 жніўня былі затрыманыя шэсць праваабаронцаў (Алег Мацкевіч, Вікторыя Равінская, Дзмітрый Салаўёў, Марына Статкевіч, Алена Лапцёнак і Алесь Абрамовіч), якія праводзілі акцыю салідарнасці з арыштаваным Алесем Бяляцкім. Яны раздавалі ўлёткі ў падтрымку Бяляцкага, прыкладна праз дзесяць хвілін усе былі затрыманыя супрацоўнікамі ДАІ і міліцыі, а потым дастаўленыя ва УУС Цэнтральнага раёна Мінска. Пасля складання пратаколаў, зняцця адбіткаў пальцаў і фатаграфавання затрыманых адпусцілі.

У той жа дзень сына праваабаронцы Адама Бяляцкага абвінавацілі ў нецэнзурнай лаянцы і супраціве міліцыянтам падчас акцыі «Стоп-бензін». Адама аштрафавалі на 350 тысяч рублёў.

Тым часам жонка Алеся Бяляцкага наведвала Польшчу, дзе мела сустрэчы з прадстаўнікамі палітычнай эліты краіны-суседкі, якая выдала фінансавую інфармацыю пра праваабаронцу беларускім уладам.

Стварэнне ў Польшчы механізмаў супрацоўніцтва і дапамогі рэпрэсаваным у Беларусі — гэта спроба кампенсацыі тых наступстваў, якія сталі вынікам прадастаўлення польскай пракуратурай банкаўскіх рахункаў Алеся Бяляцкага. Так сказаў Наталлі Бяляцкай пасля сустрэч у Сейме віцэ-старшыня соймавай камісіі замежных спраў Роберт Тышкевіч.

СКАНДАЛ

# ЛІТОЎЦАЎ НЕ ПУСЦІЛІ

Генадзь КЕСНЕР

**Здымачную групу літоўскага тэлеканала LTV 24 жніўня не пусцілі ў Беларусь.**

Карэспандэнту тэлеканала Руце Ланкінінкайтэ на памежжы паведамілі, што яна з'яўляецца персанай нон-грата ў Беларусі.

Рута Ланкінінкайтэ мае акрэдытацыю пры Міністэрстве замежных спраў Беларусі. Літоўскія журналісты меліся зрабіць матэрыял пра тое, як жывуць беларусы ва ўмовах сённяшняй эканамічнай сітуацыі.

У пашпарт журналісткі, якая рыхтуе сюжэты для інфармацыйнай праграмы «Панарама» нацыянальнага тэлеканалу «Lietuvos televizija», беларускія памежнікі паставілі штамп пра тое, што віза анулявана, а таксама ўнеслі запіс, што Руце Ланкінінкайтэ забаронены ўезд у Рэспубліку Беларусь.

Да гэтага журналістка разам з аператарам Ёнасам Грышконісам атрымлівала службовыя візы і гадавыя акрэдытацыі, якія дазваляюць наведваць Рэспубліку Беларусь.

З гэтай нагоды 24 жніўня ў МЗС Літвы дзеля дачы тлумачэнняў з нагоды адмовы ўпусціць у Беларусь літоўскіх журналістаў быў запрошаны беларускі амбасадар Уладзімір Дражын, паведаміла BNS прэс-сакратар міністра замежных спраў Літвы Рэната Лаздзін.

Старшыня ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» Жанна Літвіна звязвае забарону на ўезд у Беларусь групе літоўскіх тэлевізійшчыкаў з імкненнем беларускіх уладаў стварыць інфармацыйную блакаду краіны. «Але такія захады не толькі не з'яўляюцца папулярнымі, але ёсць сорамам для краіны, калі яна не ўпускае журналістаў. Але ўсё роўна гэта не метад, не спосаб, каб адцэнзураваць, адкантраляваць інфармацыю пра ўнутраную сітуацыю ў краіне, бо ў наш час з развіццём інтэрнэту такога кшталту штучныя бар'еры ўсё роўна пераадольваюцца людзьмі нашай прафесіі», — падкрэсліла ў інтэрв'ю «Новаму часу» кіраўнік БАЖ Жанна Літвіна.

Нагадайма, што ў жніўні літоўскія памежнікі таксама анулявалі візу і не ўпусцілі ў Літву намесніка міністра юстыцыі Беларусі Алу Бодак. Прычынаю сталася тое, што чыноўніца ўнесеная ў так званы «чорны спіс» Еўрапейскага Саюза.

ПАМЯЦЬ

# ВЫПРАВА Ў КАТЫНЬ

Таццяна УЛАСЕНКА

**23 жніўня беларускія грамадскія дзеячы, палітыкі прынялі ўдзел у жалобнай выправе да мемарыяльнага помніка «Катынь», каб ушанаваць памяць ахвяраў сталінізму і нацызму.**

Сярод удзельнікаў акцыі былі гісторык Ігар Кузняцоў, беларускі дысідэнт Сяргей Ханжанкоў, краязнаўца Анатоль Валахановіч, намеснік старшыні Руху Салідарнасці «Разам» Аляксандр Макаеў, маці зніклага журналіста Вольга Завадская, родныя палітвязняў.

Ушанаванымі гасцямі жалобнай выправы сталі праваслаўны айцец Леанід Акаловіч і кіроўны япіскап Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы ўладыка Святаслаў, што спецыяльна прыехаў на акцыю з Таронта.

На месцы мемарыялу «Катынь» святары правялі ліцію па загінулых. Удзельнікі акцыі запалілі знічкі, усклалі кветкі, прачыталі малітву. На гэтым месцы па загаду Берыя і Сталіна ў 1939–1940-х гадах былі забіты афіцэры Войска Польскага, зняволеныя смаленскай турмы і смаленскіх лагераў.

Гісторык Ігар Кузняцоў адзначыў: «На сёння вядомы імёны і месцы пахаванняў усіх палякаў, расстраляных у Катыні; таксама вядома, што сярод расстраляных — 1560 «безыменных» ураджэнцаў Беларусі. Галоўнай таямніцай катынскага расстрэлу на сённяшні час так і застаецца менавіта «беларускі спіс». Гісторык нагадаў прысутным, што перад выбарамі А. Лукашэнка абяцаў польскім журналістам, што будзе шукаць гэты спіс асабіста.

Арганізатарамі паездкі сталі Рух «За Свабоду», секцыя «Мемарыял», Рух Салідарнасці «Разам».

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ЛЯБЕДЗЬКА БОЛЬШ НЕ КРЫМІНАЛЬНІК

Генадзь КЕСНЕР

**Раніцай 25 жніўня старшыня АГП Анатоль Лябедзька знайшоў у паштовай скрыні ліст за подпісам старэйшага следчага ГУУС Мінгарвыканкаму капітана Дышэнкі.**


Photo.ByMedia.Net

У лісце паведамляецца, што крымінальная справа ў дачыненні да палітыка спынена з прычыны адсутнасці ў яго дзеяннях складу злачынства.

«Паведамляем вам, што па крымінальнай справе №100111110362, заведзенай 20.12.2010 па ч.ч. 1, 2 арт. 293 КК Рэспублікі Беларусь па факту здзяйснення масавых беспарадкаў крымінальны пераслед у дачыненні да Лябедзькі А. У. пастановай ад 23.08.2011 спынены на падставе п. 2 арт. 29 КПК у сувязі з адсутнасцю ў дзеяннях складу злачынства», — гаворыцца ў лісце.

Амаль чатыры месяцы Анатоль Лябедзька правёў у следчым ізалятары КДБ, потым быў вызвалены пад падпіску аб нявыездзе.

«Безумоўна, гэта такая прыемная нечаканасць, чаго тут хаваць, — кажа палітык. — Я думаю, што мой статус палітычнага закладніка працягнецца. Што датычыць мяне асабіста, я задаволены, а там паглядзім».

Такі паварот падзей Анатоль Лябедзька звязвае, у першую чаргу, з той агульнай надзвычай складанай сітуацыяй, якая склалася ў Беларусі. «Канфрантацыя ў рознай ступені існуе і з Захадам, і з Усходам, трэба развязваць тыя вузлы, якія створаны, і, натуральна, калі ёсць палітычныя вязні, калі ёсць палітычныя закладнікі, то гэта рабіць цяжка. Гэта такое рашэнне, якое прымаецца са скрыпам на зубах, супраць волі і жадання тых людзей, якія сёння правяць на Беларусі. Я не спыняў сваю палітычную дзейнасць. Апроч таго, я не збіраўся хадзіць па тых калідорах, якія стваралі для мяне праваахоўныя органы. Нягледзячы на падпіску аб нявыездзе, я ездзіў у Горкі (дзеля падтрымкі палітвязня Змітра Дашкевіча, які знаходзіцца ў Горацкай калоніі — заўв. Г. К.), і ў мяне ў планах былі ўжо іншыя паездкі».

Па словах Анатоля Лябедзькі, ён пакуль не збіраецца неяк рэагаваць на тое, што незаслужана правёў доўгія месяцы ў СІЗА КДБ, а потым працяглы час знаходзіўся пад падпіскай аб нявыездзе. У яго найбліжэйшых планах — паездкі па краіне і сустрэчы з рэгіянальнымі партыйнымі структурамі і актывістамі.

ЭКАЛОГІЯ

# ВОДАЗАБОР У ЦЭНТРЫ КАНФЛІКТУ

Вольга ХВОІН

**Жыхары сталіцы дамагліся сустрэчы з высокімі чыноўнікамі, каб крыху праясніць сітуацыю наконт Севастопальскага парку і свідравінаў пітной вады, што месцяцца ў ім.**

Мясцовыя жыхары пятнаццаць гадоў бароняць парк ад спробаў яго забудаваць. Цяпер да канфлікту дадаўся і водны складнік — мінчане перажываюць, што чыноўнікі ўціхую хочуць закрыць свідравіны з артэзіянскай вадой, каб мець законныя падставы для асваення тэрыторыі ў цэнтры Мінска.

Чыноўнікі Камітэта дзяржкантролю, Генпракуратуры, Мінскводаканалу, Белэнерга, санэпідэмслужбы прыехалі на сустрэчу з жыхарамі раёна, у якім знаходзіцца Севастопальскі парк. Абмяркоўваліся два галоўных пытання: колькі свідравін насамрэч месціцца ў Севастопальскім парку і колькі з іх цяпер працуюць. Такое, здавалася б, простае пытанне паўстала з перапіскі з дзяржслужбоўцамі, якія ў «сваіх паказаннях» рэгулярна блыталіся. Цяпер чыноўнікі запэўнілі, што ўсе дзевяць свідравін у працоўным стане, але тры не дзейнічаюць. Адна з іх адключаная ад энергазабеспячэння па прадпісанню Мінскэнерга, дзве выведзеныя ў рэзерв, бо іх магутнасць не запатрабаваная. Водаспажыванне ў Мінску зменшылася, пітной вады дастаткова.

Кіраўнік ініцыятывы «Еўрапейская перспектыва» Віктар Янчурэвіч дапамагае мясцовым жыхарам весці перапіску з чыноўнікамі наконт лёсу прылеглага парку. Ён гаворыць, што ў жыхароў Першамайскага раёна сталіцы многа нараканняў і на якасць пітной вады, якая ёсць артэзіянскай.

«Вельмі шмат асадку, накіпу застаецца на чайніку пасля кіпячэння, а зверху ў кубку з гарбатай заўжды плавае невядомага паходжання плёнка», — дзеліцца ўражаннямі ад дэгустацыі артэзіянскай пітной вады Віктар. Але прадстаўнік санітарнай службы запэўніў, што вада адпавядае ўсім санітарным нормам. Жыхарам сталічнага мікрараёна патлумачылі, што вада паступае з артэзіянскіх свідравін на станцыю на Макаёнка, дзе змешваецца з вадой, якая пампуецца з падземнага водазабору Волма.

У сталіцы толькі Фрунзенскі, Маскоўскі і частка Цэнтральнага раёну забяспечваюцца вадою з адкрытых крыніц, астатнія — з падземных. Таму скардзіцца на якасць вады нагодаў бышцам бы няма. Дарэчы, прадстаўнік Камітэта дзяржкантролю падчас сустрэчы заявіў, што будзе высвятляць, наколькі адрозніваецца сабекошт вады з мінскага водазабору і вады з Волмы. Ці ёсць логіка ў тым, што свідравіны ў самім горадзе прастойваюць, а ваду пампуюць за многа кіламетраў з Волмы.

Віктар Янчурэвіч мяркуе, што ўся праўда наконт Севастопальскага парку і водазабору на яго тэрыторыі пакуль не вядомая. Таму пошукі ісціны будуць працягвацца. «Засталіся адкрытымі некаторыя пытанні. Свідравіна адключаная, але, паводле запісаў у дакументах, яна некаторы час здабывала ваду. Раней рэзервуар вады на тэрыторыі Севастопальскага парку пільна ахоўваўся, быў агароджаны высокім плотам. Зараз гэтага няма — прыбралі і плот, і ахову. А вакол свідравін і месца, дзе быў рэзервуар, паставілі дэкаратыўныя агароджы. Цяпер туды патрапіць можа кожны, адкрыць люк і нешта закінуць не складае цяжкасцяў. А прадстаўнік Мінскводаканала сказаў, што такую сістэму аховы прадугледжвае праект. У нас тры мэты: каб працавалі свідравіны, палепшылася якасць пітной вады і было ўрэшце прынятае рашэнне аб замацаванні за Севастопальскім паркам статусу, які б гарантаваў яго недатыкальнасць. Бо, калі паглядзець план развіцця горад, то на ім ёсць траса праз Севастопальскі парк. Асваенне гэтай тэрыторыі проста адкладзенае ў часе», — зазначае Янчурэвіч.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# НА МЯЖЫ ДЭФОЛТУ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Беларускі эканамічны цуд скончыўся. Міжнароднае рэйтынгавае агенцтва Moody's не выключае далейшага зніжэння суверэннага рэйтынгу Беларусі, дэфолту і замарожвання валютных дэпазітаў.**




Паводле ацэнак экспертаў міжнароднага рэйтынгавага агенцтва Moody's, у другім паўгоддзі 2011 года Беларусі спатрэбіцца 3–6 мільярдаў долараў ЗША на падтрыманне ўстойлівасці банкаўскай сістэмы і вырашэнне іншых надзённых праблем. Такая ж сума спатрэбіцца краіне ў 2012 годзе для падтрымання ўстойлівасці банкаўскай сістэмы і пакрыцця дэфіцыту плацежнага балансу.

Але адкуль узяць гэтыя грошы? Па разліках Moody's, гэтыя сродкі Беларусь можа атрымаць за кошт знешніх запазычанняў (крэдыты Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС і МВФ), прыватызацыі і свабоднага курсаўтварэння. Пры такім развіцці падзей рэйтынгі беларускіх банкаў захаваюцца на ўзроўні «B3», іх праблемныя актывы вырастуць да 15% да канца 2012 года. Дастатковасць уласнага капіталу банкаў знізіцца да 4%, у 2012 годзе спатрэбіцца іх рэкапіталізацыя з уліваннямі ў эквіваленце 1 мільярда долараў, што, як мяркуюць эксперты Moody's, будзе ажыццёўлена, хутчэй за ўсё, за кошт сродкаў дзяржбюджэту.

На думку экспертаў, захаванне цяперашняй сітуацыі прывядзе да негатыўных наступстваў і паніжэння краінавага рэйтынгу Беларусі з «B3» да «Caa», пагрозы дэфолту. Цяперашняя сітуацыя характарызуецца адміністрацыйным стрымліваннем свабоднага курсаўтварэння, дэфіцытам замежнай валюты, недастаткова цвёрдай манетарнай палітыкай, адсутнасцю выніку ад прыватызацыі і дамоўленасцяў з МВФ аб прыцягненні знешніх запазычанняў.

Пры такім развіцці падзей, як мяркуюць эксперты Moody's, доля праблемных актываў у беларускіх банках вырасце да 20% у 2012 годзе, а ўлады Беларусі могуць пайсці на замарожванне валютных дэпазітаў або іх прымусовую канверсію ў беларускія рублі.

Прагнозы Moody's, хутчэй за ўсё, надзвычай аптымістычныя. Крэдыт Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС на гэты год мы ўжо, здаецца, выбралі. Крэдыт ад МВФ Беларусі «не свеціць», — да таго часу, пакуль не будуць вызваленыя палітвязні. Бо ж у МВФ ёсць амаль рашучы голас ЗША, якія надзвычай прынцыпова ставяцца да сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі.

І не толькі з правамі чалавека. Беларускія ўлады самі сабе падклалі свінню. 19 жніўня стала вядома, што Беларусь замарожвае праекты па абмене высокаўзбагачанага ядзернага паліва з ЗША ў адказ на ўвядзенне Злучанымі Штатамі эканамічных санкцый.

«Увядзенне новых амерыканскіх эканамічных санкцый ідзе насуперак духу ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва. У гэтых умовах беларускім бокам прынята рашэнне аб замарожванні распрацаваных сумесна з ЗША праектаў па абмене высокаўзбагачанага ядзернага паліва ў межах ініцыятывы па зніжэнні глабальнай пагрозы міністэрства энергетыкі ЗША, а таксама па стварэнні праграмы МБА пры Беларускім дзяржаўным універсітэце», — інфармуе прэс-сакратар МЗС Андрэй Савіных. Пры гэтым, падкрэслівае Савіных, «Беларусь па-ранейшаму будзе арганізоўваць фізічную бяспеку ядзернага паліва ў поўнай адпаведнасці з міжнароднымі абавязацельствамі ў галіне нераспаўсюджвання».

Ну і хто дасць крэдыт краіне з нестабільнай эканомікай, краіне, якая не выконвае дамоўленасці? Бо 1 снежня 2010 года на саміце АДКБ у Астане дзяржсакратар ЗША Хілары Клінтан і кіраўнік МЗС Беларусі Сяргей Мартынаў выступілі з сумеснай заявай, у якой пацвердзілі прыхільнасць сваіх краін ядзернай бяспецы і ядзернаму нераспаўсюджванню. Мартынаў аб'явіў, што Беларусь прыняла рашэнне аб ліквідацыі ўсіх сваіх запасаў высокаўзбагачанага ўрану і мае намер ажыццявіць гэта да наступнага саміту па ядзернай бяспецы ў 2012 годзе.

Не будзе вывазу ядзернага паліва — не будзе дапамогі ЗША. Не будзе дапамогі ЗША — не будзе грошай. Не будзе грошай — будзе дэфолт. Грошы ўзяць няма адкуль. Настолькі няма, што Нацбанк прапанаваў шэрагу буйных беларускіх банкаў адбіраць валюту, якую кліенты здаюць у абменныя пункты.

Канфіскаваная валюта нібыта пойдзе для наступнага продажу на сацыяльна значныя мэты. Як паведаміў начальнік упраўлення інфармацыі Нацбанка Аляксандр Цімашэнка, адпаведны ліст Нацыянальнага банка накіраваны ў крэдытна-фінансавыя ўстановы. Ім рэкамендавана разглядзець пытанне аб ажыццяўленні іх асобнымі абменнымі пунктамі і касамі, размешчанымі на тэрыторы буйных гандлёвых цэнтраў і рынкаў, аперацый толькі па куплі наяўнай замежнай валюты з аплатай у наяўных беларускіх рублях.

Набытая замежная валюта павінна будзе накіроўвацца банкам на продаж насельніцтву для аплаты ім сацыяльна значных патрэб (лячэнне за мяжой, пражыванне і навучанне студэнтаў за мяжой, выезд за межы рэспублікі ў сувязі з хваробай або смерцю сваякоў і інш.). Тыя беларусы, якія не патрапілі ў спіс «сацыяльна значных», вымушаны тыднямі чакаць сваёй чаргі каля абменных пунктаў у надзеі, што хто-небудзь здасць валюту па афіцыйным курсе. Цяпер і гэтая апошняя магчымасць будзе зачыненая.

А ў таго, у каго валюта ёсць, варта не патрымаць да «лепшых часоў». На думку эканаміста Сяргея Чалага, урад і Нацбанк павінны да выходных у чарговы раз дэвальваваць беларускі рубель, каб паказаць Міжнароднаму валютнаму фонду, што ў Беларусі пачынаюцца рэальныя эканамічныя рэформы.

Пасяджэнне Савета дырэктараў МВФ, дзе будзе разглядацца і беларуская заяўка на крэдыт у памеры ад 3,5 да 8 мільярдаў долараў, пройдзе ў панядзелак, 29 жніўня. «Вакно магчымасцяў насамрэч вельмі маленькае, да пятніцы трэба паспець, бо ў панядзелак пасяджэнне савета дырэктараў МВФ, а ім ужо трэба будзе прадэманстраваць нейкае рынкавае рашэнне праблемы», — кажа Чалы. Пакуль жа, як заўважыў Чалы, урад спрабуе справіцца з эканамічным крызісам адміністратыўнымі метадамі. Менавіта так, як гэта было падчас распаду СССР.

А тым часам у студзені–ліпені 2011 года адбылося падзенне аб'ёмаў вытворчасці ў здабычы паліўна-энергетычных карысных выкапняў (на 0,2%), а таксама аб'ёмаў вытворчасці і размеркавання электраэнергіі, газу і вады (на 2,3%). Такія звесткі апублікаваў Нацыянальны статыстычны камітэт.

Калі ўжо стратэгічныя галіны вытворчасці страчваюць, што казаць пра астатніх?

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### ДЗМІТРЫЙ УС

Экс-кандыдат у прэзідэнты Дзмітрый Ус, які цяпер адбывае пакаранне ў калоніі №19 Магілёва, паведаміў, што яму прапаноўвалі напісаць прашэнне аб памілаванні. Але рабіць гэта Дзмітрый адмовіўся. «Мы размаўлялі хвілін 15. Дзмітрый сказаў, што зусім не атрымлівае маіх апошніх лістоў, а толькі лісты яшчэ за чэрвень, — распавяла «Радыё Свабода» жонка экс-кандыдата ў прэзідэнты Яўгенія Ус. — Ягоная заява на званок праляжала без руху амаль месяц, і толькі цяпер дазволілі. Сказаў, што пачуваецца крыху лепш, але ўсё роўна просіць дасылаць пэўныя лекі. Яшчэ сказаў, што прашэння аб памілаванні не пісаў і пісаць не збіраецца. «Калі адпусцяць, то хай адпускаюць па адмене прысуду», — так сказаў. 27 жніўня ў калоніі будзе дзень адкрытых дзвярэй, можна будзе паехаць туды ўсёй сям'ёй, але ў сераду, 25-га, я ўсё роўна туды паеду — паспрабую дамагчыся кароткатэрміновага спаткання». Дзмітрый Ус быў асуджаны на 5,5 гадоў пазбаўлення волі.

### АЛЕГ ПРАЛЯСКОЎСКІ



«Я не толькі не баюся, але і ўпэўнены, што ў рынкавых умовах большасць нашых газет («Советская Белоруссия», «7 дней» і іншыя) каменя на камні не пакінуць ад так званых незалежных газет, — заявіў міністр інфармацыі Беларусі Алег Праляскоўскі падчас анлайн-канферэнцыі на сайце афіцыйнага агенцтва БелТА. — Рэйтынгі нашых выданняў нашмат вышэй, чым у так званых апазіцыйных газет, а па колькасці падпісчыкаў — гэта проста неба і зямля». «Больш таго, — дадаў міністр, — нашы выданні ў няпросты эканамічны час у стане выйсці на самаакупальнасць. Але мы трымаем невялікую падушку бяспекі».

На пытанне, чаму ў такім выпадку на дзяржпрадпрыемствах і ва ўстановах ёсць абавязковыя планы падпіскі на дзяржаўныя выданні, якія ніхто не хоча выпісваць добраахвотна, Праляскоўскі адказаў: «Гэта больш пытанне да кіраўнікоў прадпрыемстваў. Але я не бачу нічога дрэннага ў тым, што на прадпрыемстве, у цэху будуць знаходзіцца газеты і часопісы. Гэта, на маю думку, зусім нават нядрэнна. Лічу, што на прадпрыемствах газеты і часопісы павінны быць».

Кіраўнік Мінінфармацыі таксама сцвярджае, што ў краіне няма праблемы распаўсюджвання альтэрнатыўнай інфармацыі. «Гэта вялікія казкі нашай апазіцыі, што яе ў чымсьці заціскаюць, не пускаюць кудысьці. Яна часцяком сама нікуды не ідзе», — заявіў ён.

### БЕЛАРУСКІЯ ВЕСЛЯРЫ



Беларускія спартсмены заваявалі 8 медалёў (1 золата, 3 срэбра, 4 бронзы) на чэмпіянаце свету па веславанні на байдарках і каноэ ў венгерскім Сегедзе. Акрамя таго, на рахунку беларускіх весляроў 6 алімпійскіх ліцэнзій у Лондан–2012.

Каноэ-чацвёрка (Дзмітрый Рабчанка, Дзмітрый Вайцішкін, Дзяніс Гаража, Аляксандр Валчэцкі) выйграла золата на дыстанцыі 1000 метраў.

На дыстанцыі 5000 метраў леташні чэмпіён Еўропы Алег Юрэня заваяваў срэбра на дыстанцыі 5000 метраў сярод мужчынскіх байдарак-адзіночак, а віцэ-чэмпіёнка свету–2010 Марына Палтаран у спаборніцтвах жаночых байдарак-адзіночак на 500 метраў заваявала бронзу. Павел Мядзведзеў заваяваў срэбра ў спаборніцтвах байдарак-адзіночак на дыстанцыі 500 метраў, а Дзяніс Гаража стаў сярэбраным медалістам сярод канаістаў-адзіночак на 500 метраў. Бронзавую ўзнагароду заваявалі таксама жаночы экіпаж байдаркі-чацвёркі (Ірына Помелова, Надзея Папок, Вольга Худзенка, Марына Палтаран) на дыстанцыі 500 метраў, атрымаўшы яшчэ і алімпійскі пропуск у Лондан–2012. Беларускі экіпаж байдаркі-двойкі (Раман Петрушэнка і Вадзім Махнёў) заваяваў бронзу на дыстанцыі 200 метраў. Золата дасталася веслярам з Францыі, срэбра — прадстаўнікам Вялікабрытаніі.

Бронза на дыстанцыі 200 метраў і ў актыве мужчынскай каноэ-двойкі — Дзмітрый Рабчанка, Аляксандр Валчэцкі, якія паказалі вынік 37,599 секунды. Беларусы прапусцілі наперад экіпажы з Літвы і Расіі.

За крок ад п'едэстала фінішавала ў спаборніцтвах жаночых каноэ-адзіночак на 200 метрах беларуска Кацярына Герасіменка, якая заняла 4-е месца. Медалісткамі тут сталі Лорэнс Венсан-Лапойнт з Канады, расіянка Марыя Казакова і Станілія Стаменава з Балгарыі.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# БЕЗГАСПАДАРНАЯ ФУНКЦЫЯ

Сяргей НІКАЛЮК

**«У прынцыпе, сіла і магчымасць улады ўтрымліваюцца не ў ёй самой, а ў яе здольнасці ўвесь час быць «сваёй» для масавай свядомасці».**



Усім прывітанне з сонечнага штату Дэлавэр. Я вырашыў арганізаваць тут сямейную кансалтынгавую фірму. Плачу кансультаваць амерыканскіх палітыкаў. Ужо прыступіў да чытання трохмесячнага лекцыйнага курсу па праблемах сацыякультурнага расколу беларускага грамадства. Праўда, пакуль сярод тых, хто запісаўся на курс, пераважае сям'я маёй малодшай дачкі. Самы зацікаўлены слухач — мой унук. Яму два месяцы. Але ён ужо здольны падаваць рэплікі з месца, і заўсёды па справе.

## Мяшэчнік як сведка

Пра тое, што *«белорусская модель развития или белорусский путь развития объективно существует»,* было заяўлена яшчэ ў сакавіку 2002 года на вядомым семінары кіраўнічых работнікаў рэспублікі. Як і беларуская дзяржаўная ідэалогія, гэта мадэль выбудоўвалася *«от жизни, а не от теории»*. Яе галоўная характарыстыка, на думку аўтара, — *«сильная и эффективная государственная власть»*.

Але пастаянны рух улады *«от жизни»* — занятак дастаткова небяспечны. Урэшце, *«от жизни»* ўлада можа і сысці, і тады шляхі *«государства для народа»* і народа разыдуцца. Размова, зразумела, ідзе не пра ўвесь народ, а толькі пра яго частку, якую прынята называць «большасцю» (з «меншасцю» ўлада канчаткова разышлася яшчэ ў 1996 годзе).

Беларусы з другой паловы сакавіка 2011 года пазбаўленыя магчымасці свабодна набываць валюту ў абменніках. Гэты сумны факт можна разглядаць з розных бакоў, у тым ліку і з боку адмаўлення дзяржавы выконваць функцыю грашовага рэгулявання ў поўным аб'ёме. У выніку абменныя аперацыі, як частка гэтай функцыі, сталі безгаспадарнымі. Жыццё ад гэтага не памерла. Яно самаарганізавалася і завіравала з ранейшай сілай, але ўжо па-за рамкамі *«белорусской модели развития»*.

Безгаспадарныя функцыі з'яўляюцца там і тады, дзе абвастраецца супярэчнасць паміж запатрабаваннямі грамадства ў рэсурсах і здольнасцю аўтарытарнай дзяржавы гэтыя рэсурсы вытвараць. СССР пры Брэжневе — класічны прыклад масавага з'яўлення безгаспадарных функцый, за выкананне якіх узяліся так званыя «ценевікі».

Да 1989 года прыбыткі контрагентаў ценявой эканомікі ў адносінах да фонду аплаты працы ў СССР склалі, паводле сціплых падлікаў, больш за 25 працэнтаў. Зразумела, што савецкая дзяржава ў адказ на такую самадзейнасць перыядычна ініцыявала кампаніі па барацьбе з «асобамі, якія атрымліваюць непрацоўныя прыбыткі», душачы тым самым творчы патэнцыял грамадства. Вывядзенне ж творчай актыўнасці мас з ценю азначала б легалізацыю прыватнай ініцыятывы, што супярэчыла самой прыродзе народнай дзяржавы ў яе камуністычнай трактоўцы.

Пры гэтым дзяржава часцяком хітравала. Так, планаванне харчовага фонду ў СССР па многіх прадуктах праводзілася без уліку сельскага насельніцтва, якому па ўмоўчванню належала харчавацца «з агароду», што не замінала дзяржаве разлічваць прыватныя гаспадаркі ў якасці перажытку мінулага, які належала выкараніць.

Яшчэ адзін прыклад безгаспадарнай функцыі — мяшэчніцтва. Яго сучасны варыянт — памежны народны гандаль. Грамадзяне займаюцца ім вымушана, а не ад любові да чаўночных перасоўванняў у прасторы. Таму рост актыўнасці такіх перасоўванняў сведчыць, як правіла, пра наяўнасць праблем на макраэканамічным узроўні.

У сваю чаргу, папаўненне спісу безгаспадарных функцый — дакладны знак дэзарганізацыі кіравання, што прыводзіць да росту масавага дыскамфорту. Чым усё гэта можа завяршыцца — нескладана зразумець на прыкладзе стабільнасці часоў Брэжнева, што нечакана згенеравала перабудову Гарбачова.

## Кароўнікі разладу

Грошы, як падказвае нам Вікіпедыя, праяўляюць сябе праз адну меру (кошту) і тры сродкі — абарачэння, плацяжу і назапашвання. Пад апошнім сродкам разумеецца магчымасць перанясення пакупной здольнасці нескарыстаных у дадзены момант грошай з сучаснасці ў будучыню.

Паводле афіцыйных дадзеных, за першую палову 2011 года кошык валют у Беларусі падаражэў на 78%. Год яшчэ далёкі ад завяршэння, і таму складана сказаць, якую ж частку пакупной здольнасці сваіх рублёвых дэпазітаў беларусы перанясуць з першага года чацвёртай пяцігодкі ў другі. Але ў чым можна быць упэўненым адназначна, дык гэта ў тым, што рублі перастаюць выконваць функцыю сродку назапашвання. З чатырох функцый грошай адна, такім чынам, у беларускай грашовай адзінкі апынулася безгаспадарнай. Прывітанне моцнай і эфектыўнай дзяржаве!

Мая іронія зразумелая, аднак фармат «азбукі палітапогіі» патрабуе не эмацыйных воклічаў, а рацыянальнага аналізу. Эфектыўнасць чалавечай дзейнасці прынята ацэньваць па яе здольнасці забяспечваць канчатковы вынік. Праблема, такім чынам, упіраецца ў вызначэнне канчатковага выніку, да дасягнення якога імкнецца кіраўніцтва беларускай дзяржавы.

У традыцыйных цывілізацыях мінулага жаданай мэтай любога кіраўніка была сацыяльная стабільнасць. З эканамічнага пункта гледжання гэта азначала захаванне эфектыўнасці, якая гістарычна склалася. Любыя яе змены (як у бок паніжэння, так і падвышэння) пагражалі стабільнасці. Абавязковая ўмова існавання сучаснай ліберальнай цывілізацыі — развіццё, якое патрабуе сталага росту эканамічнай эфектыўнасці.

А дзе ж месца Беларусі ў гэтай двухполюснай схеме? З традыцыйнай цывілізацыі, хочацца верыць, яна выйшла, але ў цывілізацыю ліберальную, відавочна, не ўступіла. Беларусь затрымалася ў цывілізацыйным прамежку. Адсюль сталае імкненне сумясціць несумяшчальнае. Адсюль чарада кульгавых рашэнняў (гл. «Час кульгавых рашэнняў»).

Звернемся да свежых прыкладаў. 2 жніўня на пасяджэнні Саўміна прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч так пераканаўча казаў пра неабходнасць *«резко сокращать эмиссионное кредитование»* сельскай гаспадаркі, што мне цяжка ўтрымацца ад цытаты: *«Больше половины ферм имеют невысокую эффективность* (маюцца на ўвазе фермы, пабудаваныя на эмісійныя грошы). *Удои молока на корову в первом полугодии — ниже среднего по стране. В 2011 году облисполкомы просят еще 4 трлн. рублей на молочную программу. А кто будет отвечать за эффективность?»*

Адказны знайшоўся праз два дні. Ён і падпісаў указ №342, які прадугледжвае вылучэнне чарговых трыльёнаў на будаўніцтва чарговых кароўнікаў.




## Абвіслыя ветразі ўлады

Адзінага палітыка (АП) часта вінавацяць у папулізме. Здавалася б, такія абвінавачванні не пазбаўленыя падстаў, але адкрыем слоўнік: «Папулізм — усвядомленае імкненне першай асобы, любога палітыка прыцягнуць народ, тыя ці іншыя групы насельніцтва, не столькі выкладаннем сваіх рэальных мэтаў, колькі спробай упісацца ў масавую свядомасць, у стэрэатыпы народнай культуры».

Калі пад масавай свядомасцю разумець свядомасць беларускай «большасці», то сваіх рэальных мэтаў АП ніколі не хаваў. Ён пад «большасць» не падладжваўся і ў гэтым сэнсе заўсёды быў шчырым палітыкам. *«Я свое государство за цивилизованным миром не поведу»*. Сказана — зроблена. Паглядзіце навіны за любы дзень. Беларусь рухаецца па ўласнай дарозе, і гэта дарога не вядзе да храма ліберальнай цывілізацыі.

Безгрунтоўныя і абвінавачванні АП у бальшавізме. Пэўнае падабенства пры жаданні знайсці, зразумела, можна. Бальшавікам было ўласцівае палатаігчнае імкненне да захопу і ўтрымання ўлады, але, як гэта ні здасца дзіўным, яны пры гэтым не звязвалі сябе ўнутрана паслядоўнай ідэяй.

За сваё адносна нядоўгае знаходжанне ва ўладзе Ленін тры разы кардынальна змяняў палітычны курс. Ён узначаліў кастрычніцкі пераварот, падзяляючы «асноўную памылка інтэлігенцыі», г. зн. веру, што народ, калі яго вызваліць ад прыгнёту начальства і эксплуататараў, сам хутка наладзіць жыццё грамадства. Адсюль абсалютызацыя саветаў і ўяўленне пра сацыялізм як пра «жывую творчасць мас».

Аднак саветызацыя краіны прывяла да поўнага хаосу. Інакш і не магло здарыцца, бо саветы — гэты сучасны аналаг сярэднявечнага веча — для рашэння праблем вялікага грамадства (дзяржавы) не прызначаны. У адказ на масавы запыт аднавіць «моцную ўладу», які сфармаваўся пад канец 1918 года, Ленін разгортваецца на 180 градусаў і пераходзіць да палітыкі «ваеннага камунізму». Новы варыянт сацыялізму «ёсць ні што іншае, як дзяржаўна-капіталістычная манаполія, звернутая на карысць усяго народа».

Але і першы блін аўтарытарызму, выпечаны бальшавікамі, не прыйшоўся грамадству даспадобы. На харчатрады сяляне адказалі масавымі паўстаннямі. У гэтай сітуацыі непазбежным быў заварот да тых каштоўнасцяў, што адмаўляліся стыхіяйураўняльнасці, якая перайшла ўсякія разумныя межы. І Ленін пераходзіць да НЭПу. Ён заклікае сваіх прыхільнікаў «ажыўляць гандаль, дробнае прадпрымальніцтва, капіталізм, асцярожна і паступова авалодваючы імі ці атрымліваючы магчымасць падвергнуць іх дзяржаўнаму рэгуляванню толькі ў меру іх ажыўлення». Да наступнага развароту на 180 градусаў правадыр сусветнага пралетарыяту не дажыў. Арганізацыйна аформіць наступны разварот давялося ўжо Сталіну.

Але Ленін-Сталін нічога не навязвалі грамадству, ды яны і не змаглі б гэтага зрабіць. Іх талент палягаў у выкарыстанні эфекту ветразяў, прычым іх карабель з ветразямі быў вельмі прымітыўны, няздольны лавіраваць супраць ветру. І тут логіка жанру вымушае звярнуцца да цытавання: «У прынцыпе, сіла і магчымасць улады ўтрымліваюцца не ў ёй самой, а ў яе здольнасці ўвесь час быць «сваёй» для масавай свядомасці, здзяйсняць учынкі, якіх ад яе чакаюць ці пераканаць масы з дапамогай ідэалагічнага маніпулявання ў тым, што ўлада менавіта такія ўчынкі і здзяйсняе» (А. Ахіезер, гісторык).

У першай палове 1990-х злавіў вецер у свае ветразі і АП, але сёння кірунак ветру пачынае мяняцца. А вось ці здольны змяніцца АП? Прынамсі, нагодаў для такой высновы ён за апошні час не даваў.

СІТУАЦЫЯ

# З РАСІІ ПА НІТЦЫ...

Вольга ХВОІН

**Да канца года яшчэ чатыры месяцы, а кіраўніцтва Беларусі актыўна працуе ў кірунку падтрымання эканомікі — кантракты на пастаўку газа з Расіі абяцаюць заключыць з прымальнымі цэнамі. А вось усходняя нафтавая авантура Беларусі правалілася.**

Прэм'ер Расіі Уладзімір Пуцін даручыў Мінэнерга і «Газпраму» правесці перамовы з беларускімі калегамі і ў бліжэйшы час вызначыць паніжальны «інтэграцыйны» каэфіцыент для паставак расійскага газу Беларусі. «Які гэта мусіць быць каэфіцыент, як ён будзе ўводзіцца, з чым там яго ўвядзенне звязана, я прашу ў самы бліжэйшы час вызначыцца і ўдзельнікам эканамічнай дзейнасці, і Міністэрству энергетыкі. Трэба гэта ўсё прапрацаваць з беларускімі калегамі, — сказаў прэм'ер Расіі, і акрэсліў умовы здзелкі: — Разлічваем на тое, што гэты працэс будзе сінхранізаваны з набыццём другой долі кампаніяй «Газпрам» у «Белтрансгаза», дзе ён з'яўляецца 50-працэнтным уласнікам».

Пра гэтыя ж умовы гаварылі прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў і кіраўнік «Газпрама» Аляксей Мілер. «Вядома, нам не патрэбныя такія сюжэты, як былі пяць гадоў таму (калі кантракт на пастаўкі газа ў Беларусь быў падпісаны за дзве хвіліны да Новага года — рэд.), трэба дамовіцца. Тым больш што цяпер ёсць істотныя ўмовы, якія ўплываюць на змест адпаведнага кантракта. Па-першае, гэта ўзнікненне Мытнага саюза, у якім прымаюць удзел Расія, Беларусь і Казахстан. У гэтым сэнсе нашы эканомікі сталі значна бліжэй, і гэта трэба ўлічваць. Другі фактар — набыццё ў будучым 50 працэнтаў, што засталіся, «Белтрансгаза». Вядома, гэта ствarae крыху іншыя ўмовы знаходжання Расіі, «Газпрама» на беларускім рынку, і пры падрыхтоўцы кантракту, я мяркую, таксама правільна гэта ўлічваць», — настаўляў Мілера прэзідэнт РФ.

Чаму Расія змяніла гнеў на літасць у адносінах да Беларусі, да якой не так даўно абяцалі цалкам рынкавыя падыходы? «У любым выпадку, гэта добра, што мы будзем атрымліваць газ танней. Калі б такое прапанавалі Польшчы, яна б таксама не адмовілася, — выказвае сваю ацэнку будучаму пагадненню і яго ўмовам старшыня партыі левых «Справядлівы свет» Сяргей Калякін. — Гэта рыначная мера. Мы ж не за проста так атрымаем палёгку, а прададзім Расіі другую палову акцый «Белтрансгаза». Канешне, варта было б стварыць сумеснае прадпрыемства па транзіту газа, але так атрымалася, і нашае кіраўніцтва прадае тое, што магло б несці залатыя яйкі. Увогуле, гэта складанае пытанне. Расія ўжо пабудавала газатранспартную сістэму ў абыход Беларусі, то ў будучым можа стацца так, што газаправод проста не будзе нікому патрэбны. Таму, на мой погляд, такое рашэнне разумнае, хаця ў вялікім сэнсе гэта страта для Беларусі».

Эканаміст Леанід Злотнікаў гаворыць, што для Беларусі саступкі па газу важныя, але істотна ўплываць на эканамічную сітуацыю гэта не будзе. «У рамках Мытнага саюзу мусяць быць аднолькавыя кошты для ўсіх яго суб'ектаў, адзін рынак, і штучнае змяненне цэн для кагосьці з удзельнікаў не ёсць добрай рысай. З іншага боку, Расія хоча ўцягнуць у еўразійскі эканамічны саюз Украіну і паказаць, што гэта выгодна ў тым ліку і з-за коштаў на газ. Мяркую, Расія ўвогуле не хоча, каб Беларусь увайшла ў глыбокі эканамічны крызіс, бо гэта выкліча дэстабілізацыю і на палітычным полі. Забастоўкі, сацыяльны пратэст могуць справакаваць змену ўлады, а яна, у сваю чаргу, можа павярнуцца ў бок Захаду. Калі цану на газ для Беларусі вызначаць нават на ўзроўні расійскіх цэн на блакітнае паліва, то гэта дасць нашай дзяржаве выйгрыш у суме блізу двух мільярдаў долараў. Але, паводле афіцыйнай статыстыкі, на 1 красавіка бягучага года толькі кароткатэрміновая пазыка складала 14 мільярдаў долараў. І ў наступным годзе гэтая лічба будзе большай. Яшчэ адна нашая праблема — адмоўнае сальда гандлёвага балансу, якое ўтвараецца не толькі за кошт імпарту энерганосьбітаў, але і тавараў. Таму паніжальны каэфіцыент на газ — важны фактар для беларускай эканомікі, але не вырашальны. Грошы нам на падтрымку ўсё адно будуць патрэбныя, будзем іх шукаць і ў МВФ, і ў Расіі», — адзначае Злотнікаў.




У сувязі з пацяпленнем адносінаў паміж кіраўніцтвам Беларусі і Расіі варта ўзгадаць і аб дамоўленасцях Лукашэнкі і Мядзведзева ў межах АДКБ. Пасля сустрэчы ў Сочы прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў паведаміў, што дамовіўся з Аляксандрам Лукашэнкам і іншымі партнёрамі па АДКБ пра больш кансалідаваную і выразную пазіцыю ўнутры арганізацыі. Адпаведныя дамоўленасці, паводле яго слоў, будуць аформлены на бліжэйшым саміце АДКБ у Маскве. Падчас нефармальнага саміту ў Астане на пачатку жніўня Лукашэнка, які цяпер старшынствуе ў АДКБ, заявіў, што арганізацыя поўная рашучасці скончыць працэс камплектавання і ўзбраення калектыўных сіл КСАР. Ён таксама падкрэсліў, што ў дзяржаў-членаў АДКБ з'явілася шмат напрамкаў дзейнасці ў сувязі з падзеямі, якія адбываюцца «па перыметры арабскай дугі і афрыканскай поўначы». «Мы ўсё гэта бачым і дамовіліся, што краіны АДКБ будуць выпрацоўваць меры процідзеяння магчымым пагрозам, перш за ўсё ў кіберпрасторы», — сказаў беларускі лідар. Ад гэтага выказвання правялі паралель да звяржэння паўночнаафрыканскіх дыктатараў і адпаведнай фобіі ў беларускага сябра Муамара Кадафі. Да слова, апошнія прапагандысцкія фільмы па Беларускаму тэлебачанню былі прысвечаныя акурат-такі злу, якое нясе інтэрнэт і сацыяльныя сеткі.

У жніўні Лукашэнка займеў не толькі поспех у сферы паставак вуглевадароднай сыравіны, але і правал. Вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта» афіцыйна абвясціла пра выхад з кантракту па распрацоўцы радовішча Джафеір у Іране. Кантракт на распрацоўку радовішча Джафеір у Іране, падпісаны ў 2007 годзе, прадугледжваў распрацоўку радовішча ў некалькі этапаў. Першы этап быў завершаны ў верасні 2010 года. Аднак «у ходзе работ былі выяўлены новыя дадзеныя аб геалагічнай структуры радовішча, што абумовіла змяненне тэхнічных і фінансава-эканамічных умоў рэалізацыі праекта. Улічваючы гэта, прадпрыемства «Беларуснафта» прыняло рашэнне аб выхадзе з дадзенага кантракту пасля першага этапу», — паведамляе БелаПАН.

Іранскае інфармагенцтва Mehr са спасылкай на крыніцу ў Нацыянальнай іранскай нафтавай кампаніі паведаміла, што прычынай скасавання кантракту сталі рознагалоссі бакоў, якія датычацца метадаў і тэхналогій вядзення работ, а таксама грашовай кампенсацыі іранскаму боку за выкарыстанне Беларуссю яе радовішча. Беларускі бок, па словах крыніцы, не выконваў свае абавязацельствы па кантракце. Згодна з дамовай, «Беларуснафта» абавязвалася здабываць па меншай меры 3,5 тысячы барэляў нафты ў суткі, але не здабывала нават 2,8 тысячы барэляў, паведамляе Mehr.

КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# АД МЁРТВАЙ СВІННІ ВУШЫ



**Вядомы палітзэк Эдуард Кузняцоў, які двойчы быў пакараны за варожае стаўленне да савецкай улады, у кнізе «Мардоўскі марафон» распавёў многа цікавага.**

Прыкладам, пра «дасведчаную» ўпэўненасць гэбістаў, што існы парадак адпавядае прыродзе чалавека і таму будзе вечным. Пра бесчалавечныя формы супраціву, якія выкарыстоўвалі ў барацьбе супраць яго даведзеныя да жывёльнага стану людзі. На жаль, многае з таго суб'етыўна-аб'етыўнага мае месца і ў сучаснай Беларусі. Тая ж упэўненасць у справядлівасці арганізаванага сацыяльнага жыцця, што надае вертыкальшчыкам пачуццё ўпэўненасці і здымае пытанне аб магчымай адказнасці.

Ведаю, многія з іх вельмі смяяліся, калі расійскі тады прэзідэнт Уладзімір Пуцін афарыстычна адхіліў тэрытарыяльныя прэтэнзіі Латвіі — ад мёртвага асла вушы яны атрымаюць, а не Пыталаўскі раён. Вось так і нам трэба з так званай апазіцыяй.

А Кузняцоў успамінае, як даведзеныя да адчаю крымінальнікі ў мардоўскіх лагерах рэзалі сабе вушы, пакавалі ў канверты ды спрабавалі дасылаць іх па пошце на адрас партыйных з'ездаў ды пленумаў. Маўляў, шчыры дзякуй і глыбокае задавальненне за шчаслівае жыццё. Кожны ж гаспадар сваім вушам, таму мае права.

Аказваецца, не. Членашкодніцтва з нададзеным яму сэнсам лічылася палітычным злачынствам, таму крымінальнікам дадавалі тэрмін зняволення па палітычным артыкуле. Таму крымінальнікі зрэдку адсылалі свае вушы, пальцы і іншыя члены на адрас Палітбюро, каб змяняць зону крымінальную на палітычную, дзе маральны клімат быў нашмат лепшы.

Пра ўсё гэта ўспомнілася, калі надвячоркам зайшоў на мінірынак, у мясным павільёне якога звычайна ўсё прадавалася значна танней, чымсьці ў краме. І што ж? З усяго асартыменту, выкладзенага пад шклом лядоўні, даступнымі па кошце падаліся толькі свіныя вушы. Каштаваў гэты далікатэс «усяго» 15 тысяч рублёў за кілаграм. За астатнія свіныя «прычындалы» трэба было б заплаціць у тры-чатыры разы болей. Нават за сала, якое ўваходзіць у знакамітую ідэалагему, прасілі па 40–50 тысяч.

Не, думаю, не дачакаецеся. Лепш зайду ў рыбны. Рыба бывае лепшай за мяса, і для здароўя карыснай, і больш таннай. Дзе там… Вэнджаныя стаўрыда са скумбрыяй каштуюць даражэй за мяса, а свежамарожаная рыба, калі не ўлічваць ваду, па меншай меры, у цане не саступае свіной выразцы.

Трэба сказаць, што перад самым шоп-турам я атрымаў заробак, што, уласна, і сталася нагодай пайсці «атаварыцца». Прычым здавалася, што грошы атрымаў хоць і не надта вялікія, але лічыў, што на сёння нармальныя. А аказалася, што мізэрныя. Нічога не купіў, не змарнаваў ні рубля, а адчуў сябе жабраком.

Калі сябе кепска пачуваеш, то можна і да доктара не хадзіць. Бо дрэнны стан, гэта ж відавочна, ад нейкай хваробы, ад якой не асцярогся ці нават сам на сябе наклікаў. І калі адчуваеш сябе жабраком, то так яно і ёсць. Як доказ — немагчыма нешта купіць па сваіх грашах. Бо тут купіш, а на іншае, больш важнае, не хопіць. Трэба, прыкладам, ЖКГ заплаціць, за электрычнасць, за транспарт, а на дровы не хопіць. Добра быць сытым і зімой сядзець у цёплай хаце. А сытым у халоднай — цяжкавата. А што як давядзецца зімаваць у голадзе і холадзе?

Перспектыва такая ёсць, і яна зусім рэальная. Бо, як пішуць эканамісты, забыўшыся на абяцанкі не пампаваць эканоміку пустымі грашовымі паперкамі, урад працягвае цягнуць эканоміку з балота з дапамогай крэдытаў. І таму рубель пастаянна слабее, а валютныя курсы тых долараў і еўра, якія дзесьці і ў кагосьці ёсць, пастаянна растуць. Іх уладальнікам дастаткова мяняць сваю валюту па рынкавым курсе і жыць прыпяваючы, а нам трэба зарабляць. Інакш кажучы, сабе можна браць грошай колькі заўгодна, можна іх раздаваць сваякам, калегам, проста добрым знаёмым або кілерам ці прастытуткам. Тыя, хто грошы зарабляе на ўласнае жыццё, гэту хеўру ніколі не дагоняць. І пакуль тая не набярэцца пад завязку, нічога ў станоўчым плане не адбудзецца.

Бо хеўра лічыць, што гэта яна робіць для краіны і эканомікі ўсё магчымае. А мы жывем не па сродках, і таму нічога лепшага не заслугоўваем. Што, увогуле, гэта нашы праблемы, дзе адпачываць, як і з кім… А калі грошай няма, то лепш сядзець на лецішчы і капаць бульбу. Маўляў, што накапаеце, тое вашым і будзе. Мы ж паважаем прыватную ўласнасць і будуем прававую сацыяльную дзяржаву.

На самай справе, ім наша бульба пакуль не патрэбна. Спатрэбіцца — прыйдуць ды абчысцяць скляпы і бурты.

Але пакуль што мы гаспадары той нерухомасці і рухомасці, якую маем і купляем. Таму маем права набыць вушы ад мёртвай свінні і можам адправіць іх па вядомаму адрасу з падзякай за зробленае для нас жыццё.

ТРЭЦІ СЕКТАР

# ТАЦЦЯНА РЭВЯКА

Аляксандр ТАМКОВІЧ



**Хаця абставіны нашай сустрэчы былі вельмі сумнымі, пачалася яна са смеху. Аказалася, Вікіпедыя напісала, што Таццяна Рэвяка з'яўляецца жонкай Алеся Бяляцкага. Давялося выпраўляць памылку, а то б магла пакрыўдзіцца сапраўдная жонка Алеся — Наталля Пінчук.**

## Пачатак жыцця

Таццяна Рэвяка на самай справе з'яўляецца прыгожай жанчынай. Гэта не камплімент. Гэта канстатацыя факту. І ён далёка не адзінкавы.

Не так даўно знаёмы Таццяны паскардзіўся на ноч без сну таму, што ў яго дачкі рэзаліся зубкі, і пачуў: «Калі вашай дачцэ будзе столькі ж, колькі маёй, будзеце спаць яшчэ меней». Зразумела, ён пацікавіўся ўзростам Рэвяка-малодшай і быў уражаны — 21 год.

Таццяна Рэвяка (дзявочае прозвішча Ліннік) нарадзілася 17 студзеня 1968 года ў Салігорску. Напісаў і пачырванеў — работа проста прымушае пытацца ў жанчын пра ўзрост. Таму, выкарыстоўваючы гэтую нагоду, я прашу ў іх усіх прабачэння.

Калі за плячамі Таццяны засталася дзявятая агульнаадукацыйная школа, далейшым арыенцірам быў абраны філалагічны факультэт БДУ. Напэўна, на гэтым не варта было б спыняць увагу, каб не абставіны, у якіх быў зроблены выбар.

Справа ў тым, што Таццяна займалася спортам. Дакладней, спартыўным арыентаваннем, «паляваннем на ліс». Калі ўсе здавалі іспыты, каб атрымаць школьны атэстат, яна абараняла гонар БССР на чарговых усесаюзных спаборніцтвах. Па іх завяршэнні ў яе засталося ўсяго толькі два тыдні для падрыхтоўкі. Часу вагацца не было, таму абрала яна тое, што было бліжэй да сэрца, — філалогію. Пагадзіцеся, рызыка вельмі вялікая, бо пісьмовыя памылкі — менавіта тое, чаго патэнцыйныя студэнты баяцца больш за ўсё.

Школьныя адзнакі (усе «выдатна, акрамя «чацвёркі» па хіміі) давалі шанец. І яна яго не ўпусціла.

## Метамарфозы жыцця

Спецыялізацыяй была беларуская і руская філалогія, першым заняткам (1 верасня 1985 года) стала лекцыя па этнаграфіі, якую прачытаў Ніл Сымонавіч Гілевіч. А калі сакурснік Сева Рагойша звярнуўся да яе па-беларуску, гэта яшчэ раз пераканала — выбар зроблены правільны. Асабліва з улікам новага палітычнага фону — абвешчанага Міхаілам Гарбачовым курса на знакамітую перабудову.

У адной групе з Таццянай вучылася вядомая зараз Паліна Сцепаненка (тады Качаткова), маці якой выкладала ў Алеся Бяляцкага. Прозвішча гэта вельмі часта гучала ў студэнцкім асяроддзі, таму што ён быў адным з двух заяўнікаў знакамітых «Дзядоў–88».

Таццяна Рэвяка сябравала з Палінай яшчэ з часоў «абітуры», дзе жыла з ёй у адным пакоі і абмяркоўвала тры падзелы Рэчы Паспалітай. І хаця яна актыўна цікавілася тэмай іншадумства, нават дапусціць не магла, што некалі лёс на дзесяцігоддзі звядзе яе менавіта з Алесем Бяляцкім.

Падзеі апошніх гадоў існавання СССР вельмі хутка змянялі свядомасць людзей, выводзілі найперш моладзь за межы заскарузлых партыйна-камсамольскіх догмаў. У нейкім сэнсе студэнцкі перыяд жыцця кожнага чалавека закладае падмурак яго светапогляду. У той час для Таццяны адкрываліся вочы на вялізарныя пласты, звязаныя з развіццём культуры, літаратуры, філасофіі.

> Праваабарончы цэнтр «Вясна» — не проста места працы пэўных людзей. Гэта, як адзначыла сама Таццяна Рэвяка, лад жыцця. Вялікая ступень даверу, павагі і ўзаемаразумення

Размеркавалі яе ў адну з мінскіх школаў, але ніводнага дня Таццяна там не працавала, бо пасля дэкрэтнага водпуску (на пятым курсе нарадзіла дачку Насту) пераводам адразу пайшла працаваць у літаратурны музей імя Максіма Багдановіча, дзе дырэктарстваваў Алесь Бяляцкі. Было гэта 20 гадоў таму.

## Самае цяжкае выпрабаванне

У жніўні 1998 года Алесь Бяляцкі добраахвотна сышоў з пасады дырэктара музея, а ў кастрычніку ўслед за ім сышла Таццяна Рэвяка. Праваабарончы цэнтр «Вясна–96» стане іх новым прызваннем і грамадзянскім абавязкам. Арганізацыя, заснаваная ў 1996 годзе, была афіцыйна зарэгістравана ў 1998-м.

У наступным годзе адбылося тое, што стане самым цяжкім за ўсе 13 гадоў працы на новым месцы — трагедыя на Нямізе. Калі зараз даводзіцца кантактаваць з роднымі і блізкімі тых, хто апынуўся за кратамі пасля падзей 19 снежня 2010 года, адчуваеш, што ў гэтых людзей ёсць надзея на будучыню. У 1999-м яе не было. У тых, хто страціў сваіх дзяцей, родных і блізкіх, засталася толькі памяць пра іх.

Умоўна супрацоўнікі праваабарончага цэнтру «Вясна» падзяліліся на дзве катэгорыі — юрысты і «філолагі». Першыя дапамагалі пацярпелым на Нямізе пісаць грамадзянскія іскі, другія, каб захаваць памяць пра загінуўшых, узяліся за складанне адпаведнай кнігі.

Менавіта гэтай работай і заняліся Таццяна Рэвяка з Палінай Сцепаненкай. Можна толькі ўявіць, колькі яна тады ўбачыла чалавечых слёз і перажыла людскіх эмоцый, але ўрэшце кніга ўспамінаў сваякоў загінулых роўна праз год была надрукаваная.

## Лад жыцця

Не хачу нікога пакрыўдзіць з апазіцыйных структур, але многія з іх альбо перасталі існаваць, альбо сталі маргіналамі нават ад паловы тых выпрабаванняў, што выпалі на долю «Вясны». Па сутнасці сёння гэта адна з нешматлікіх структур, якая не толькі здолела захавацца на апазіцыйным полі, але і падняць у вачах людзей свой рэйтынг. Упэўнены, менавіта па гэтай прычыне іх і «прэсуюць».

Праваабарончы цэнтр «Вясна» — не проста места працы пэўных людзей. Гэта, як адзначыла сама Таццяна Рэвяка, лад жыцця. Вялікая ступень даверу, павагі і ўзаемаразумення. Знаёмыя ўсім з ранняга дзяцінства іерархічныя прынцыпы дэмакратычнага цэнтралізму дзейнічаюць там даволі ўмоўна. Калі не сказаць — адсутнічаюць увогуле. Як і прынцып: я — начальнік, ты — … усё астатняе.

Для дзяржавы, дзе пануе «вертыкаль», падобны падыход з'яўляецца, мякка кажучы, не тыповым.

Асабліва яскрава гэта праявілася падчас апошніх прэзідэнцкіх выбараў, бо менавіта яны і сталі для пазбаўленай рэгістрацыі «Вясны» своеасаблівай кропкай адліку, полем змагання. Нягледзячы на шматлікія спробы знішчыць праваабарончы цэнтр (закрыць і пагрозу «пасадзіць усіх за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі), ён працягваў дзейнічаць. І вельмі эфектыўна.

Не буду ўзгадваць усе перыпетыі падзей, што наўпрост або ўскосна звязаныя з 19 снежня 2010 года, бо яны і так добра вядомыя. Адных толькі вобыскаў у «Вясне» было аж пяць. Адзін з іх варты таго, каб пра яго расказаць асобна, хаця б па той прычыне, што ён нагадвае нейкі трагікамічны дэтэктыў і здарыўся менавіта ў дзень народзінаў Таццяны Рэвяка.

17 студзеня 2011 года Таццяна, як і мае быць, прыйшла ў офіс «на абцасах» і ўся па-святочнаму «такая прыгожая». Менавіта ў гэты момант да іх таксама «прыйшлі». Мабыць, для таго каб «даканфіскаваць» тое, што не забралі ў паслявыбарную ноч.

Нагадаю, што офіс «Вясны» месціцца на першым паверсе, і, як звычайна, у мэтах бяспекі вокны там цалкам закратаваныя. І толькі на адным (кухонным) ёсць адпаведны замочак. Яно і не папала пад нагляд спецыяльных службаў. Менавіта праз яго Алесь Бяляцкі і загадаў ратавацца сваім паплечнікам. А сам у гэты момант разам з Валянцінам Стэфановічам праз дзверы «вёў перамовы» з нечаканымі «гасцямі».

Так і зрабілі. Мабыць, калі б нехта «выклаў» на YouTube адпаведны відэаролік, той бы мог стаць сапраўдным хітом, бо ўбачыць, як праз акно лезе на абцасах, з кампутарам у руках вельмі інтэлігентная імянінніца — яшчэ тая карціна.

Можна толькі здагадвацца, што адчувалі «людзі ў цывільным», калі замест дзесяці супрацоўнікаў «Вясны», якія пад іх пільным назіраннем увайшлі ў памяшканне, знайшлі там толькі двух…

## Самае нечаканае выпрабаванне

Зразумела, пазбавіцца «бяльма на вачах» было для ўлады нейкай «ідэяй фікс». Праваабарончы цэнтр «Вясна» пад ударамі рэпрэсій увесь час нечым нагадваў ляльку-неваляшку. Улады неаднаразова прыціскалі яго да зямлі, а ён упарта паўставаў ізноў. Не здзіўлюся, калі некалі высветліцца, што менавіта гэта і сталася прыхаванай асновай абвінавачвання аб «утойванні даходаў у асабліва буйных памерах», бо ўсім зразумела, што арышт 4 жніўня 2011 года Алеся Бяляцкага — толькі вяршыня айсберга. Пад вадой хаваюцца сапраўдныя прычыны…

На карысць гэтага вельмі красамоўна сведчыць тое, што многіх арыштаваных пасля апошніх прэзідэнцкіх выбараў дапытвалі па «справе «Вясны» і вельмі моцна цікавіліся фінансамі. Мабыць, хацелі знайсці тут матэрыяльную глебу для якіх-небудзь новых «тэлешэдэўраў» накшталт «Жалезам па шклу». Не атрымалася, і яны пачалі «шыць» нейкія падатковыя прэтэнзіі. Як вядома, калі праблемы няма, яе неабходна стварыць.

Трэба аддаць належнае тым, хто распрацаваў пастку для сваіх літоўскіх альбо польскіх візаві. Не буду гадаць, былі ці не там нейкія грашовыя складнікі. Хай гэта высвятляюць тыя, хто будзе даследаваць усе абставіны агідных казусаў. Пакуль бясспрэчна толькі тое, што «сыр» для сваёй пасткі яны абралі самы знаёмы ў свеце — падаткі. У Ізраілі, напрыклад, будынак падатковай інспекцыі называюць «сцяной плача» нумар два.

Дзеянні літоўска-польскіх чыноўнікаў ад юрыспрудэнцыі пакінем за дужкамі, бо наконт іх матывацыі можа быць шмат версій. Адназначна толькі тое, што, на мой погляд, тыя, хто стварыў «складанасці», павінен ад іх і пазбавіць, а не абмяжоўвацца толькі публічнымі прабачэннямі. Тут я цалкам згодны з Таццянай Рэвяка — карысці ад іх нямнога.

А напісаць гэты нарыс менавіта пра Таццяну Рэвяка, я вырашыў не толькі таму, што яна ўзначальвае Беларускі Дом правоў чалавека ў Вільні, а ў 2006 годзе атрымала прэстыжную міжнародную праваабарончую прэмію імя Анны Лінд, а найперш таму, што яе пазіцыя і ўчынкі, як і ўсіх яе калег па «Вясне», сведчаць аб непазбежным: узгаданая «неваляшка» — праваабаронцы цэнтр «Вясна» — падымецца зноў. І брутальныя арышты гэтаму не перашкодзяць.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 31 ЖНІЎНЯ, СЕРАДА

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.20** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Сфера інтэрасаў». Эканамічная праграма.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** Відэафільм АТН «Дзятлаўскія перастукі» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Меладрама «Вандраванне ў закаханасць» (Расія).
**14.00** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультсерыял «Гара Самацветаў».
**16.00** «Эпоха».
**16.55** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.55** Меладраматычны серыял «Маруся. Вяртанне» (Украіна).
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Відэафільм АТН «9 балаў. SOS».
**20.00** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** Камедыя «На спіне ў чорнага ката».
**23.30** Дзень спорту.
**23.45** Дак. цыкл «У пошуках ісціны».

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.05** «Дэтэктывы».
**12.40** «Таямніцы патанулых караблёў».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Каралева экрану». Камедыйны серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Справа была на Кубані». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Шматсер. фільм «У лясах і на гарах».
**23.05** Асяроддзе пасялення.
**23.55** Прэм'ера. «Таварышы паліцыянты». Шматсерыйны фільм.
**00.50** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**08.20** «Аўтапанарама».
**08.35** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**08.45** Фільм «Сямейны бізнэс». ЗША, 1989 г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Халасцякі». Серыял.
**14.40** «Забойчая сіла 6». Серыял.
**15.40** «Жаданая». Серыял. Закл. серыя.
**16.50** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Першая дачка краіны». ЗША, 2004г.
**22.20** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Дабро пажаліцца».
**23.20** «Забойчая сіла 6». Серыял.
**00.15** «Водбліскі». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**10.10** Жансавет.
**10.45** Канцэрт Jean Michel Jarre «Water For Life».
**12.55** Спорт-кадр.
**13.25** Рэальны свет.
**13.50** Дак. фільм «Герб і сцяг маёй краіны».
**14.15** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**15.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**20.00** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** Спортлато 5 з 36.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Канцэрт Jean Michel Jarre «Water For Life».
**23.40** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**00.25** Рэальны свет.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Галубка».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Прамы эфір».
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**21.30** Тэлесерыял «Галубка».
**23.15** Прэм'ера. Тэлесерыял «Асобы, якіх ахоўваюць».
**00.10** Навіны - Беларусь.
**00.20** Прэм'ера. «Апошняя камандзіроўка».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Кватэрнае пытанне».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Уласны гонар».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** Дэтэктыўны серыял «Таўро».
**15.05** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Марскія д'яблы».
**21.20** Серыял «Глушэц. Працяг».
**23.05** Сёння.
**23.30** Дэтэктыў «Мы аб'яўляем вам вайну».
**00.25** Серыял «Крымінальнае відэа».

### EUROSPORT

**04.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 5-ы.
**05.00, 06.00, 08.00, 09.30, 14.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 2-і.
**11.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 5-ы.
**11.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 4-ы.
**16.00** Веласпарт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 10-ы этап.
**17.00** Веласпарт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 11-ы этап.
**18.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 5-ы. Агляд.
**19.15, 02.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 3-і.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 42 серыя.
**07.50** «Арол», серыял: 5 серыя.
**08.55** Праект «Будучыня».
**09.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Сакрум», дак. фільм, 2007 г., Расія–Польшча.
**10.00** YoLife!
**10.20** «Ранча», серыял: 41 серыя.
**11.10** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**11.25** «Бульбаны», мультсерыял.
**11.30** Невядомая Беларусь: «Свіцязь, горад на дне возера», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** Прыватная калекцыя.
**12.20** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**12.45** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 42 серыя.
**13.10** «Арол», серыял: 5 серыя.
**14.10** Праект «Будучыня».
**14.40** Паляванне на дзівосы.
**14.55** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Сакрум», дак. фільм, 2007 г., Расія–Польшча.
**15.30** YoLife!
**15.50** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 3 сезон, 12 серыя.
**16.40** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**16.45** «Бульбаны», мультсерыял.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Мой родны горад», серыял: 1 серыя.
**17.25** «Дэтэрмінатар», серыял: 9 серыя.
**18.15** «Рэнэ», дак. фільм, 2009 г., Чэхія.
**19.10** YoLife!
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Паляванне на дзівосы.
**19.55** На колах.
**20.30** Басанож па свеце.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Побач з намі.
**21.40** Вагон.
**21.50** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 4 серыя.
**22.15** «Euromaxx».
**22.45** Аб'ектыў.

## 1 ВЕРАСНЯ, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.45** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** Відэафільм АТН «9 балаў. SOS».
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**11.00** Меладраматычны серыял «Маруся. Вяртанне» (Украіна).
**12.10** Камедыя «На спіне ў чорнага ката» («Беларусьфільм»).
**13.45** Сінематэка.
**14.30** Відэафільм цыклу «Лёгка сказаць».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультсерыял «Гара Самацветаў».
**16.00** «Дакрананне». Хранікальна-дакументальны фільм.
**16.30** Здароўе.
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.55** Меладраматычны серыял «Маруся. Вяртанне» (Украіна). Заключная серыя.
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**21.55** Меладраматычны баявік «Рысь» (Расія).
**23.55** Дзень спорту.
**00.10** Дак. цыкл «У пошуках ісціны».

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.05** «Дэтэктывы».
**12.40** «Таямніцы патанулых караблёў».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Каралева экрану». Камедыйны серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Справа была на Кубані». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Шматсер. фільм «У лясах і на гарах».
**23.05** «Жалезны Гармаш і яго маленькія слабасці».
**00.00** Прэм'ера. «Таварышы паліцыянты». Шматсерыйны фільм.
**00.55** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**08.40** Фільм «Першая дачка краіны». ЗША, 2004 г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Халасцякі». Серыял.
**14.40** «Забойчая сіла 6». Серыял.
**15.40** «Насланне». Серыял.
**16.50** «Мінск і мінчане».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Знаёмцеся: Дэйв». ЗША, 2008 г.
**22.20** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Аўтапанарама».
**23.20** «Забойчая сіла 6». Серыял.
**00.15** «Водбліскі». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**10.10** Жансавет.
**10.45** Канцэрт Kylie Minogue «X-Tour».
**12.30** Рэальны свет.
**13.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
**15.40** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**15.55** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.00** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**18.00** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргентына).
**19.00** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**20.00** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Канцэрт Kylie Minogue «X-Tour».
**23.10** Час футболу.
**23.50** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Прэм'ера. Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Галубка».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Прамы эфір».
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**21.30** Тэлесерыял «Галубка».
**23.15** Прэм'ера. Тэлесерыял «Асобы, якіх ахоўваюць».
**00.10** Навіны - Беларусь.
**00.20** Прэм'ера. «Гістарычны працэс».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Дачны адказ».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Таўро».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** «Пракурорская праверка».
**17.35** Прэм'ера. «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Вострасюжэтны серыял «Марскія д'яблы».
**21.20** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**23.05** Сёння.
**23.30** Дэтэктыў «Мы аб'яўляем вам вайну».
**00.25** Дэтэктыўны серыял «Крымінальнае відэа».

### EUROSPORT

**04.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 6-ы.
**06.30** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 3-і.
**08.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 3-і.
**11.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 6-ы.
**11.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 4-ы.
**12.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 6-ы.
**15.45** Веласпарт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 11-ы этап.
**17.00** Веласпарт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 12-ы этап.
**18.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 6-ы. Агляд.
**20.15** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 4-ы.
**02.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 4-ы.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** «Мой родны горад», серыял: 1 серыя.
**07.50** «Дэтэрмінатар», серыял: 9 серыя.
**08.35** Паляванне на дзівосы.
**08.50** YoLife!
**09.05** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**09.35** «Рэнэ», дак. фільм, 2009 г., Чэхія.
**10.40** «Ранча», серыял: 42 серыя.
**11.30** «Euromaxx».
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 3 сезон, 12 серыя.
**12.50** «Мой родны горад», серыял: 1 серыя.
**13.15** «Дэтэрмінатар», серыял: 9 серыя.
**14.00** Побач з намі.
**14.15** На колах.
**14.45** Басанож па свеце.
**15.10** YoLife!
**15.30** «Рэнэ», дак. фільм, 2009 г., Чэхія.
**16.30** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Сонечная дзіда», серыял: 1 серыя.
**17.30** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 4 серыя.
**17.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.05** «Бяссрэбранікі», дак. фільм, 2009 г., Вялікабрытанія.
**19.05** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Першы дзень», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**20.05** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Два на два (тэледыскусія): Віктар Марціновіч і Вячаслаў Бабровіч.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**21.40** «Генерал Клеэбэрг і яго жаўнеры», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**22.35** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**23.00** МакраФон: «Басовішча-2007», канцэрт гурта «Крамбамбуля»: ч. 1.
**23.30** Аб'ектыў.

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №8 (60)
(жнівень)

www.lit-bel.org www. novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


Анонс


«НАВІНЫ»: літаратурна-грамадскае жыццё жніўня ........ с. 2.
«ПУБЛІЦЫСТЫКА»: Алесь ГІБОК-ГІБКОЎСКІ пра ўгодкі путча ........ с. 3.
«КРЫТЫКА»: Леанід ГАЛУБОВІЧ пра Генадзя БУРАЎКІНА ........ с. 4.
«ПАЭЗІЯ»: «Тайны знак» Генадзя БУРАЎКІНА ........ с. 5.
«ПРОЗА»: сатырычнае апавяданне Кузьмы Вясёлага ........ с. 6.
«ПАЭЗІЯ»: «Штрыхі» Віктара СЛІНКО ........ с. 7.
«ЧЫТАЛЬНЯ»: фрагменты аповесці Сяргея ПЯТРОВА «Мейлах у кастрычніку» ........ с. 8–9.
«ПЕРАКЛАД»: «Усмешка на вуснах павешанага»: Велямір ХЛЕБНІКАЎ у перастварэнні Міколы ПАПЕКІ ........ с. 10.
«ПРОЗА»: «Трэцяя выснова» Міколы КАСЦЮКЕВІЧА ........ с. 11.
«ФРАГМЕНТЫ»: Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК: пра беларускую Вільню і Радаслава АСТРОЎСКАГА ........ с. 12–13.
«ЭСЭ»: «Відарыс» Алеся ПАШКЕВІЧА ........ с. 14.
«КРЫТЫКА»: роздум Веранікі СТРАЛЬЦОВАЙ пра творчасць Алы СЯМЁНАВАЙ ........ с. 15.
«КАЛЕЙДАСКОП»: інтэрв'ю з Віталем РЫЖКОВЫМ ........ с. 16.


ПАЗІЦЫЯ

## ПУЛЬС. БЕЛАРУСКІ РОЗГАЛАС

Антон Тарас, naviny.by

**Нягледзячы на дэфіцыт валюты, жыццё ў беларускім горадзе па-ранейшаму цудоўнае. Але не па серадах. Па серадах на вуліцу лепш не выходзіць. Бо ці мала што?! Падбягуць, схопяць невядомыя ў цывільнай вопратцы, звалакуць вас Бог ведае куды... Шукай пасля па турмах.**



«Адзінае з таго нямногага, чаму вучыць гісторыя, — што перамены ў лепшы ці горшы бок адбываюцца часцяком тады, калі іх патрабуюць нашы сэрцы й нашы душы. Гэта значыць, што жывучы ў блаславёныя часы са светаадчуваннем акаянных дзён, мы міжволі спрыяем прыходу апошніх», — напісаў Сяргей Дубавец.

Кажучы пра «акаянныя дні», Дубавец адштурхоўваецца ад аднайменнага твора Івана Буніна. У дзённіку часоў станаўлення ўлады бальшавікоў расійскі пісьменнік распавядае пра бясчынствы, маральную дэградацыю і знішчэнне лепшага з нажытага ў мінулым. «Прыблізна гэтак многія ўспрымаюць і сённяшнюю сітуацыю ў Беларусі», — адзначае Сяргей Дубавец. Камісары ўяўляюцца Івану Буніну ўчарашнімі катаржнікамі, Ленін — жывёлай, Расія — адным вялікім канцом свету; «прыблізна гэтак шмат хто выказваецца пра сённяшні рэжым у Беларусі. Нават словы падбіраюцца тыя самыя».

Разам з тым, беларускі публіцыст падкрэслівае, што час, апісаны Іванам Буніным, адрозніваецца ад нашага, бо ў расійскага літаратара «ледзьве не ў кожным радку — факты масавага бясчынства, рабунку й забойстваў».

«Уражвае тое, што наш час у параўнанні з апісаным у Буніна — не тое, што не такі, а процілеглы яму. Ніхто не жыве ў пастаянным боязі быць зараз і ні за што забітым, не чытае ў газетах пра масавыя расстрэлы й пагромы на суседняй вуліцы. Але словы для характарыстыкі сваёй эпохі людзі часцяком падбіраюць тыя самыя, «максімальныя», — адзначаў Дубавец.

З часу публікацыі гэтага цытаванага мною твора прайшлі два гады, і перыяд гэтак званай «лібералізацыі» скончыўся. У якой ступені спрыялі таму «максімальныя» словы некаторых выбаршчыкаў, палітыкаў, журналістаў — пытанне асобнае. Але навіны пра тое, як супрацоўнік праваахоўных органаў наступіў каленам на горла пенсіянеру Уладзіміру Марозаву; як суддзя аштрафаваў аднарукага Канстанціна Капліна за пляскане ў далоні; як міліцыя арыштоўвала звычайных пакупнікоў гіпермаркета «Гіпа» — ясна сведчаць: акаянныя дні вяртаюцца. Чаго толькі вартыя чуткі пра цяжарную кабету, якая страціла дзіця ў выніку неапраўданага затрымання «людзьмі ў цывільнай вопратцы»?! (Натуральна, «чуткамі» гэты шакуючы факт я называю толькі таму, што сама пацярпелая лічыць за лепшае не кантактаваць зараз з прэсай).

Пра што кажуць нам бессэнсоўныя затрыманні, арышты і прысуды? Верагодна, пра тое, што праваахоўныя органы забіраюць грамадзян адвольна і бессістэмна, папросту выконваючы план. Бессэнсоўнасць затрыманняў наводзіць на думку, што штосьці падобнае ўжо было ў нашай гісторыі — у самыя змрочныя часы савецкага таталітарызму, калі, па сведчанні Аляксандра Салжаніцына, органы «часцей за ўсё не мелі глыбокіх падставаў для выбару — якога чалавека арыштаваць, якога не чапаць, а толькі дасягалі кантрольнай лічбы. Запаўненне лічбы магло быць заканамернае, магло ж насіць выпадковы характар».

У шмат якіх выпадках людзей, арыштаваных органамі, чакала пагібель. Некаторым пры арышце ўдавалася збегчы, як латышу Андрэю Паўлу, які выскачыў, ратуючыся ад НКУС, праз акно, і з-пад Оршы перабраўся ў Сібір. «І хоць жыў ён там пад сваім жа прозвішчам, і ясна было па дакументах, што ён — з-пад Оршы, ён НІКОЛІ не быў пасаджаны, ані выкліканы ў органы, ані пастаўлены пад якое-небудзь падазрэнне», — піша Аляксандр Салжаніцын, тлумачачы гэта тым, што палову схопленых падчас «арыштных эпідэмій» не абвяшчалі ва ўсесаюзны вышук: «намечаны да арышта па выпадковых абставінах, накшталт даносу, чалавек лёгка замяняўся іншым суседам».

Наконт затрыманняў мінакоў пісьменнік-дысідэнт паведамляе: «У 1927-м годзе, калі пакорлівасць яшчэ не настолькі размякчыла нашыя мазгі, на Серпухоўскай плошчы ўдзень два чэкісты спрабавалі арыштаваць жанчыну. Яна абхапіла ліхтарны слуп, пачала крычаць, не давацца. Сабраўся натоўп. (Патрэбна была такая жанчына, але патрэбны ж быў і такі натоўп! Прахожыя не ўсе апусцілі вочы, не ўсе паспяшаліся шмыгнуць міма!) Паспешлівыя гэтыя рабяты адразу сумеліся. Яны не могуць [працаваць] пры святле грамадства. Яны селі ў аўтамабіль і ўцяклі. (І тут бы жанчыне адразу на вакзал і з'ехаць! Але яна пайшла начаваць дадому. І ўначы адвезлі яе на Лубянку)».

Вядома, выпадковых (і невыпадковых) мінакоў, якіх арыштоўваюць у наш час у сувязі з антыўрадавымі пратэстамі па серадах, не чакае расстрэл. «Гісторыя паўтараецца двойчы: першы раз у выглядзе трагедыі, другі — у выглядзе фарса», — заўважае нямецкі філосаф Георг Вільгельм Фрыдрых Гегель. Не дзіўна, што праваахоўная сістэма звяртаецца да планавых затрыманняў, бо ж яна з'яўляецца непасрэднай пераемніцай сістэмы сталінскай, нічога істотна новага яе распарадчыкі прыдумаць не здольныя (праўда, зараз «паспешлівыя рабяты» не саромеюцца ані натоўпу, ані тэлекамер). Расстраляць не расстраляюць, але зняважаць справядлівасць і замахнуцца на годнасць.

Грамадзянам, выпадковым грамадзянам, якія ніколі не ўдзельнічалі ў палітычнай барацьбе — што ім рабіць у такіх абставінах?

Грамадзянам, якіх ні за што хапаюць на вуліцах рабяты ў цывільным і ў форме?

Грамадзянам, якія зрабіліся закладнікамі бесчалавечнай сістэмы?

Бегчы няма куды, заходняя мяжа — на візавым замку; не ў Сібір жа, як Андрэю Паўлу! (І каму захочацца пакідаць Радзіму, любых, справу з-за промыслу нейкіх «рабятаў»?!). Застаецца «хапацца за ліхтарныя слупы»: галасіць на цэлы свет пра беззаконне, якое чыніцца ў Беларусі.

СМІ абавязаныя дапамагчы данесці гэты голас да кожных вушэй і да кожнага неабыякавага сэрца.



▸ КОНКУРСЫ

## ТЭАТР «ЛЯЛЬКА» АБВЯШЧАЕ КОНКУРС ПАЭТЫЧНЫХ П'ЕСАЎ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Віцебскі беларускі тэатр «Лялька» запрашае да супрацоўніцтва таленавітых айчынных паэтаў-драматургаў незалежна ад узросту, досведу і членства ў пісьменніцкіх арганізацыях. На дадзены момант тэатр мае патрэбу ў п'есе, якая адпавядала б наступным патрабаванням:

- мяркуемы ўзрост гледачоў — ад 4-5 гадоў;
- займальны дынамічны сюжэт з ненавязлівым выхаваўчым падтэкстам (фабула можа быць як арыгінальнай, так і запазычанай з фальклору ці сусветнай літаратуры);
- вершаваная форма ці, прынамсі, наяўнасць вялікай колькасці прыгожых і лёгкіх для ўспрымання вершаў на беларускай мове (мяркуецца выкарыстанне на сцэне аркестра з ліку артыстаў з выкананнем песняў пад «жывую» музыку);
- аб'ём у памеры 12–17 старонак 14-м памерам стандартнага шрыфту.

Да разгляду прымаюцца таксама мастацкія пераклады твораў. У якасці ўсім вядомага прыкладу можна назваць «Кошчын дом» С. Маршака.

Творы прымаюцца да разгляду на конкурснай аснове да 1 снежня 2011 года.

Тэл. у Віцебску: 37-34-61
e-mail: info@lialka.vitebsk.net

▸ РОЗГАЛАС

# ЗАЯВА САЛІДАРНАСЦІ

**Саюз нямецкіх пісьменнікаў звярнуўся з адкрытым лістом да Аляксандра Лукашэнкі.**

Нямецкія пісьменнікі і дзеячы культуры звярнуліся да кіраўніка Беларусі, пратэстуючы супраць прыгнёту і цэнзуры ў Рэспубліцы Беларусь. Ліст да А. Р. Лукашэнкі падпісалі старшыня Саюза нямецкіх пісьменнікаў Імрэ Торак (Imre Török), старшыня Акадэміі мастацтваў Клаўс Штаек (Klaus Staeck), старшыня нямецкага ПЭН-клуба Ёгана Штрасер (Johano Strasser), лаўрэаткі Нобелеўскай прэміі па літаратуры Эльфрыда Елінэк (Elfriede Jelinek) і Герта Мюлер (Herta Müller), а таксама іншыя пісьменнікі і дзеячы нямецкай культуры — усяго больш за 40 вядомых прадстаўнікоў літаратурнага і мастацкага асяродку Нямеччыны. Спіс тых, хто падтрымаў ініцыятыву, працягвае папаўняцца.

«Мы, інтэлектуалы і дзеячы культуры, асабліва ў Федэратыўнай Рэспубліцы Германія, востра адчуваем адказнасць за дэмакратычныя свабоды», — лічыць Імрэ Торак. Паводле яго словаў, пераслед апазіцыянераў, забарона нелаяльных уладам СМІ, прыгнёт крытычна настроеных культурных дзеячаў недапушчальныя і вымагаюць асуджэння з боку ўсіх дэмакратычных сілаў.

Асабліва востра нямецкія пісьменнікі выступаюць супраць дзеяння так званых «чорных спісаў» пісьменнікаў і дзеячаў мастацтва, чые творы неабгрунтавана прызналі «шкоднымі для моладзі», а таксама выцеснілі з дзяржаўных газет і часопісаў, з перадачаў на радыё і тэлебачанні, са сцэнаў канцэртных залаў і тэатраў. «Такая форма цэнзуры супярэчыць разуменню свабоды і разнастайнасці культуры і мастацтва», — гаворыцца ў заяве, распаўсюджанай Саюзам нямецкіх пісьменнікаў.

«Мы хочам асаблівым чынам выказаць сваю салідарнасць з нашымі прыгнечанымі беларускімі калегамі, — тлумачыць Імрэ Торак. — А таму вырашылі аддаць гэты адкрыты ліст амбасадару Рэспублікі Беларусь у Берліне».

З тэкстам адкрытага ліста да Аляксандра Лукашэнкі, а таксама з заявай Саюза нямецкіх пісьменнікаў (па-нямецку) можна пазнаёміцца на сайце грамадскай арганізацыі: http://vs.verdi.de/aktuelles/pressemeldungen/weissrussland.

▸ ЮБІЛЕЙ

# ДА 100-ГОДДЗЯ МІЛАША



**Сайт «Родная Еўропа» сумесна з інтэрнэт-часопісам «ПрайдзіСвет» аб'яўляе конкурс, які патрабуе ведання роднай мовы (ці хуткага «арыентавання на мясцовасці» і ў слоўніках), а абяцае прызы на мове Чэслава Мілаша.**

Як вядома, сам Чэслаў Мілаш лічыў сябе грамадзянінам Вялікага Княства Літоўскага, а дзяцінства правёў на Віленшчыне (што пазначана нават на «Пачатку кніжных дарог Беларусі»). Моўнае асяроддзе ў Шатэйнях, радавым маёнтку Мілашаў, было даволі стракатым. Тут змяшаліся польская, літоўская, беларуская, габрэйская і расійская мовы. Найбольш падрабязна пра гэтыя мясціны распавядае аўтабіяграфічны раман Чэслава Мілаша «Даліна Ісы», напісаны ў 1956 г.

Увазе канкурсантаў прапануецца спіс дыялектных слоў, якія сустракаюцца ў тэксце «Даліны Ісы». Многія з іх вядомыя і шырока ўжываюцца на паўночным Захадзе Беларусі, некаторыя ўласцівыя толькі канкрэтным рэгіёнам. Задача ўдзельнікаў — максімальна дакладна раскрыць іх значэнне.

Такім чынам:

**Кіянка**
**Швапетаць**
**Ройст**
**Клумпы**
**Бітнік**
**Шакалёк**
**Віксва**
**Сліжыкі**

Адказы дасылайце на скрыньку: rada@prajdzisvet.org.

Пераможца будзе вызначаны ў выніку надзвычайнай нарады рэдакцыі сайта «Родная Еўропа» ў верасні.

prajdzisvet.org

▾ ПАЛІЦА

## НОВЫЯ ВЫДАННІ САЮЗА БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

**Іван ЛАГВІНОВІЧ. Элегія палескага матыля: вершы. — Мінск: Кнігазбор, 2011. — 88 с. — Наклад 300 асобнікаў. / Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка», вып. 11.**




Паэт Іван Лагвіновіч памёр 29 сакавіка 2011 года. Гэтая кніга змясціла апошні, яшчэ ім самім складзены зборнік «Свечкі трыпутніка» і яшчэ два дзясяткі лепшых вершаў, напісаных на працягу ўсяго творчага шляху. Адмысловы лірычны склад мастацкага мыслення і вычуванне паэта навідавоку. Шкада, што шырокае кола прыхільнікаў беларускай паэзіі мала ведае пра ягоны творчы плён. Укладальнікі і выдаўцы кнігі спадзяюцца, што з выхадам «Элегіі палескага матыля» самабытны талент Івана Лагвіновіча будзе заўважаны і належна ацэнены.

**Эдгар ПО. Маска Чырвонае Смерці: выбраныя навелы, вершы, эсэ. — Мінск: Кнігазбор, 2011. — 472 с. — Наклад 500 асобнікаў. — (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка», вып. 12; Бібліятэка часопіса «ПрайдзіСвет» «PostScriptum».)**




У зборнік Эдгара По «Маска Чырвонае Смерці» ўключаны не толькі шырока вядомыя дэтэктывы — адны з першых узораў гэтага жанру ў сусветнай літаратуры — і жахлівыя апавяданні («арабескі»), але і значна менш вядомыя гратэскі пісьменніка — творы, што паказваюць «бацьку дэтэктыву» зусім з іншага, іранічнага, боку. У кнігу таксама ўвайшлі вершы і два самыя вядомыя эсэ Эдгара По: «Паэтычны прынцып» і «Філасофія кампазіцыі». Абсалютная большасць змешчаных у зборніку перакладаў друкуецца ўпершыню.

**Віктар СЛІНКА. Арахна: вершы, эсэ, паэма. — Мінск: Кнігазбор, 2011. — 204 с. — Наклад 300 асобнікаў. /Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка», вып. 13.**




Новую кнігу беларускага паэта склалі медытатыўная лірыка, авангардныя верлібры, эсэ «3 нагоды лістападаўскіх халадоў» і паэма «Жбан, вада». Рэдактарам зборніка стаў Леанід Дранько-Майсюк.

**Алесь ДУБРОЎСКІ-САРОЧАНКАЎ. Эстэтыка маўчання: вершы, паэма. — Мінск: Кнігазбор, 2011. — 88 с. — Наклад 300 асобнікаў. /Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка», вып. 14.**




Другая паэтычная кніга Алеся Дуброўскага (першая выйшла ў 1997 годзе) адрозніваецца шырынёй дыяпазону інтанацый: ад іроніі (раздзел «Пароды без арыгіналаў») да філасофска-багаслоўскай сур'ёзнасці (лірычная паэма «Новае неба»). Пры гэтым праз усю кнігу праходзіць адзін матыў — Слова і маўчанне…

**Аксана ДАНІЛЬЧЫК. Сон, які немагчыма забараніць: вершы. — Мінск: Кнігазбор, 2011. — 168 с. — Наклад 300 асобнікаў. / Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка», вып. 15.**




Новая кніга паэтэсы — актуальная еўрапейская паэзія з глыбока асабістымі, але зразумелымі і блізкімі кожнаму, хто спрабуе адказаць на вечныя пытанні, вобразамі, думкамі, ідэямі, якія складаюцца ў ланцужок рэфлексій, знакавы для арыгінальнай эстэтыкі аўтаркі. А змешчаныя ў кнізе пераклады з італьянскай мовы (творы Уга Фоскала, Алесандра Мандзоні, Луіджы Меркантіні ды інш.) сведчаць пра шматграннасць творчага жыцця А. Данільчык.

▸ ДРУК

# «ВЕРАСЕНЬ» №4 — УЖО ЛЕТАМ!

**Выйшаў з друку чарговы нумар літаратурна-мастацкага часопіса «Верасень».**




Змест чацвёртага нумара склалі вершы Вольгі Паўлюкевіч, Алеся Емяльянава, Ганны Новік, Кропачкі (Руслана Юсупава), Кацярыны Дубоўскай, Іны Севярын, Алеся Плоткі, Міколы Кандратава і Леаніда Дранько-Майсюка.

Проза прадстаўлена творамі Аліны Длатоўскай, Аляксея Палачанскага, Дар'і Збродавай, Кацярыны Глухоўскай, Настассі Кухарэнка, Паўла Ляхновіча.

У раздзеле «Пераклады» друкуюцца вершы Васіля Стуса і Эвы Ліпскай. Зацікавяць чытача і змешчаныя ў нумары артыкулы Ірыны Хадарэнка, Наталлі Пыско, Генадзя Лапаціна і Васіля Зуёнка, гутаркі з Міхасём Скоблам і Уладзімірам Някляевым, рэцэнзіі Анатоля Мяльгуя і Віталя Мартыненкі, а таксама невядомыя вершы Анатоля Сыса з кнігі «Берагі майго юнацтва».

Пытайце «Верасень» № 4 на сядзібе ТБМ (Румянцава,13) і ў «Акадэмкнізе». Дасылайце свае творы ў часопіс «Верасень» на электронны адрас: verasenchas@gmail.com

РОЗДУМ

# НА ПЕРАЛОМЕ: 20 ГАДОЎ ГКЧП

«Жнівеньскі путч 19–21 жніўня 1991 года — спроба антыканстытуцыйнага пераварота ў СССР, які ажыццявіла кансерватыўнае крыло кіраўніцтва СССР і КПСС. Быў скіраваны на ўзнаўленне ў поўным аб'еме ўлады партыйна-дзяржаўнай наменклатуры. Мяцеж узначаліў Дзяржаўны камітэт па надзвычайным становішчы (ГКЧП) у складзе А. Д. Бакланава, У. А. Кручкова, У. С. Паўлава, Б. К. Пуга, В. А. Старадубцава, А. І. Цізякова і Г.І. Янаева… Путч закончыўся правалам. Яго вынікамі было падзенне камуністычнага рэжыму і паскарэнне распаду СССР».

**«БЭКиМ», 2004**

Алесь ГІБОК-ГІБКОЎСКІ

**У лёсе дзяржаваў, як і ў лёсах людзей, ёсць пэўныя дні, якія застаюцца своеасаблівай вяхой, ад якой пачынаецца адлік новай, ужо зусім іншай гісторыі быцця. Лепшай ці горшай — такое пытанне заўсёды хутчэй філасофскае, улічваючы адноснасць гэтага самага быцця...**

**Для мяне адным з такіх дзён стаўся дзень 19 жніўня 1991 года — Дзень Праабражэння Гасподня, або, як кажуць у народзе — Спаса. Гэты святы дзень прынёс усім нам у тым сумбурным шматколерным 91-м выразны знак — з яго пачалося імклівае фізічнае падзенне яшчэ адной Бабілонскай вежы — вялізнай імперыі пад назваю СССР.**

…Сустрэў я 19 жніўня 1991 года ў сваёй роднай вёсцы Рупейкі, што на Ваўкавышчыне. Гэта быў акурат апошні дзень майго чарговага адпачынку, які я тады традыцыйна праводзіў у бацькоў. Памятаю, што прачнуўся як ніколі рана, і калі выйшаў у кухню, дзе працавала радыёкропка, нешта ў яе «паводзінах» мне падалося дзіўным. Адтуль не гучалі, як звычайна, бадзёра-аптымістычныя «абуджальныя» навіны і песні, а дыктарка відавочна напружаным голасам агучвала нейкі тэкст. Як аказалася, гэта былі дырэктыўныя дакументы «новай улады», якая толькі што ўзяла на сябе кіраванне СССР — ГКЧП. Паводле іх, у крэпкага дасюль, як агурочак, прэзідэнта СССР Міхаіла Гарбачова раптам радыкальна сапсаваўся стан здароўя і ён страціў магчымасць кіраваць краінай. І, зразумела, цяжкую ношу ўлады ўзяло на сябе новае кіраўніцтва. Але што было дзіўным: яно было не персанальным, а калектыўным — момант для савецкага менталітэту зусім нязвыклы.

З далейшай інфармацыі вынікала, што раптоўная «хвароба» Гарбачова дзіўным чынам супала з разгулам «негатыўных працэсаў» ва ўсёй краіне, якія, на думку ГКЧП-істаў, пагражалі існаванню і яе самой. І яны бралі на сябе «сацыялістычныя абавязацельствы» тыя нехарошыя працэсы спыніць...

А на дэсерт дыктарка, давёўшы свой голас ледзь не да трагічнага надрыву, аб'явіла, што ў сталіцу СССР Маскву ўводзяцца воінскія часці, якія, мяркуючы па ўсім, і павінны былі ажыццявіць «навядзенне парадку»...

***

Стала відавочным, што ў Маскве дзяржаўны пераварот. Што і казаць, настрой пасля пачутага быў не радасны... Рушыліся ўсе надзеі і спадзяванні на чакаемыя перамены да лепшага, якія ў апошнія некалькі гадоў сталі выкрышталізоўвацца даволі прадметна. Ужо некалькі гадоў адбываліся зрухі да дэмакратызацыі жыцця, да рэфармавання стагніруючай сістэмы ўлады, а ў нас у Беларусі актыўна пачынаў уздымаць галаву нацыянальны рух. Ну а з ім уздымалі свае галовы і мы — тыя людзі, якія дзесь у глыбіні сваёй наскрозь «асаўкаванай» душы здолелі захаваць маленькія расточкі гэтага нацыянальнага. Здавалася, яшчэ трошкі — і жыццё зменіцца, а тут!..

Агламошаны, я выйшаў на ганак, дзе стаяў, абапіраючыся на кіёк, мой ужо добра прыціснуты шматлікімі гадамі і балячкамі бацька, і з горыччу падзяліўся пачутым. Бацька неяк здзіўлена паглядзеў на мяне і спакойна прамовіў: «То чуў ужо… Ды ты не хвалюйся, праз пару дзён усё гэта скончыцца!..». Яму, амаль што равесніку «Великого Октября», зраненаму ў дзвюх войнах, ад таго моманту заставалася жыць крыху больш за паўгода. Яшчэ менш было адпушчана народжанай «Октябрём» вялізнай імперыі…

Як потым аказалася, бацька дакладна прадказаў лёс ГКЧП. Не думаю, што гэта было выпадкова. Відаць, на фінішы жыцця ў некаторых людзей абвастраецца адчувальнасць часу і падзеяў. А можа вось так выявіла сябе чалавечая жыццёвая мудрасць, якая часам дае магчымасць не горай за вялікіх аналітыкаў прадказваць тыя падзеі…

***

У той жа вечар 19 жніўня 1991 года я ўжо вяртаўся ў міжгародным аўтобусе ў сталіцу Беларусі пад нягучны гоман сваіх міжвольных спадарожнікаў. Пра маскоўскія падзеі амаль ніхто не гаварыў. Размовы былі звычайныя: пра жыццё, пра хлеб, пра дзяцей, якім хутка ў школу… Але, здаецца, у Баранавічах, на вольнае месца ля мяне падсеў дзядзька няпэўнага ўзросту, які быў крыху нападпітку і «з места ў кар'ер» асядлаў тэму ГКЧП. Сутнасць яго напаўцвярозай прамовы была немудрагелістай: нарэшце дачакаліся!

Спрачацца з ім у мяне не было ні жадання, ні сілаў, і я, як мог, адмоўчваўся, але адчуваючы маю нязгоду, дзядзька «наязджаў» на мяне аж да Мінска. «А вы думалі, што ўжо ўсё, камуністам каюк! Гэта вам не Чэхія і не Польшча. І нават не Чаушэску! Тут быў парадак і будзе! Яго яшчэ Сталін зладзіў! Нас не так проста скінуць!» Дзядзька яўна атаясамляў сваю няголеную, з дрэнным душком асобу з усёй усёмагутнай савецкай сістэмай. Цяжка сказаць, якою часткаю яе ён быў. Але хутчэй за ўсё стандартна віжоўскай — звычайным «сексотам», які баяўся магчымага свайго выкрыцця і радаваўся, што «пранесла». Разам з тым не было сумненняў, што ён быў і тыповым прадстаўніком нашага народа, на жаль, у многім зламанага шматвекавою барацьбою за выжыванне. Логіка такіх заўсёды была простай і ў многім слушнай: новае несла нечаканасці, а з імі і праблемы…





***

Мінск сустрэў спакоем. Праўда, у адрозненне ад правінцыі, дзе ўспрымалі ўсё з філасофскай стаічнасцю, тут пра ГКЧП гаварылі больш, але ўсё ж неяк адхілена, маўляў, якая нам розніца! Практычна ўсе беларускія СМІ добрасумленна надрукавалі-агучылі ГКЧП-оўскія дырэктывы. Мяркуючы па ўсім, беларускае кіраўніцтва ўспрымала тое, што адбылося 19 жніўня ў Маскве, як заканамернасць і пачынала паціху рыхтавацца да «зваротнага ходу». Балазе, у нас яго «адлегласць» была ці не самай найменшай у СССР. Беларуская «Вандэя», як ахрысціў тады БССР Алесь Адамовіч, пакуль не выяўляла вялікай актыўнасці ў гарбачоўскай перабудове, і ГКЧП — гэта быў яе шанц.

Аднак Мінск не спяшаўся прымаць нейкія радыкальныя меры да «ўпарадкавання» сітуацыі, заняўшы чакальную пазіцыю. Ды і адчувалася нейкая яго дэмаралізаванасць. Назаўтра, 20 жніўня, на плошчы, якая тады яшчэ насіла імя Леніна, сабралася некалькі тысяч людзей, якія выказалі актыўную нязгоду з падзеямі ў Маскве, але ўлады іх не чапалі, насуперак строгім маскоўскім дырэктывам. І ўсё ж тыя людзі, якія прыйшлі 20 жніўня на плошчу, былі смелымі людзьмі, бо 19 жніўня ў грамадстве зноў была пасеяная атмасфера страху. І выхад на плошчу тады, калі здавалася, што з дэмакратыяй усё скончана, быў своеасаблівым актам мужнасці, хоць і без вялікай надзеі нешта змяніць.

Але потым прыйшла інфармацыя пра бунтарскі Белы Дом і Ельцына, які ўзначаліў супрацiў ГКЧП, пра дзіўную нерашучасць ГКЧП-істаў, якую, зрэшты, і сам народ тады не разумеў. Нават той, які мітынгаваў у Мінску 20 і 21 жніўня на плошчы Леніна. Усе здзіўляліся: «Чаму яны не штурмуюць Белы Дом, чаго чакаюць?!» У Маскве і насамрэч нечага чакалі. Як потым аказалася — канца авантуры. Асабліва пасля таго, як увесь свет убачыў знакамітую прэс-канферэнцыю ГКЧП, дзе ў галоўных «абаронцаў СССР» калаціліся рукі.

Задуманы, як акт выратавання сацыялізму і СССР, ГКЧП у выніку стаўся фарсам. Людзі, якія яго зладзілі, былі тыповым прадуктам наменклатурнай «селекцыі», якім патрэбен быў адзінаначальны лідэр. А не здолеўшы выбраць такога, яны былі заведама асуджаныя на паражэнне, бо «гуртом» прымаць рашэнні проста не ўмелі. Пераварот не толькі нічога не выратаваў, але, наадварот, стаў апошнім каменьчыкам, які абрынуў нястрымную лавіну разбурэння раней магутнай сістэмы, тым каталізатарам, які вокамгненна паскорыў і падзенне сацыялізму, і гібель КПСС, і развал супердзяржавы СССР. Сплочаныя «навек» рэспублікі разбегліся пасля гэтага ва ўсе бакі. У тым ліку і БССР, хоць з усіх рэспублік яна найменш прагла гэтага. Але атрымалася як у вядомым анекдоце: «Дык усе пайшлі тапіцца…». І іронія лёсу: менавіта на зямлі «Вандэі» ў дрымучых нетрах Белавежы быў падпісаны канчатковы прысуд СССР.

Праз некалькі дзён пасля ГКЧП група дэпутатаў на чале з нашым бравым генералам-касманаўтам Кавалёнкам рашуча ўнесла ў залу паседжанняў Вярхоўнага Савета БССР бел-чырвона-белы сцяг, а фармальнай дасюль Дэкларацыі аб суверэнітэце была нададзеная сіла закона. Гэта якраз тады, у жніўні 1991 года, Беларусь займела свой сапраўдны Дзень незалежнасці. Потым быў верасень, дзе пракамуністычная большасць ВС хоць і са скрыпам, але ўсё ж выбрала «дэмакрата» Шушкевіча першай асобай дзяржавы і «дэ юрэ» зацвердзіла ненавісную «БНФ-аўскую» сімволіку. А потым былі і згаданыя Віскулі. Але лёсавызначальным пераломам быў менавіта дзень 19 жніўня 1991 года.

***

Апошняе дзесяцігоддзе на постсавецкай прасторы відавочна ўздымаюць галаву прадаўжальнікі справы ГКЧП. Робяцца спробы аднавіць нешта накшталт былога СССР. У гэтым кантэксце доўгі час ладзіліся і інтэграцыйныя працэсы паміж Беларуссю і Расіяй. Калі адхіліцца ад чыста палітычнай рыторыкі, то хутчэй за ўсё і гэтыя спробы робяцца з самых лепшых памкненняў, бо наўрад ці ёсць такія палітыкі, якія б хацелі ліха свайму народу. Асабліва калі інтэграцыйная дамінанта ў ім і насамрэч пакуль яшчэ моцная. Але тых, хто ўзяў на сябе ролю збіральніка «заблукалых авечак» у новы саюзны «статак», гісторыя відавочна, нічому не навучыла. Замест выпрацоўкі метадаў, здольных краўна зацікавіць магчымых удзельнікаў новага «СССР», яны выбралі традыцыйныя для сябе метады, не грэбуючы ні палітычным, ні эканамічным шантажом у дачыненні да былых «братоў-сясцёр».

«Хто ведае, ці не тут і насамрэч адна з прычын сённяшняга крызісу беларускай эканомікі і фінансаў? Падкрэсліваю — адна з іх! Бо відавочна, што сённяшнія беларускія ўлады зусім не зацікаўлены ў больш шчыльнай інтэграцыі Беларусі з Расіяй, добра разумеючы магчымыя наступствы для саміх сябе асабіста. Праўда, гэта ці не адзінае пытанне, у якім у нацыянальнаарыентаваных колаў супярэчнасцяў з уладамі няма...

Што ж да ўзнаўлення СССР ці «Вялікай Расіі», то пакуль што гісторыя не ведае такога прыкладу, калі вялікія імперыі ўдавалася рэанімаваць…

***

З таго часу мінула 20 гадоў. Дрэнна ці добра было для нас усіх тое, што не стала КПСС, «сацыялізму», СССР, што мы жывём у незалежнай краіне? Пра гэта напісаны горы даследаванняў і навуковых прац. Меркаванні на гэты конт, мякка кажучы, розныя і зусім не плюралістычныя. Але, мяркуючы па ўсім, 20 гадоў у гістарычным кантэксце — яшчэ не дастатковы тэрмін, каб паглядзець на тыя падзеі зусім аб'ектыўна і спакойна. Бо вядома — «Лицом к лицу — лица не увидать!».

ВОДГУК

# З ПАЛЫНОВАЙ ТУГОЙ НА СЭРЦЫ

Леанід ГАЛУБОВІЧ

**Выхад у свет чарговагай кнігі паэта старэйшага пакалення амаль заўсёды выклікае запытанні і, часам, нават пэўны чытацкі недавер, звязаны са звыклай за дзесяцігоддзі аднастайнасцю беларускага літаратурнага працэса. Ну што можа быць новага ў чарговым выданні старога традыцыяналіста? Ці не самапаўтор? Ці не самаапраўданне?**




Гэтак ужо не раз бывала і ў мяне, бывае і цяпер. І дзіўна, што ў дадзеным выпадку мае дачасныя засцярогі былі дарэмнымі. Кніга вершаў і паэм вядомага паэта Генадзя Бураўкіна «Лісты да запатрабавання» (Мінск, «Кнігазбор», 2010) адклалася не толькі на маім стале, але, кажучы метафарычна, і ў маім сэрцы. Калі фармуляваць коратка і вызначальна (ацэначна): кніжка сур'ёзная і глыбокая. Так, у ёй няма зместавай і фармалістычнай навізны, але ёсць адкрытасць духоўнага (і душэўнага) чалавечага вопыту. Не паказное павучанне (глядзіце, які я!), не зануднае пераж оўванне пережытага, а яго — рубцы, раны, шрамы — боль... Не фізічны, а — ўнутраны.

*Нясу сваю душу жывую*
*На невядомы мне парог...*

Пераасэнсаванне пражытага падтэкстава выяўляецца нават у самых яго сучасных тэматычных вершах. Высновы робяцца не наўпрост, а ў спакойнай лірычнай танальнасці:

*Баяцца сноў жаніхі-перастаркі*
*Яшчэ, напэўна, з часоў Міндоўга...*
*Асеннія кветкі не дужа яркія,*
*Але затое красуюць доўга.*

Я памятаю Генадзя Мікалаевіча кіраўніком Беларускага тэлебачання. І тое, як скрупулёзна збіраліся ім на перспектыву і разумна фармаваліся нацыянальныя творчыя сілы. Там, прыхаваныя пад яго крылом і асабістай апекай, «выжывалі» і бунтоўныя музыкі, і мастакі, і пісьменнікі, і паэты (у тым ліку Анатоль Сыс і аўтар гэтых радкоў). Нягледзячы на свае пасады і партыйнасць, Г. Бураўкін як грамадзянін і мастак заўсёды быў захавальнікам нацыянальнага духу, беларускай культуры і роднай мовы. Ніколі не здраджваў галоўнаму: кроўнаму і караням сваім.

Пяцьдзясят гадоў таму сваю рэцэнзію ў часопісе «Беларусь» на першы яго зборнік «Майская просінь» тады яшчэ малады Міхась Стральцоў назваў «Нараджэнне рамантыкі». Наўрад ці Міхась Лявонавіч з яго «арыстакратычным вычуваннем жыцця» мог памыляцца ў сваім вызначэнні.

Бо і сённяшні Бураўкін, праўда, ужо больш пэўна і пераканаўча, пацвярджае свае колішнія мройныя пасылы:

*І дарадца твой адзіны —*
*Не маўклівыя пагоркі,*
*Не туманныя нізіны,*
*А задумлівыя зоркі...*

І хто б мог падумаць, што праз дваццаць тры гады ў тым жа выданні вядомы крытык Георгій Бяроскін сваю рэцэнзію на ўжо шосты зборнік паэта назаве гэтак суха і вызначальна-акадэмічна: «Майстэрства сталее». (Назваі сёння хто з крытыкаў так рэцэнзію на шосты зборнік сучаснага вершаскладальніка, дык адназначна не абярэцца крыўды і папрокаў...)

Але гэта між іншым. Бо ўжо наступны зборнік паэта «Варта вернасці» (1978) быў неўзабаве адзначаны Дзяржаўнай прэміяй імя Янкі Купалы. І хоць аўтар не аднойчы настойвае на сваёй абранасці (на Богам дадзены талент), у гэтых яго творчых «рэмарках» няма ані блефу, ані наіграшнасці, а ёсць натуральнасць яго «мастацкага стану душы»:

*Як стомленая песня на жніве,*
*Як самы першы жаўранак вясновы,*
*Мне голас быў.*
*І ён са мной жыве.*
*І шэпча мне свае скупыя словы...*

Я гэтаму абсалютна веру, бо тое пацвярджаецца ўсім паэтычным плёнам Г. Бураўкіна. Дарэчы, у самім зборніку нямала вершаў, якія тычацца тэмы самой творчасці, здараюцца і палемічныя па накалу (скажам, спрэчка з маладымі, неразуменне іх нігілізму ў вершы «Адыходзяць хлопцы...»)... Чаго няма ў вершах, дык гэта сухой абыякавасці і мляўкасці да жыцця, як уласнага, так і грамадскага. Нярэдка такія адносіны носяць даволі жорсткі характар. Да прыкладу, уражвае ў чыста лірычным вершы такая нечаканая, як выраваная ў гранаце чака, канцоўка:

*Чым больш бязлітасны пастух,*
*Тым больш слухмяная скаціна...*

(Хто гэты пастух і якая гэта скаціна, я мяркую, тлумачыць не трэба.)

І тут жа паэт можа стрымана ўраўнаважваць сітуацыю такімі эмацыянальна-афарыстычнымі строфамі, нечым падобнымі на раскладку аксюмарана:

*Нахабствам зла пераляканы,*
*Ратуючы ад бедаў свет,*
*«Дабру быць трэба з кулакамі!» —*
*Аднойчы выгукнуў паэт.*

*Ды ў бітвах вечных*
*ці лакальных*
*Даўно заўважыў я адно:*
*Усе махаюць кулакамі,*
*Дабра вось толькі не відно...*

Гэта як бы адказ на падвіслыя ў часе пытанні злабадзённай беларускай рэчаіснасці і на даўнія радкі расейскага славянафіла Станіслава Куняева.

Агулам, у вершах Г. Бураўкіна ставіцца вельмі шмат надзённых пытанняў, якія пакідаюцца без адказу альбо падразумяваюць адказ ужо ў саміх пастаўленых пытаннях...

*Валакуць бясконцым цягам*
*На плячах бяду старую,*
*Нехта нас на захад цягне,*
*Нехта нас на ўсход кіруе.*
*Нам аруць мячамі нівы,*
*Нам свінцом малоцяць збожжа.*
*І стаім мы сіратліва*
*На разбітым раздарожжы...*

Шмат вершаў грамадзянскага гучання, падчас рытарычна-пафасных, але зразумелых сваімі пасыламі, адчуваннямі і эмоцыямі, за якімі стрыжнёва вызначаецца чалавечая пазіцыя грамадзяніна-беларуса, паэта-сучасніка:

*Угледзь і ў глухой, непрагляднай ночы*
*Прымроены водбліск зары...*
*Пакуль цябе слухаюць —*
*Не маўчы,*
*Пакуль цябе чуюць яшчэ —*
*Гавары!..*

Зрэшты сёння ўжо і задоўжанае маўчанне гаворыць вельмі многае. Яно робіцца непалітыкарэктным, яго асцерагаюцца ўлады: бо — што за ім?!

Аднак вяртаючыся да папярэдняй цытаты, паэт пры гэтым просіць не забываць:

*Ці элін ты,*
*Ці іудзей,*
*Ці з горада,*
*Ці з вёскі,*
*Будзь чалавекам між людзей,*
*Жыві законам Боскім...*

І тым самым папярэджвае паспалітага чытача свайго, што «ў невядомы свет вядзе// бязлюдная дарога»...

Ёсць у кніжцы вершы пра прыроду (не толькі чыстая лірыка, а развагі пра прыроду чалавека, прыроду таленту і прыроду зладзейства), а таксама тонкія музычныя, эфірна-паэтычныя пасылы кахання і любові. Напрошваюцца на цытаванне наступныя радкі:

*Замаўкае вуліца,*
*Пыл спадае ніц.*
*Палахліва туліцца*
*Сон да аканіц.*
*Да паркана хіліцца*
*Ацяжэлы бэз.*
*На рыпучай мыліцы*
*Драч спяшае ў лес.*

(Пры чытанні ў памяці ўсплывае вядомая кожнаму беларусу тэлевізійная вячэрняя «Калыханка» на словы паэта. Яшчэ адна нацыянальная нятленка.)

Альбо гэткае прызнанне:

*Хто ж вінаваты,*
*Калі так рана*
*Зіма на лузе рыпіць палоззем*
*І пахмяляецца*
*Нечакана*
*Душа жывая*
*Каханнем познім?..*

Чысціня пачуццяў паэта не закаламучана разнародным часам, а — як рачная плынь — пастаянна папаўняецца свежай бруёй з крыштальна-прахалоднай крыніцы яго душы...

Пераважная большасць вершаў зборніка напісана ў класічна-стрыманым стылі, выверана, з праявамі эклектыкі і эмацыянальных узрушэнняў. Агульны тэматычна-ідэйны тон кнігі спавядальны, скіраваны на своеасаблівае падвядзенне вынікаў жыцця... Не парушаючы агульнай карціны, сюды ўпісваюцца і дзве паэмы: «Узнясенне» — пра пэўны перыяд жыцця Францішка Багушэвіча, духоўную спадчыну народа і яго мову, а таксама — «Развітанне» — падсумаванне плёну сумленнага творчага жыцця Якуба Коласа (яго ўчынак перад смерцю — ліст у ЦК КПБ у абарону роднай мовы). Самі творы, сціслыя па аб'ёме і грунтоўныя па змесце, даволі цікавыя і сваёй формай і ідэйнай загрузкай. Кідаецца ў вочы, што паэтам абраны менавіта апошні час жыцця творцаў, які падтэкстава праецыруецца і на цяперашні стан (і ўзрост) самога аўтара. Тыя стрэсавыя вычуванні, што перажылі напрыканцы сваіх жыццяў нашы геніі, якія у рэшце рэшт і падштурхнулі іх на высокія грамадзянскія ўчынкі дзеля нацыянальнай беларускай будучыні, уражваюць не эсхаталагічным разважаннем над іх выракам, а, груба кажучы, прагматычнай выснавай, што вынікае з мудрасці і вопыту чалавечай душы.

Вось радкі з заключнай страфы паэмы «Узнясенне»:

*Хмельнай радасцю горача сціснула горла —*
*І шчаслівая зорка ўзышла ў сіняве:*
*Беларусь адгукалася —*
*Значыць, не ўмёрла!*
*Беларусь не знямела,*
*І значыць — жыве!*

Паэт, калі ён творца, ніколі не бывае закладнікам вялікай палітыкі, ён становіцца яе ахвярай. Трагедыя палягае ў мастацтве жыцця, а не ў яго рукатворнасці... Вось і ў нашым выпадку, сваёй шматгадовай аднастайнасцю грамадскага ладу і неверагоднай вар'яцкай устойлівасцю рэжыма, нявер'е ў перамогу пачынае змагаць паэта, як гэта сталася ў вершах «***Зноў нас лёс бязлітасна дратуе...» і «***Сяброў з гадамі і ў мяне ўсё менее...». А вось, бадай, самыя роспачныя радкі:

*Стаміўся жыць.*
*Стаміўся ваяваць.*
*Стаміўся слухаць доўгія прамовы.*
*Чакаць.*
*І спадзявацца.*
*І трываць.*
*І ўсё — дарма.*
*І ўсё — безвынікова.*

Але паэт, да яго гонару, разумее, што яго лёс вызначаецца тут і што ён павінен яго ўспрымаць як дзенасць. Не хаваць сябе ад свету, а ўбіраць гэты жорсткі свет у сябе.

*Я ў невядомы край не адлятаю,*
*Але нуды пазбыцца не магу.*
*Мне наматае*
*Замець залатая*
*На сэрца палыновую тугу...*

(Хацеў бы тут пункцірна абазначыць «падгледжаную» мной адну метафарычную блізкасць і адначасную аддаленасць двух паэтаў — Г. Бураўкіна і М. Багдановіча. Чытаю ў «Лістах да запатрабавання»:

*Начамі выстылі барозны.*
*Лёг пад паветкаю нарог.*
*Як свечкі,*
*Тонкія бярозы*
*Стаяць паныла ля дарог.*

А вось падобная асацыяцыя з «Вянка»:

*Як мары, белыя бярозы*
*Пад сінявой начной стаяць.*
*У небе зоркі ад марозу*
*Пахаладзеўшыя дрыжаць.*

Ці не праўда, у песняра «чыстай красы» менш смутку, чым у сучаснага паэта (у аднаго «як мары, белыя бярозы», у другога —«як свечкі, тонкія бярозы»). Які разлёт пазітыву, перспектывы і аптымізму беларускага жыцця цягам ста гадоў!?)

Чытаючы творы Г. Бураўкіна, разважаючы з ім падчас выпадковых сустрэч, магу сказаць, што цэльнасць яго чалавечай асобы, як і творчай натуры, ніколі не выклікалі ў мяне сумневу. У яго зямным чалавечым выпадку Грамадзянін і Паэт сышліся вельмі дарэчна і гарманічна. Хочацца верыць, што з Божай ласкі. Таму і пажадаць паэту хацелася б (замест юбілейных тостаў) паболей такіх вось паднебных узлётаў, як у гэтым яго нерукатворным вершы, каб яму як найчасцей удавалася лавіць

*Удачу тую,*
*Што здаўна ў паэзіі жыве*
*І зусім нічога не каштуе,*
*І па небе воблачкам плыве...*

Паэт, вядома, — дзіця Прыроды. Таму не будзем кпіць і з гэтай яго шчырай просьбы:

*Ды хай паможа мне Ўсявышні,*
*Каб у юнацкай гамане*
*Быў голас мой*
*Зусім не лішні*
*І свой пасад*
*Быў у мяне...*

Няхай і гэта спраўдзіцца!

---

28 жніўня вядомаму беларускаму паэту, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы, грамадскаму дзеячу, сябру Рады Саюза беларускіх пісьменнікаў Генадзю БУРАЎКІНУ спаўняецца 75 гадоў.

«Новы час» з «Літаратурнай Беларуссю» шчыра жадаюць Генадзю Мікалаевічу здароўя, радасці, творчай нястомнасці і на доўгія дзесяцігоддзі «запатрабаваных» паэтычных лістоў — да Беларусі і яе вольнага народу!

ВЕРШЫ

# ТАЙНЫ ЗНАК

Генадзь БУРАЎКІН



* * *

*Яно яшчэ прыходзіць да мяне,*
*Кароткае, салодкае натхненне,*
*Як тайны знак,*
*Як маладое сненне,*
*Як зорка вечаровая ў вакне.*

*Схмялелую душу бярэ ў аблогу,*
*Шукае сцежку ў мройным тумане...*
*Яно яшчэ прыходзіць да мяне*
*І празарэнне дорыць,*
*Дзякуй Богу...*

* * *

*Я хацеў бы ўсё забыць.*
*Ды не ўдаецца.*
*Я хацеў бы ўсё вярнуць.*
*А не магу.*
*Надарвалася маё слабое сэрца*
*На вятрах,*
*На раздарожжах,*
*На бягу.*
*Што было,*
*Таго ўжо сёння не паправіш.*
*Што ўпусціў,*
*Таго не вернеш з небыцця.*
*Заклапочаны,*
*Стаю не пераправе,*
*Не чакаючы палёгкі ад жыцця.*
*Пад вярбой забыты човен дрэмле ў скрусе.*
*Б'еццa стомленая хваля аб вясло.*
*Я ж прасветлена*
*Дзіўлюся*
*І малюся*
*Усяму,*
*Што на зямлі са мной было...*

* * *

*Мы ўсе ў сваім жыцці філосафы,*
*Шукаем тайны сэнс ва ўсім.*
*Спрабуем*
*Невідушчым посахам*
*Намацаць шлях свой між асін,*
*Шыбуем да туманнай далечы,*
*На сонцам сцелены прасцяг,*
*Ніяк змірыцца не жадаючы,*
*Што ў гэтым свеце мы ў гасцях.*

*І ўсё лаўчымся,*
*Аж залішне, —*
*Ці грэх няўцямны,*
*Ці бяда, —*
*Прарочай воляй Усявышняга*
*Свае правіны апраўдаць…*

* * *

*Адвеку так было*
*І гэтак будзе,*
*Пакуль агмень нябесны не пагас:*
*Мінае час —*
*І з ім мінаюць людзі,*
*Мінаюць людзі —*
*І мінае час.*

*І мы аднойчы назаўсёды знікнем*
*За дымам,*
*За туманам,*
*За смугой.*
*І прыйдуць замест нас*
*Парадкам звыклым*
*Нашчадкі нашы*
*З праўдаю другой.*

*Ці знойдуць яны ў нашым тлумным часе*
*Хаця б зярнятка для сваіх палёў?*
*Няўжо ім здасца —*
*Толькі з іх пачаўся*
*І ўздым,*
*І разгарненне,*
*І палёт?*

*А будзе ж перашэптвацца калоссе,*
*Аблокі плыць над гнёздамі буслоў…*

*Так хочацца,*
*Каб нешта засталося*
*Ад нашых дзён,*
*Ад нашых спраў*
*І слоў…*

* * *

*Паэты на пенсію не выходзяць,*
*Пакуль іх алоўкі радкі выводзяць,*

*Пакуль ім душу разрывае сумненне,*
*Пакуль іх на бой выклікае сумленне,*

*Пакуль ім жанчыны каханыя сняцца,*
*Пакуль могуць вусны кілішка кранацца,*

*Пакуль яшчэ хочацца ў свеце суровым*
*Абнашчыцца вечным матуліным словам...*

*Паэтам не спіцца на панскім кіліме.*
*Яны не бываюць ніколі былымі.*

*Яны не старэюць,*
*Не паміраюць —*
*Яны,*
*Як высокія зоркі,*
*Згараюць...*

* * *

*Вецер страсае*
*Нясмела і ціха*
*Золата першай асенняй красы.*
*Верасень*
*Ніжа на павуцінне*
*Кропелькі ранішняй чыстай расы.*

*Гронкі цяжкія*
*Схілілі рабіны.*
*Клёны*
*Калышуць крамяную медзь...*
*Колькі мы ў садзе не дарабілі,*
*Можна яшчэ да змяркання паспець.*

*І калі неба*
*Ласкава і светла*
*Раптам абмые запылены плот —*
*Гэта паважнае бабіна лета*
*Плача пасля пережытых турбот...*

* * *

*Так хочацца пажыць без барацьбы,*
*Без балабонства,*
*Мітусні*
*І енку,*
*Не разбіваць разумныя ілбы*
*Аб тупасці і раўнадушша сценку,*
*Не слухаць больш нахабную хлусню,*
*Не бачыць верхаглядства і лайдацтва*
*І ў новы дзень,*
*Які з дзяцінства сню,*
*Хаця б краёчкам вока паўглядацца.*
*Ды дзе там —*
*Свет, здаецца, звар'яцеў,*
*Не можа ні змяніцца,*
*Ні спыніцца.*
*Як па падманнай д'яблавай вярсце*
*Ляціць сляпой улады калясніца.*
*І цягне ў бездань чорную*
*На дно*



*Панылых будняў несканчоны шэраг.*
*Ніякага прасвету не відно,*
*Усё навокал —*
*Шэра,*
*Шэра,*
*Шэра…*
*А недзе ж ёсць*
*І вольнай думкі ўзлёт,*
*І ўцешны смех,*
*І бляск вачэй ласкавы,*
*І паяднаны радасцю народ…*
*Так хочацца дажыць да гэткай явы!*
*Так хочацца…*

* * *

*Апантана цінькае сініца,*
*Абудзіць спрабуе сумны сад...*
*Хочацца хаця б на міг спыніцца,*
*Азірнуцца сцішана назад.*

*Прыгадаць пражытае цвяроза,*
*На свой лёс зямны не наракаць,*
*Слухаць,*
*Як парыпвае бяроза,*
*Як шуміць у чаратах рака.*

*Хай мінаюць за гадамі годы,*
*Праляятаюць хай за днямі дні.*
*У прыроды хопіць прахалоды.*
*У прыроды хопіць цеплыні.*

*Пры спатканні познім*
*Ці расстанні*
*Нас яна ад ветру захіне*
*Восенню —*
*Барвовымі лістамі,*
*Квеценню вішнёвай —*
*Па вясне.*

*І яшчэ дазволіць прычыніцца*
*Да пагоркаў,*
*Крушняў*
*І прысад...*

*Апантана цінькае сініца*
*І маўчыць зацята сумны сад...*

* * *

*Манатонна,*
*Нудна*
*І лянівa*
*Сеецца асенні золкі дождж.*
*Набрыняла прахалодай ніва.*
*Лісце ў лесе скача басанож.*

*Шэрай коўдраю*
*Накрылі хмары*
*Выцвілы, маўклівы далягляд.*
*Адзінокі бусел*
*На папары*
*Робіць*
*Перад выраем*
*Агляд...*

*У дрымотнай цішыні трывожнай*
*Скурчылася волкая зямля*
*І змірыцца ўсё яшчэ не можа,*
*Што ўжо ветрам дыхае зіма...*

* * *

*Снег пад нагамі хрупае,*
*Дол засцілае чорны.*
*Сыплюцца белыя крупы*
*У ветра вірлівыя жорны.*

*Мяккаю пытляванкай*
*Усё наваколле запудрана.*
*Нібы млынар,*
*Ля ганка*
*Дуб азіраецца мудра…*

* * *

*Там,*
*Дзе сонца ранняе*
*Над лугамі коціцца,*
*Дзе вярба пахілая*
*Ля ракі маркоціцца,*
*Дзе рамонкі белыя*
*Пад нагамі сцелюцца,*
*Дзе яліны стромкія*
*Проста ў неба цэляцца,*
*Дзе над студняй нізкаю*
*Жураўель*
*Укленчаны,*
*Дзе лясныя прыцемкі*
*Светлячкамі ўквечаны,*
*Дзе цвыркун за печкаю*
*Аж да рання цікае,*
*Дзе лагода вечная,*
*Як малітва ціхая —*
*Там*
*Пара дзіцячая*
*У закутку месціцца*
*Згубленаю цацкаю,*
*Водбліскамі месяца,*
*Крыўдаю дзяцінаю,*
*Казкаю забытаю...*
*Памяць*
*Павуцінаю*
*Там мой след абблытвае...*

* * *

*Ну што —*
*Адыйшло,*
*Адпалала,*
*Засыпана пылам дарог?*
*Каханне,*
*Што мне было мала,*
*Здаецца, я ўсё ж не збярог.*

*Былі і пакуты,*
*І святы,*
*І спрэчкі,*
*І шчасця званы.*
*Адзін толькі я вінаваты,*
*Што помніцца крыўды адны.*

*Але і,*
*Збалелы дазвання,*
*Сабе і табе не схлушу,*
*Што нават руіны кахання*
*Маю саграваюць душу.*

**«Літаратурная Беларусь» удзячная часопісу «Дзеяслоў» за дапамогу ў падрыхтоўцы гэтай публікацыі.**

САТЫРЫЧНАЕ АПАВЯДАННЕ

# ПТУШЫНЫ АЛІГАРХ

Кузьма ВЯСЁЛЫ




З самага ранку ў Трубня, кіраўніка раённай адміністрацыі N-ска, быў сапсаваны настрой: скончыўся месячны ліміт паліва для службовага «Лэнд Крузера», з-за чаго на работу давялося дабірацца грамадскім транспартам. У прыёмнай Трубня чакаў яшчэ адзін сюрпрыз: трое незапланаваных наведвальнікаў. Не павітаўшыся, ён кінуў сакратарцы: «Нікога не прымаю. Заняты». І знік за масіўнымі дзвярыма кабінета…

Аляксей Сцяпанавіч паглядзеў на гадзіннік і цяжка ўздыхнуў: рабочы дзень толькі пачынаўся, а кіраўнік ужо стаміўся. На гэтую пасаду яго перавялі месяц таму з аддзела валакіты, фармалізму і марнатраўства аблвыканкама. Трубень упэўнена ўзбіраўся па кар'ернай лесвіцы. Ён меў вопыт работы ў ідэалагічнай галіне, у тым ліку палітруком, а таксама начальнікам аддзела агітацыйнага клёкату, чым вельмі ганарыўся. Любіў мясцовых пісьменнікаў, перад якімі пастаянна ставіў новыя задачы ў творчасці.

Акрамя таго, Аляксей Сцяпанавіч карыстаўся папулярнасцю ў жанчын, не зважаючы на жанатасць. І гэта нядзіўна: высокі, з носам рымскага патрыцыя, маладзецкім чубам, армейскай выпраўкай, неўтаймоўнай энергіяй горца… Дзеўкі ажно млелі, калі такі зух браў іх у абарот і пачынаў круціць любошчы. У прыёмнай сядзела якраз тая, з якой ён правёў нямала прыемных хвілін у сваім аўто і кабінеце. Нездарма штоквартал Трубень спісваў на ўтыль рабочы стол: мэбля проста не вытрымлівала напружанай і самаахвярнай працы лавеласа…

Трубень паглядзеў на гадзіннік: мінула ўжо 9.00. «Чым бы заняцца?» — задумаўся чыноўнік, утаропіўшыся ў акно. За ім весела свяціла сонейка, спявалі птушкі, чуўся дзіцячы смех… «А ты сядзі тут цэлы дзень, як ёлупень! — уздыхнуў Трубень. — Жыццё праходзіць міма…» Вырашыў пагартаць стос свежай прэсы. У вочы кінуўся загаловак абласной газеты «Ягор Жолуд — кіраўнік новай фармацыі».

«От сволач, куды пралез! — вылаяўся Аляксей Сцяпанавіч. — Яшчэ нядаўна ў суседнім раёне школай камандаваў, а тут ужо ў аблвыканкаме апынуўся! Пралез, кныр віславухі…» З вялікага фотаздымка на Трубня пазіраў задаволены, з трайным падбародкам і маленькімі, як у тхара, вочкамі намеснік губернатара Жолуд, гальштук якога ляжаў строга гарызантальна на аб'ёмным жываце.

Праз хвіліну Трубень ужо набіраў яго тэлефонны нумар.

«Ягор Карпавіч, добры дзень! Пазналі? Ага. Той самы. Помніце? Прыемна. А як жа, канечне, чытаў. Таму і званю. Каб павіншаваць. Забойная рэч, Ягор Карпавіч! Капітальна напісана. Сапраўдны лідар! Дзяржаўнік!… Усяго найлепшага, Ягор Карпавіч!»

Чыноўнік зноў зірнуў на газетны фотаздымак Жолуда і ажно перасмыкнуўся. «А чым я горшы? — падумаў Трубень. — Піярыць дык піярыць». І ён пазваніў рэдактару гарадской газеты «Радасць Камунара» Анатолю Смажу.

«Анатоль Мікалаевіч, гэта Трубень турбуе. Вам трэба тыраж падняць? Канечне, магу. Трэба інтэрв'ю зрабіць. Як з кім? Са мной! На цэлую паласу. З фотаздымкамі. Згода? Чакаю карэспандэнта!»

Трубень выйшаў з-за стала і з нецярпеннем пачаў хадзіць па кабінеце, гучна напяваючы любімы матыў: «И вновь продолжается бой… Ту-ту-ту-ту. И сердцу тревожно в груди… Ту-ту-ту-ту. И Ленин такой молодой… Ту-ту-ту-ту. И юный Октябрь впереди… Та-та-тата!» Затым зноў сеў за тэлефон.

«Гэта ЖРЭУ? Трубень на провадзе. Я магу пагаварыць з начальнікам? А-а-а, гэта вы, Мікалай Пятровіч! Не пазнаў, кхе-кхе… Багатымі будзеце. Пастукаць па дрэве? Што — баіцёся? Камунальны алігарх… Ха-ха-ха… Справа ёсць. У мяне дарога перад пад'ездам разбітая. Зрабіць трэба. Тэрмінова. Службовую машыну паламаў з-за гэтага. А вы думалі? Праблема! Зробіце? Так і думаў. Наш чалавек! Сына ўладкаваць? Вашага? No problem! Няхай заўтра падыдзе…»

«Да вас журналіст», — паведаміла сакратарка.

«Запрашай».

«Добры дзень, Аляксей Сцяпанавіч! — павітаўся карэспандэнт і тут жа прадставіўся: — Загадчык макулатурна-наркалагічнага аддзела газеты Вячаслаў Бурбалкін».

«Чай, кава, бутэрброды?» — прапанаваў Трубень.

«Не адмоўлюся», — паціраючы казацкія вусікі, адказаў хітраваты журналіст.

Трубень паказаў абласную газету з Жолудам: «Трэба зрабіць не горш».

«О'кей, Аляксей Сцяпанавіч. Не такое пісаў. Апазіцыя мяне баіцца, як чорт Бен Ладэна. Паверце!»

«Уключайце свой дыктафон. Пагаворым пра народнае шчасце… Сёння ў многіх недасведчаных таварышаў, як, скажам, у тутэйшых апазіцыянераў-адмарозкаў, — пачаў Трубень, — сфарміраваўся памылковы стэрэатып чыноўніка. Маўляў, усе абібокі, дэмагогі і балбатуны. Гэта ўсё з-за інфантыльнасці светапогляду. Так, як працуе сёння чыноўнік, не працуе больш ніхто. Дзяржслужачыя гатовы жыццё аддаць за народнае шчасце. І днём, і ноччу толькі і думаюць аб простых людзях, аб тым, як дапамагчы канкрэтнаму чалавеку, не шкадуючы ні ўласных сіл, ні ўласнага часу. Усё — для народа», — ад узбуджанасці Трубень не мог усядзець за сталом.

«Вось некаторыя таварышы маюць нейкія прынцыпы. Змагаюцца за нешта, крычаць, бударажаць грамадства… Ад такіх людзей адна шкода. Яны ненадзейныя і маральна няўстойлівыя, ім давяраць нельга. Сучасныя рэаліі вымагаюць быць канфармістам…»

«А як жа сумленне, Аляксей Сцяпанавіч?» — не ўтрымаўся журналіст ад правакацыйнага пытання.

«Адно другому не перашкаджае, — лоўка парыраваў Трубень. — Вы не паверыце, але я — радыкал. Дзеля народнага шчасця я гатовы прадаць душу самому д'яблу. Тут усё не да сумлення. Гэта стратэгія прафесіі, мой лёс… На ідэалагічным фронце не да лірыкі. Я часта сустракаюся з народам, езджу па раёне, пастаянна знаходжуся ў гушчыні жыцця… Мой партрэт ужо трэці год вісіць на абласной дошцы гонару сярод славутых аграрыяў, палкаводцаў, вучоных і кіраўнікоў вышэйшага звяна, — не сунімаўся Трубень. — Па выніках мінулага года наша адміністрацыя лідзіруе па колькасці разгледжаных скаргаў у вобласці».

Дыктафон накручваў ужо пятую касету…

Трубень не стрымаўся і заплакаў… Не змог саўладаць з пачуццямі і журналіст, які ледзь задаў апошняе пытанне пра хобі.

«Я калекцыяніраваю чучалы дзятлаў, — прызнаўся чыноўнік, паказваючы на птушак, што сталі за шклом шафы. — Дзесяць штук сабраў. З розных кантынентаў. Вось перуанскі экзэмпляр, кубінскі, кітайскі… У мяне такі ж прабіўны нораў, як у гэтай карыснай птушкі… Ого-го!»

Пасля абеду Трубень выклікаў да сябе старшыню гарадскога літаб'яднання «Іржанне Пегаса» Уладзю Жарабцова, які грашыў вытворчымі паэмамі і надта любіў грошы. Яны разам удзельнічалі ў мастацкай самадзейнасці, ездзілі з паказальнымі прапагандысцкімі выступленнямі па вобласці і пужалі падчас канцэртаў дзяцей, але заўсёды займалі прызавыя месцы. Трубень трубіў, а паэт задорна іграў на баяне ды спяваў пад Кабзона. Творчы тандэм прыносіў абодвум фантастычную народную папулярнасць. І гэта нядзіўна. «Чым больш грукату, тым лепш», — любіў паўтараць вопытны ідэолаг.

«Вось што, дарагі мой пісацель, — пачаў размову Трубень. — Ці даўно ў вас выходзіла кніжка?»

«Даўнавата, — асцярожна прызнаўся Жарабцоў. — Напісаў нядаўна сацыяльна-эратычную паэму «Хобат»…»

«Дык чаго ж маўчыце? Па назве бачу, што сур'ёзная рэч. Сацыяльна значная літаратура нам патрэбна. Усё — для шчасця народа. Для павышэння яго інтэлектуальнага ўзроўню… Да сённяшняга часу помню ваш лірычны трылер «Гумавая баба». Гэта сапраўдная класіка. Буду хлапатаць перад старшынёй Саюза правільных пісьменнікаў аб прысуджэнні вам літаратурнай прэміі «Гарохавы Пукер». А пакуль выдадзім ваш трохтомнік з «Хобатам»… Ды кантракт на 5 гадоў прадоўжым…»

Пісьменнік не ведаў, куды падзецца ад раптоўнага шчасця.

«Вы зразумейце, Уладзь Мікалаевіч, што я на пісьменнікаў, летапісцаў часу, ніякіх дзяржаўных грошай не пашкадую. Тварыце! — і між іншым дадаў: — І помніце свайго мецэната…»

Жарабцоў сваю задачу зразумеў і, пакуль бос не перадумаў, хуценька знік за дзвярыма.

Трубень зноў паглядзеў на гадзіннік: да канца рабочага дня заставаліся дзве гадзіны. «Так-так-так, — задумаўся, — чым жа яшчэ карысным заняцца?» Каб патраціць час, пятнаццаць хвілінаў папераменна пасоўгаў шуфлядамі стала, паўгадзіны перакладваў дакументы з адной шафы ў другую і наадварот, сорак хвілінаў пагуляў у кішэнны більярд, пахадзіў па лыжах, зрабіў зарадку з гантэлямі і некалькі тэрміновых тэлефонных званкоў, пасля чаго вырашыў прайсціся па кабінетах супрацоўнікаў адміністрацыі, каб пракантраляваць іх адыход з працы і дзеля прафілактыкі камусьці даць прачуханца.

Пасля праверкі рабочай дысцыпліны Трубень, радасна пазіраючы на гадзіннік, накіраваўся ў свой кабінет. Але, адкрыўшы дзверы прыёмнай, спахмурнеў: яго чакаў Паддубнік, хадок са стажам, з торбай вершаў і стосам скаргаў на мясцовы тэатр, які не хацеў ставіць яго патрыятычную п'есу «Трэлі над Бугам».

«Ваша п'еса добрая, але мне не падабаецца брыдкаслоўе», — вынес прысуд Трубень, каб хутчэй пазбавіцца ад ветэрана.

«Дык там жа няма нічога падобнага…» — здзівіўся Паддубнік і паклаў пад язык валідол.

«Брыдкаслоўе будзе ў зале падчас прэм'еры», — адказаў чыноўнік анекдотам і ледзь не вылаяўся: у прыёмную заходзілі дзве кабеты… Такога народнага нахабства Трубень не чакаў і закрычаў шафёру: «Машыну мне! Машыну!»

Праз тыдзень выйшаў спецыяльны каляровы нумар газеты «Радасць Камунара», цалкам прысвечаны працоўнаму подзвігу таварыша Трубня. На першай паласе ішоў грунтоўны нарыс пра яго пад загалоўкам «Змагар за народнае шчасце». Матэрыял суправаджаўся безліччу фотаздымкаў і заканчваўся вытворчай паэмай Жарабцова пра веліч Трубня.

Па загаду аддзела адукацыі ўрыўкі з паэмы пачалі вывучаць у школах вобласці на ўроках роднай літаратуры. У бібліятэках наладжваліся шматлікія сустрэчы-прэзентацыі з чытачамі. Падчас іх Трубень няспынна трубіў і трубіў без шкадавання ўласнага здароўя, з-за чаго ў рэшце рэшт пасадзіў голас — і страціў прафпрыгоднасць. Гэта быў канец кар'еры! Яшчэ некаторы час Трубню ўдавалася трубіць пад «фанеру», але хутка гледачы раскусілі фокус і абсвісталі яго прама ў зале.

Нечакана Трубню прыйшла арыгінальная ідэя: а што калі замест прамоў ездзіць на сустрэчы са сваёй калекцыяй дзятлаў і выступаць з мастацкім свістам? Не ўмее пакуль свістаць? Ніякіх праблем! Гэтаму можна навучыцца ў Цэнтры мастацкай творчасці, а потым махнуць у Галівуд. І ён актыўна ўзяўся за ажыццяўленне гэтай ідэі. Аднак губернатар Канстанцін Бубен, хоць і сам нядаўна запісаў дыск з уласнымі песнямі, быў незадаволены тэатральнымі выбрыкамі Трубня, які псаваў сваімі экстравагантнымі паводзінамі імідж шаноўнай «вертыкалі», аддаючы галасы электарата праклятай апазіцыі. На пазачарговым пасяджэнні аблвыканкама дзейнасць Трубня прызналі правальнай і шкоднай, а потым чыноўніка знялі з пасады. Тым больш што да яго пачалі ўжо прыглядвацца таварышы з Камітэта дзяржкантролю за народным шчасцем. А тыя маглі накапаць не толькі падстаўныя тэндары на клюшкі і шайбы ды бескантрольны выраб партрэтаў Кіраўніка без афіцыйнага дазволу…

Неўзабаве на абачліва выкрадзеныя з раённага бюджэту грошы Трубень арганізаваў на базе перадавога аграгарадка СВК «Дзятлава», якое спецыялізавалася на племянным разводзе карысных птушак у тутэйшым дубняку — для ўмацавання народна-гаспадарчага комплексу краіны. Наваспечаны бізнесмен быў шчыра ўпэўнены, што дзякуючы яго намаганням удвая павялічыцца ўнутраны валавы прадукт роднай дзяржавы, перадавы вопыт разыдзецца далёка за акіян (ажно да тэхаскіх фермераў), а прозвішча Трубня, заўзятага птушынага энтузіяста, будзе рэабілітавана і ўнесена на рэспубліканскую дошку гонару. Гэтаму спрыяў добра наладжаны маркетынг і рэкламная PR-кампанія. СВК «Дзятлава» вырабляла імянныя чучалы-сувеніры, якія ішлі нарасхват не толькі для перадавікоў вытворчасці, але і для афармлення кабінетаў асабліва адказных чыноўнікаў, што вызначыліся ў нястомнай барацьбе з бюракратызмам. Была наладжана нават кантрабанда дэфіцытнага тавару ў Афрыку і Лацінскую Амерыку. Вытворчасць набірала абароты.

Перад дэпутацкімі выбарамі Трубень заснаваў грамадскі рух «Улада — дзятлам!» і актыўна ўключыўся ў перадвыбарчую кампанію як знакавая фігура непрадказальнай сучаснасці. Няма сумненняў — хутка ён зноў апынецца ў звыклай абойме. Такое жыццё…

ВЕРШЫ

# ШТРЫХІ

Віктар СЛІНКА

***

*Усім, хто з аркестрам памёр*
*І быў з цішынёй пахаваны,*
*Усім, хто без вестак жывы*
*І з'ядае без хлеба свой дзень, —*
*Я сын груганоўы,*
*Я ведаю словa*
*І тую траву, што кладзецца на раны, —*
*Траву*
*на паляне ў крывавым тумане,*
*Дзе пасвіцца вольны з прабітаю шыяй алень.*

*Бо шкода заўсёды, калі*
*наша праўда мяжуе са змрокам.*
*І праўду сказаць пра бацькоў —*
*гэта здрадзіць, прадаць.*
*Бывае, што й крот пад зямлёю ўзлятае,*
*лунае высока,*
*Як аб'есца грыбоў... А плуг пачынае араць.*

*Той, хто чыстыя рукі адзнакай лічыў,*
*атачэнню*
*Казаў,*
*Хоць маўчаў:*
*Ёсць такія мясціны, куды для праблем*
*вырашэння*
*Лепей заўсёды прыходзіць без запрашэння.*
*Бо запросяць калі —*
*Не будзе цябе на зямлі.*
*І сатруцца ў анёлаў на цвёрдым гароху*
*калені.*
*Каб сагрэцца ў ільдах, спаляць свае*
*караблі каралі.*

Люты 2011

## 1989 год

*Вымкнуты штэпсель, але індыкатар*
*не гасне адразу.*
*Ён цьмянее, просячы прабачэння*
*за сваё паміранне.*
*Зноўку і зноў загараецца, падуладны*
*майму хаценню.*

*Ці быў я — скажы — для цябе хацяа б*
*індыкатарам?*
*Знакам, што праміноць немагчыма —*
*і не адчуць?*
*Пасля спаткання ля «Несцеркі» —*
*сціплая менская крама —*
*Мы з табой — а табе падабаўся звычайна*
*Сам працэс перастаўлення ног —*
*Крочылі, выйсце сачылі за межамі*
*шахматнай дошкі.*
*Ісціна побач была — пачвара, цмок у пячоры.*
*А мы дапівалі вясёлкавую гарбату,*
*Прымружвалі вочы ад промня,*
*абагаўлялі снег.*
*Мы толькі паспелі з табой*
*перакінуцца словам,*
*Як адлучылі кантакты. Нас трэба*
*пакласці ў лёд,*
*Каб мы захаваліся лепей? У вадкі азот*
*— надзейней?*
*Усю нашу кроў — у ёмістасцях*
*спецыяльных*
*Зберагчы на наступны — ці будзе ён*
*лепшы — дзень?*

*Вымкнуты штэпсель, але індыкатар*
*не гасне адразу.*
*Ён цьмянее, просячы прабачэння*
*за сваё паміранне.*
*Зноўку і зноў загараецца, падуладны*
*хаценню (ценяў).*
*Мабыць, нас дачакаецца зможа надзея.*

*Та́к вось яно: хто сам сабе*
*не саступіў дарогу,*
*Яму*
*Інкруставаны кій — найлепшая*
*ўзнагарода.*

10.03.11

***

*Кароткае птушынае сола паўтараецца*
*праз няроўныя адрэзкі часу*
*накладаючыся на гучанне*
*гадзінніка — тое нагадвае шчоўканне*
*цацачнага*
*затвора мініяцюрнага але вельмі*
*падобнага да сапраўднага карабіна.*
*Досыць блукаць у пошуках*
*заплеснявелае спаяворы — трапічнай*
*расліны што ўзыходзіць раз на пяць гадоў*
*у зімбабвійскіх андах палінезійскіх*
*кардыльерах*
*у кратэры п(р)атухлага вулкана*
*ў грэнландскіх*
*балотах між рэйкамі беларускай чыгункі.*
*Марыць аб нечым — досыць?*
*Вось яно што наяве —*
*бяры? Мы схаваныя глыбей закапаныя*
*шышачкай у спаленым вавіланянамі*
*браслаўскім бары. Мы вывятрыліся*
*ачысціліся адсарбаваліся праспявалі*
*сваю песню трымаючы ў зубах цвік*
*забіваючы перадапошні ў сцяну.*

17.06.11

***

*Ёсць*
*творы, што ўражваюць нават у перакaзе*
*бяздарных апавядальнікаў;*
*нешта, чаго нельга спаскудзіць,*
*ад чаго немагчыма*
*нічога адняць; толькі — дадаць сваё,*
*калі нешта займееш, вырасціш,*
*чым (на што)*
*пабагацела душа.*
*Месца,*
*адкуль ступаеш наперад, апору — маеш;*
*але ці бывае ўдзячнасць падэшваў?*
*І — шчырэй і вышэй: чалавечая ўвага,*
*магчымасць*
*слову — пачуцца й вярнуцца іншым.*
*Барозны — на целе зямлі, у якія надзейна*
*— легчы*
*і прарасці, як маеш — каму і куды.*
*А маеш — заўжды.*
*І толькі ў хвіліны, якія хочуць сабою*
*ўсё засціць,*
*зацьміць, здаецца, што гэта не так.*

2010

## Штрыхі

*I*
*Куды гарбатыя лятуць буслы*
*І кліч палёў якіх ім песціць слых?*
*Быць можа, тых, дзе праўды кожны міг*
*Адкрыты ўсім — і вольны ад усіх?*

*II*
*Гісторыя*
*імя*
*не захавала,*
*Хто не даплыў*
*хоць крышку*
*да прычала.*
*А пэўна ж так, што менавіта ён*
*Быў першым, хто прайшоў ля мыса Горн.*

*III*
*Бо незалежна:*
*— Горы й пагоркі адно для таго,*
*каб на іх узыходзіць, бачыць навокал*
*далей, —*
*так мне казаў праваднік-бедуін.*

*IV*
*Я сам сабе ёсць*
*бацька і айчым.*
*Айчына*
*застаецца ні пры чым.*
*Я сам*
*і паліцай, і партызан.*
*Пасуе часам, нібы фрак, рызман.*

*V*
*Не мёд і не яд і не кроў, —*
*іншае рэчыва трэба тут*
*вынайсці, каб пазбыцца пакут,*
*рукі*
*ад ланцуговых прыбраць дароў*
*ды выправіць перакрут.*

*VI*
*Ён размаўляў над падлай і арламі*
*З няўцямнымі, нішчымнымі дарамі,*
*Душа якіх забрала нашу з вамі.*
*Высокі ён — ці мы адпалі самі?*
*Вартуюцца магілы груганамі.*
*Вада ў дупле, налітая дажджамі,*
*Крыніцы даражэй, што перад намі.*

*VII*
*Абняцца*
*прад мяжою цела*
*з ценем*
*І збіць калодкі*
*са здранцвелых*
*ног,*
*Альбо — чакаць,*
*каб падабрэў*
*бульдог?*
*Інакшае,*
*па шчырасці,*
*карцела.*

*VIII*
*Хто зацверджаны ў спісе, каго павядуць*
*на расстрэл,*
*Ці — ля дошкі стаяць ім, ламаючы крэйду?*
*Прыцэл*
*Выпускнік намалюе, што ў марах*
*даўно афіцэр.*
*І заўсёды існуе*
*адзін запасны варыянт —*
*Абярнуўшыся цацкай, упасці ў куце*
*за сервант.*

*IX*
*Кляйміла сонца неба — знак сышоў.*
*З уласных выбавіцца здолей сноў.*

*X*
*За некалькі глыткоў з каменнай чашы*
*Ты вып'еш, так, што кроплямі ўвесь год*
*Збіралася. Няўжо наадварот*
*Нам суджана й таемных думак нашых*
*Празрысты россып, вымкнуты з турбот,*
*Засмяглыя не змочыць вусны Часу?*

*XI*
*Намазаныя тлушчам спускі-сходы*
*Пад крык людзей — да мора шлях, Арго.*
*Ні прыгажуня, ні руно — ні да каго*
*Не прывядуць. І помстаю свабода,*
*Хто знаў яе, і блытаў поры года,*
*Прадказваў лёс — і сам не меў яго.*

*XII*
*Зноў паклікалі мёртвых глядзець*
*на жывых-на-нажы;*
*Прыцягнуліся ўсе, хто збярог свой*
*астатні абол.*
*Бачыш — поўная зала... І толькі*
*на самай мяжы,*
*Дзе прастора сустрэнецца з тэкстам,*
*накрыецца стол.*

*XIII*
*Прыкметай таленту — нязмушанасць*
*гаворкі*
*Лічыць так зручна, дружа. Паглядзі:*
*Пацыху алебастравыя створкі*
*Нас аддзяляюць ад вады й зямлі,*
*І мы выбельваем пад колер гэтых створак*
*Сваёй любові свет: я, ты... Для некаторых*
*Не існаваць і быць — звяно паўтораў.*



## Дзякуй табе, клапатлівы

*Даўжынёю ляза,*
*Прыкладзенага да кулака,*
*Адлегласць да сэрца*
*Мераецца твайго.*
*Ні на мікрон убок*
*Шлях карабля не зрушыць*
*Кінутая на стырно*
*Цела твайго вага.*
*Ледзяная гара — плыве.*
*Набліжаемся — без дароў,*
*Калі не лічыць жыцця.*
*Дык па якой прычыне*
*Пастаўлены стырнавым,*
*Хто ім зусім не ёсць?*
*Інкогніта — бачыш — ён*
*З шыльдачкай «Не турбаваць»*
*Наш беражэ спакой,*
*Мяркуе, напэўна, так:*
*«Здаровыя нервы — і сон*
*Спатрэбяцца ім яшчэ*
*Дрымотнасцю прастадушных*
*Як тут — і на свеце тым».*

31.05.11

***

*Я выйду на святло.*
*Прамень*
*Праб'е наскрозь.*
*І ўсё, што ад мяне самога*
*прыхавана*
*На чорны, ці, магчыма, белы дзень,*
*Аб'явіцца,*
*Таемным перастане быць.*
*Прыўкрасныя — і велічныя вежы*
*Ў імхах балот, на дне вазёр*
*Ў абліччы сціплым.*
*Ты, нямко-дзяўчына,*
*Мыш у нары, змяя ў лагчыне, вожык, —*
*Вы — спадкаемцы мне.*
*Майго.*
*Лістоты адрасаты.*

1–2.02.10

## Парада Нерону

***(Дыягностыка і тэрапія)***

*Цкаванне звярамі гладыятараў,*
*забойствы*
*гладыятарамі звяроў, а таксама*
*гладыятарамі*
*гладыятараў лепей было б праводзіць*
*у Калізеі*
*пустым, а гледачоў (тут ужо —*
*слухачоў) сабраць*
*за яго сценамі: каб месца для рэха —*
*болей*
*і па крыках тых, што сцякалі крывёй,*
*рабілася цалкам магчымым атрымаць*
*уяўленне,*
*што адбывалася там.*

*А таго, хто апіша дакладна, што там*
*было, абраць народным паэтам.*

*І толькі яму прывілея — славіць цябе.*

10.05.11

ФРАГМЕНТЫ АПОВЕСЦІ

# МЕЙЛАХ У КАСТРЫЧНІКУ

Сяргей ПЯТРОЎ

Гэтыя падзеі адбываліся ў другой палове дваццатага стагоддзя. У памяці многіх усплывае няпросты, багаты разнастайнымі падзеямі час. У аповесці ідзе апісанне жыцця простых людзей, што верылі і не верылі ў тую светлую будучыню камунізма, якой вадзілі перад носам мільёнаў савецкіх людзей... Мне было добра ў іхнім коле.

…Я спрабаваў перадаць мілыя сэрцу гукі старога горада словамі тых, хто ўжо сыйшоў у свет іншы ці беззваротна з'ехаў.

**Аўтар**



## На конскім

Любімым нашым месцам быў невялікі ўтульны лужок ля рэкі на «конскім». Як растлумачылі нам старажылы, так звалася ціхая затока поруч з напаўразваленым пешаходным мастом, які зносіла кожную вясну падчас крыгаходу. У ранейшыя часы, калі ў горадзе стаялі кавалерыйскія часткі «Іванаўскага коннага палка», і ў наступныя, калі размяшчаліся часці чырвонай кавалерыі, на гэтым водным прасторы купалі коней.

Месца было чыстае, пясчанае, і спадзісты спуск быў зручны для ўсіх, у тым ліку для адпачынку людзей. Недалёка — зараснікі чароту, якія даходзілі да вялікага загадкавага дома, што стаіўся ў зеляніне і адгарадзіўся ад вонкавага свету дыхтоўным глухім дашчаным плотам. Гэта быў дом мясцовага вайсковага начальства, а ў даваенныя часы там пражываў сам маршал Жукаў.

Нам было цікава, што ж утойвалася за плотам. Там была цішыня, і праз шчыльна збітыя дошкі акрамя зеляніны кустоў нічога не праглядалася. Калі мы спрабавалі ўзлезці на плот, то выходзіў пільны салдат і адганяў нас на прыстойную адлегласць. Пры паўторных спробах — таму, хто трапляўся ў рукі аховы, да крыві аддзіралі вушы. Гэта нас не спыняла. Нас зноў лавілі — і інфармацыя даходзіла да бацькоў. Зноў каралі, але цікаўнасці мы не пазбаўляліся…

У гэты дзень мы былі занепакоеныя тым, што наш аднакласнік Валера Шавякоў быў вельмі засмучаны вялікай згубай. Пакуль мы шнырылі вакол загадкавай генеральскай сядзібы, у Валеры нехта скраў тапкі. Валера меў рост больш двух метраў, але да гэтага росту дадавалася адна непрыемная асаблівасць: у яго былі ступні ног сорак сёмага памеру. Такога абутку немагчыма было дастаць у продажы, а на замову тое не браўся ніхто выканаць: у прыродзе не існавала такіх калодак. І вось з Маскоўскага цырка па вялікім блаце яму дасталі мабыць бутафорскія ні то туфлі, ні то тапкі. На нагах яны выглядалі як лыжы. Валера быў шчаслівы такім набыцём. Нарэшце ўлетку ён мог выйсці ў горад у абутку. З ваеннага гарадка, дзе ён пражываў з бацькамі, да горада ён даходзіў басанож — бярог унікальныя туфлі, а на рацэ, забаўляючыся ў нашай кампаніі — хаваў у кустах ад сонца і выпадковых пашкоджанняў.

На гэты раз, калі Валера адцягнуўся на вывучэнне наваколляў генеральскага дома, у яго зніклі любімыя і адзіныя туфлі. Ён абмацаў усе прыбярэжныя кусты, але згуба не знайшлася. Яго абурэнню не было мяжы.

— Ну добра, я магу зразумець, што выкралі б патрэбную рэч, але не магу ўявіць, для якой набрыдзі спатрэбіліся туфлі, якія акрамя мяне ніхто не зможа насіць! — казаў ён.

Мы таксама абураліся, але нашыя абурэнні не выходзілі далей вясёлага хіхікання. Рэч у тым, што набрыдзь, якая выкрала яго «тапкі», — я і Лёнька. Мы прыдумалі маленькую помсту за нашыя вушы… Ні слова не кажучы аб дэталях задуманага, мы павадзілі Валеру вакол глухога плота па месцах, дзе застаюцца выразныя сляды нябачаных памераў. На наступны дзень у зоне нашых дзеянняў гойсалі ваенныя следапыты і вывучалі адбіткі. Мы абралі момант і пакінулі свежыя, устаючы двума нагамі на Валераў тапак, напераменку то на левы, то на правы. Сляды правялі да прылеглай да плота пабудовы з металічным свежапафарбаваным дахам. Мы і там наставілі слядоў, падфарбоўваючы падноскі водным растворам сажавай фарбы для выразнасці. Нацешыўшыся гэтай забавай — адвялі сляды прэч ад пабудовы, уздоўж плота — і спынілі іх каля вялікай, свежай каровінай аладкі. Расставілі сляды так, што аладка апынулася паміж гэтымі «лапамі». Каб усё выглядала натуральна, прыпудрылі гарчыцай элегантнае ўзвышша, падобнае на торт. Дадатковая загадка для ваенных следапытаў была гатовая. Мы вярнулі абутак на месца і падказалі Валеру, каб згубленае шукаў больш уважліва.

Жарт атрымаўся. Валера быў шчаслівы сустрэчы з абуткам, мы — здаволеныя помстай. Распавялі хлопцам і разам назіралі, як вайскоўцы вывучалі нашыя майстэрствы. Каравульны не дапушчаў затоптвання доказаў, асабіста ахоўваючы сляды нашай дзейнасці. Затым выйшаў палкоўнік Меланіч, начальнік палітаддзела дывізіі. Ён доўга і ўважліва разглядаў прыкметы прысутнасці загадкавага зламысніка, размахваў рукамі, нешта энергічна казаў і неаднаразова вяртаўся да сувеніра гарчычнага колеру.

Затым, пасля адпаведных распараджэнняў палкоўніка, салдаты абгарадзілі прылеглую да плота тэрыторыю калючым дротам і выставілі вонкавы пост.

## Мішава мама

Мішава мама — худзенькая, маленькая жанчына з журботнымі вачыма, чэпкай памяццю і нястомным языком — была чалавекам з арыгінальным складам мыслення. Адукацыяй яна не распешчаная, але разам з дрымучай неадукаванасцю ўлоўлівала ў гутарцы інтэлігентныя фразы, запамінала іх і ахвотна ўстаўляла ў сваю мову, надаючы ім непаўторны каларыт. Выходзіць часам вельмі мудра, але галоўнае — смешна. Кожны выраз, які вылятаў з яе маўленчага апарата, запамінаўся суразмоўцамі для наступнага выкарыстання.

Цётка Рая, або Рахіль Мендзялееўна, вельмі любіла свайго адзінага сына, але часам яе клопат быў настолькі цяжкім, што нават дабрадушны Міша выяўляў раздражненне. Ён заўсёды быў пад сталым маміным наглядам, і яна даставала сваёй назойлівай увагай не толькі сына, але і ўсіх, хто яго атачаў. Жылі яны за некалькі дзясяткаў метраў ад ракі — нашага любімага месца. Рахіль Мендзялееўна, або папросту — цётка Рая, прыходзіла паглядзець, чым гэта мы займаемся. Каб хоць неяк адгарадзіцца ад яе, мы пераплывалі на іншы бераг ракі і толькі там сябе адчувалі камфортна. Мы спявалі песні, чыталі, загаралі і гарэзавалі, як маглі.

— Міша! — раптам пачынала крычаць з другога берага цётка Рая. — Міша! Ідзі к міне, я хачу штo-та цібе гаварыць!

Міша займаўся сваёй справай, не звяртаючы ўвагі на матчын кліч.

— Міша! Ідзі бістрэ! Я маю сказаць цібе што-та важнае!

Міша неахвотна, як галодны вол, ідучы з пашы ў стойла, падыходзіў да берага — і пачыналася гутарка праз рэчышча:

— Як ты ўжо мне надакучыла! Ну, што ты хацела, што?

— Ідзі Міша к міне, я ўсё скажу!

— Скажы, я і так пачую!

— Не! Я хачу, каб к міне мой сын прыхадзіў сам.

— Як я прыйду, тут жа ж рэчка!

— Так плыві ўжо, што цібе — параход нужін ці што?

— Дык вада халодная!

— Ага, як туды, дык вада ні халодная, а як да мамы, дык ужо і ваду прастудзіў?

— Мама! Я не палезу ў халодную ваду. Пайду ўкруга, праз мост, гэта ўсяго два кіламетры, але табе прыйдзецца доўга чакаць!

— Нічога, пачакаю. Я на цягнік не спазняюся!

Мішу не хацелася так далёка ісці, і ён уплаў дабіраецца да мамы.

— Ну, і што ты мела такое важнае сказаць?

— Ведаеш, Міша, схадзі вірві міне луку. Адну цапачку. І ўсё.

— Мама, ты ў сваім розуме? Цыбуля расце дома, пад акном. Ты ж сама магла яе вырваць, а ішла за мной, не заленавалася. Табе што, рабіць больш няма чаго?

— Я канешне ж магла б вірваць, але перадумала. Навошта міне гэтыя клопаты. Я хачу, каб гэта зрабіў ты, мой сын. Міне будзе прыемна, што ты такі клапатлівы пра маму. Вірві, Міша, я скажу цібе дзякуй і ішчэ дадам пару інцірэсных разумных слоў для парадку. Ну давай, Міша, рухай ножкамі. Я тут пакараулю тваю рэчку, што б яна хаця б нікуды ні дзелася!

Міша з незадаволеным выглядам пайшоў па цыбулю. Нарваўшы некалькі вехацяў, ведаючы, што ўсё роўна мама пашле яго за дадаткам, прынёс іх маме.

— Ой, Міша! Хай бы ты ішчэ вірвал кропу, а то цібе зноў прійдзецца вярнуць сібя дамой. Ты ж ведаеш, што лук без кропу такі ж у супе самотны, як ты без Лёні Сакалова. Схадзі, сінок. Я ішчэ пакараулю тваю рэчку.

Нарэшце Міша вызваліўся ад мамчыных даручэнняў і вярнуўся да нас. Праз паўгадзіны зноў голас цёткі Раі:

— Міша! Ідзі скорінька да міне, я хачу ў цібя тое-сёе разведаць!

Міша «даў у хамут» і стаў люта гыркаць.

— На каго ты фіркаеш? На мама, каторая цібе — есці, піць! І цібе ні сорамна супраць мамы? Плыві бістрінько к міне і перастань казаць для мамы такія паносные слава. Ты ведаеш, як я цібя ражала? Ні ведаеш. Дык вось я цібе скажу, што гэта ні такое вісёлае заняціе. Улюбляцца — смяяцца, нараджаць — плакаць! Як я тагда плакала! Больш, чым смяялася! Не крыўдзі маму, ідзі к міне. Ты мой сын і павінен ціпрэць, якая я харошая.

Міша насуперак свайму жаданню змушаны быў наблізіцца да мамы, каб пачуць наступнае:

— Ты памятаеш нашу цёцю Броху? Як гэта ні памятаеш? Успамінай! Яна жыла з намі, пакуль Мейлах не стаў ёй тое-сёе заігрываць, і міне прыйшлося паказаць ёй на шырокія адчыненыя дзверы. Як гэта ты ні хаціш чуць пра сваю любімую цёцю? Гэта ж яна цібя маленькага выхоўвала. Праўда, пакуль з цібя нічога добрага не атрымалася. А яна ўсё казала: «Геніяльнае дзіця, геніяльны рібёнак». Гэта калі ты малачко з буцілачкі віпіў, а соску надзеў… на што ты думаеш? Так яна першая заўважыла. Радавалася за цібя! Калі б яна ведала, што ты ні хаціш пра ніё чуць, то засмуцілася б да страты свядомасці. А я ёй казала:

— Броха! Ну што ты рібёнка так піхвальваеш? Яму ўжо тры гады стукнула, а ён нават на скрыпачке іграць не спрабаваў! І што з ніго далей будзе? А то і выйшла, што ты, Міша, нават на паціфоне ні навучыўся. Хай бы ты прыкончыў якую-нібудзь музычную школу, хоць бы па класе сабачага вальса, ці што. Націскаючы чорныя і белыя клавішы, радаваўся б жыццю, раз ні хаціш, як Додзік Ойстрах віпілівацьна скрыпачке рапсодзії ўсякія. Успомніш мамчыны разумныя парады, ды позна — цягнік утутукаў! Дык вось, Міша, цёця Броха даслала ліст. Усё пытае і пытае. Так трэба ж ёй адпісаць, а я забылася, як пішац-

ца літара «Ж». Вось цібе бумашка, вось карандашка. Намалюй, як яно будзе — і ўсё.

Міша моўчкі выводзіць літару. Цётка Рая ўважліва разглядае паперку і пытае:

— А ты сапраўды ведаеш, што яна так пішацца? Гэта цібе ў школе паказвалі або ты сам прыдумаў? Я некалі бачыла букіўку, пахожую, на туалеце. Можа, яна і ёсць такая? Ты ні падманвай міне, а то будзе няёмка перад цёцяй Брохай…

## Якім ён быў

Рахіль Мендзялееўна кіпяцілася:

— А прыкідваўся такім харошым… размаўляў красіва. Вядома, добра падвешаным языком можна разгайдаць любую жанчыну. Такі разгайдаў! Як ты віртуозна хлусіў: «Я парцізан, я снайпер, быў такі адчайны, што варашылаўскі стралок — блізка са мной не стаяў». Так ты міне казаў? Так! І што ты міне далей нагнятаў? «Я цібе ўсю праўду распавяду, які я быў герой!» А што я цібе адказала: «Ні нада міне ніякай праўды, я хачу знаць, як было на самай справе». Добрыя людзі заўсёды ведаюць чужыя справы лепш, чым свае. Вось, што яны распавялі пра твае партызанскія прыгоды:

Неяк на вайне ты віпіў баявыя сто грамаў, што б было ні страшна. Потым дадаў для добрага боя, потым яшчэ… і заспаў пад кустом. А цібе п'янаму камары вочы павікусывалі. Калі абвясцілі трывогу, то які з цібя снайпер? І сляпы, і п'яны, а штаны не відзяржалі гэтай нагрузкі — умакрэлі і саржавелі. Ты ў такім маркотным стане пельнуў са стрэльбы куды папала, і што атрымалася? Атрымалася, што ты прыклад стрэльбы забыўся паставіць на плячо, а паставіў насупраць п'янай рожы. Калі ты націснуў на той гаплік, які страляе са стрэльбы, то цібе патрапіла якраз прыкладам па зубах! Цібе добра тады пачысціла рот, што ты дагэтуль эканоміш на шчотках і зубным парашку. Акрамя таго, што ты павішібаў сібе зубы, ты ж Брытанскі самалёт збіў з курсу!

— А ведаеш, хто такі курс загадаў? — працягвала цётка Рая: — Гэта ж сам Чэрціль! Ён паслаў да партызанаў самага хітрага разведчыка давецадца страшны сакрэт, але так, каб немцы не здагадаліся, як гэта беларускія цёткі пякуць бульбяныя дранікі і відзеліваюць пальцам пхану каўбасу пад назвай «КІНДЗЮК». Ён ужо стаміўся ад дакучлівых яму каньякоў і аўсянкі. Як напісала ў той час амерыканская газета «Вашынгтон поц», ангельцы зразумелі, што без беларускіх смакаў ім з немцамі вайну нават і працягваць няма чаго. Сіл не будзе! Толькі гэтыя «сем раз не рускія» замежнікі ніколі не разумеюць галоўнага: каму ж захочацца ваяваць пасля таго, калі ўпрэш у сябе добры кавалак пальцам пханай каўбасы? Пасля такой ежы да самога Чэрціля прыйдзе жаданне забурыцца куды-небудзь у цень куста, дзе любоў простая з маладой леддзю.... Яны гэтага не разумеюць, так, як мы гэта панімаем. Таму Чэрціль свайму самаму спрытнаму разведчыку, таксама ангельцу, сказаў:

— Ізя! Там, калі схаваеш парашут, да Старых Дарог забяжы, гэта не далёка, і запішы рэцэпт самагонкі сусветна вядомай маркі «Беларуская смачная», настоянай для крэпасці на курыным памёце, што б па мазгах біла. Толькі глядзі — бойся чалавека са стрэльбай, асабліва, калі ён выпімшы. Выпімшы можа такі нумар адшчапіць, што ніякія разведкі іх планы не разгадаюць. Але ты паспрабуй! Калі ўсё выканаеш, то такіх ордэнаў я цібе навешаю, што многія будуць дзівіцца, — сказаў Чэрціль і даў Ізе на бутэльку.

Ізя, вядома, як належыць, стаіць смірна, рукі ў кішэнях, дзе хавае скручаныя дулі. Але ад «на выпіць» не адмовіўся. «Слухаюсь», — сказаў Ізя і пабег выконваць загад… Мейлах, толька я ніяк ні пайму, адкуль Чэрціль узнаў, што чалавек са стрэльбай — гэта ты? Ты міне хоць січас праўду раскажы, а то я змарнуюся ў здагадках. А-а-а! Я здагадалася! Гэта цібе разведчык Ізя, мабыць, сказаў па сакрэце… Вот якога ты чалавека на самалёце збіў! Але, што б НКУС ні турбаваць, свае хлопцы сказалі, што самалёт спалохаўся і сам зваліўся, а Ізя вікруціўся, як вядомы цібе Шмуль Іцкавіч. Ён ні пайшоў назад на ангельскі бок у іхні Лондан мантачыць нашы сакрэты. Узнаўшы гэта пра Ізю, Чэрціль падавіўся цыгарай да самай дванаццаціперснай кішкі ад лютай ангельскай злосці і загадаў вылавіць Ізю і даставіць да яго.

Не злавілі. Ён і ціпер жывы і здаровы. Жыве ў Бабруйску, каля кірмаша, у Цілі Саламонаўны. Яна яго ў склепе пратает, а ноччу выводзіць да ветра папірскаць на суседкіны кветкі, за тое, што ў нёе пенсія вышэй… Вось як было на самай справе! Выходзіць, што пра нямецкі самалёт ты нагаварыў міне відзімы!

Ой! Усе мужчыны ашуканцы! Можна падумаць, што Мейлах ні ашуканец. Каму гэта прыйдзе ў галаву такая смешная думка сумнявацца ў гэтым — толькі вар'яту!

А што пра мідаль міне насачыняў? Так я ж нічаму ні веру! Ой! Ну хто цібе дасць мідаль без блату? У нас так ні бывае! Зняў, мусіць, з палоннага немца і выхваляешса. Ты пакажы, што на ім намалявана? Дзе тамака таварыш Сталін? Няма! Тамака, можа, Гітлер які-нібудзь намаляваны. Ад цібя ўсё можна чакаць. Ты ж форменны ахвірэст! Ты такі ж герой, як твой сябар Яша Курвіц кавалерыст. Надзене шпоры на валенкі, накруціць вусы да верху і ўяўляе, што ён ужо кавалерыст. Вось ты за яго падумай — навошта іму шпоры? Штоб буцількі з півам адкрываць? Нават ні цяміць, што сапраўдны кавалерыст всігда піў шампанскае і адкрываў іво шабляй, як знакаміты гусар Дзяніс Давыдаў — адсякаў горлышка, як ты галаву Дорынай курыцы. Яша наогул адкрывае шампанскае, як неадукаваны дурань — коле відэльцам у корак, штоб ні страляла, а пшыкала, як ты ад груш, што зусім ні страшна. Эх вы, мужчыны называюцца! Шампанскае трэба адкрываць так, каб корак у столь, што б у вушах звінела і глухнула! Лепш па-геройску пукнуць, чым здрадліва пшыкнуць! Вось як трэба паводзіць сябе сапраўдным мужчынам!

А ён спалохаўся пасля першай няўдачы. Памятаеш, як гэта было?

Нігучным спосабам Яша стаў адкрываць шампанскае пасля таго, калі ў рэстаране ён сваёй палюбоўніцы ледзь ні на смерць выбіў вока, якое выскачыла з самашэдшай сілай пластмасавым коркам. Добра, што вока было шкляное, само адскочыла і патрапіла ў талерку з вінегрэтам, таму ні разбілася. Дама пасля гэтага доўга плакала другім вокам, а Яшу прыляпіла на галаву талерку з лапшой, якая развесілася на вуху. З тых часоў пайшоў модны занятак — вешаць лапшу на вушы. Гэта ён такое падказаў сваім прыкладам.

Твой Яша — такі наіўны, хацеў у наступны раз для гэтай дамы адкрыць шампанскае, як Дзяніс Давыдаў, але нават не ведае, дзе ўзяць крывую шаблю, якая патрэбна была іму толькі для рызыкі перад жанчынамі. Ён думаў, што шаблі раздае ўсім жадаючым Сямён Будзёны, за лепшы аповед аб яго подзвігах з серыі «Тое, што было ні са мной, памятаю». А шаблі, аказваецца, здабываюць у баі з белагвардзейцамі, якіх ужо няма. Засталіся адны чырвоныя бальшавікі, а ў іх і складанага ножычка не выстараецся. Танк купіць можна, але навошта кавалерысту танк? Што б толькі месца займаў на агародзе? Так лепш карову купіць. Малака пакуль нашы каровы даваць не любяць, так хоць гной будзе.

Дарэчы, Мейлах, ты чуў, што нашы навукоўцы ўзяліся за праблему, як са звычайнай каровінай аладкі рабіць павідла? Не чуў? Дык вось — ёсць першыя поспехі. Смак пакуль выправіць не атрымалася, затое на хлеб выдатна мажацца.

Ой! Гэты Мейлах толькі і ведае, што збіваць мяне з думкі. Добра, працягнем пра твайго сябра Яшу. Міша, ты ж ведаеш Яшу Курвіца? Гэта ж тата Сімы. Якая Сіма? Можна падумаць, што ён ні ведае Сіму? Ну, тая, якая на кожным перапынку есць булачку з маслам і каўбасой. Увесь горад аб гэтым ведае, а ты ні ведаеш Сіму? Гэта ж ёй на парадзе Лёня Сокалаў наступіў на заднюю нагу! Можа ўспомніў ужо? Так я пра яе тату кажу. Ён жа ўсім лапшу на вушы навешаў, пахлешча нашай макароннай фабрыкі, дзе галоўны інжынер быў металург з ліцейнага, таму макароны атрымліваліся абы-якія. Дык вось, Сімін тата казаў, што быў гвардзейскі кавалерыст — жакей, джыгітоўкай займаўся. Цыган даў яму белы конь, паспрабаваць. Так што ві думаеце — зваліўся з белы конь, прама ў рэчку: галавой уніз, дагары ракам! Конь зусім не ведаў, што ён такі віртуоз, сябар Будзёнага, ды скінуў яго, як простага самазванца! Я думаю, ніякі ён ні кавалерыст і ні жакей — прыкідваўся! Ты, Міша, спытай у Сімы, яна павінна знаць. Хай сама расскажа. Толькі ў дзядзькі Яшы ні пытай — ён не любіць успамінаць гэтую частку гвардзейскай кавалерыйскай практыкі. Можа цібе ад жывасці характару зацапіць кулаком за твой нос!

## Ну, Мейлах!

— Ну, Мейлах, раз ты міня так гучна пакрыўдзіў, так ужо і пра тваю любімую палітыку ні відзіржу:

Ой, Людзі! То ж ён, ледзь што, так крычыць: «Я марксіст, я камуніст», а таго ні ведае, хто гэтыя дурасці відумаў. Гэта ж тры як заўсёды разумных габрэі нярускай нацыянальнасці — два барадатых, камлатых і ішчэ адзін — маленькі, руды, лысаваты, бародка калком. Пасада ў нігo яшчэ такая смешная была — звалася Ленін, ці што? Супакою іму толькі не было — то па замежжах, то па ссылках, то па буданах, толькі па інтэрнатах не швэндаўся — у нігo ж тата быў начальнік, як у нас загадчык гарано, толькі з добрай зарплатай! У нігo ўсё было, пры такой зарплаце. Толькі ў нігo сыну Вову ні хапала рэвалюцыі. Зрабіў — Вялікую Кастрычніцкую, і нібыта супакоіўся. Так потым, ад нуды, дадумаўся бервяно па суботах насіць куды папала. Паказаў кепскі прыклад, а яго падхапілі па ўсёй неабсяжнай. Фаня Каплан па суботах не хацела цягаць бярвёны і хацела яго за гэта застрэліць, а можа, за Надзю зарэўнавала, калі пачула песеньку:

*У сяброўкі сваёй Надзі*
*ён знайшоў чаго-та ззадзі,*
*А затым стварыў трактат*
*— «Крок наперад, два назад»!*

Яна правільна пакрыўдзілася. Тое, што ён знайшоў у Надзі, так у Фані было не горш, хто разбіраецца, а ён у яе нават шукаць не збіраўся, ён тады запісачкі сяброўцы Інэсе Арманд пісаў і, заадно, поўны збор сачыненняў. Ну ды добра, у бальшавікоў такіх партыйных інтэрасаў хапала і без Фані. І чаго ўжо ёй на гэта так крыўдзіцца, можна было і патрываць. Хапала нармальных мужыкоў, без марксісцкай падкладкі. Яны жывуць без палітычнай рэлігійнасці, таму не мяшаюць быць цікавымі для жанчыны. Гэта я пра нармальных мужыкоў кажу.

Дык вось, гэтыя хлопцы, якіх Мейлах абараняе ад міня, добра выпілі і прыдумалі камунізм, а вы, дурні, душыцеся ім, будуйце! Лепш бы яны ровар добры прыдумалі або швейную машынку «Зінгер», а то чорт ведае што! І ты, Мейлах, туды ж. Людзі, мала іму вайны, так яшчэ камунізму падавай сваімі рукамі! Смех сказаць!

Ну, што маўчыш, яры камуніст? Лепш бы сам туалет пачысціў, чым пра дурасці іншым людзям галаву турбаваць, ды ішчэ да рібёнку з такой работай прыставаць. Бессаромны!

Я сваі лепшыя часткі фігуры патрапціла, што бы цібе было пацешна, а ты, нііўдзячны, рібёнка ў што хаціш уляпаць? Ні сорамна? Ты добра памятаеш маю фігуру або цібе нагадаць? Яна па сцёгнах была такая стромкая, што сяміструнная гітара ад зайздрасці абрывала струны, калі хлопцы іх тузалі, гледзячы на міне! Што ты на гэта скажаш?

Мейлах не чакаў такога наступу і, слухаючы маналог, вінавата прыжмурваў вочы, а потым асцярожна, як кот па саломе, стаў прасоўвацца за вугал дома. Яму было сорамна, а цётка Рая невычарпальна працягвала ўслед Мейлаху:

— Мужчына называецца. Як убачыць міне, так гузікі на штанах самі разбігаюцца, а ён яшчэ квакае на майго сына. Снайпер! Толькі і можаш страляць грушамі...

Мейлах не адзываўся.

— Я цібе ўстрою сустрэчу інфаркту з міакадрам! — распальвалася цётка Рая. — Знаць цябе больш ні хачу! Міша! Глядзі, што б ні браў у нігo больш брытву. Хай сам ёю голіцца хоць піпірок горла або ішчэ чаго-нібудзь!

Мейлах нікому не давяраў сваю брытву фірмы «Золінгэн», здабытую ў партызанах. У той час людзі маглі карыстацца толькі лёзамі «Нява», прыдатнымі адно для завострывання алоўкаў. Да брытвы Мейлаха ніхто не меў магчымасці дакранацца, акрамя Мішы. У гэтай бітве мы былі на баку Мішынай мамы, таму, перш чым аддаць Мейлаху брытву, ёю былі заменчаныя не толькі алоўкі… Вораг быў годна пакараны!

— Рахіль! Ну што ты наляцела на бедны Мейлах, як сцяпны віхор на ішак? І што ён цібе такое смішное зрабіў? — раптам пачуўся скрыпучы голас цёткі Доры, суседкі. — Ён жа добры чалавек. Розуму палата!

— Якая там розуму палата? Скажы: розуму шпакоўня, я пагаджуся, — пярэчыла ёй Раіса. — І наогул, не сунь свой нос, куды нават сабака не нюхае. Абаронца! Ну, што ты разумееш у мужчынах? Старая дзеўка. Штоб ты цікаўнасць пацешыць, так я цібе прама скажу: калі я з ім лаюся, гэта яго ўзбуджае на подзвігі. Ты ні ведаеш іво асабліваці. Мы з ім самі разбярэмся. Можа быць, гэта нашы маленькія хітрасці… Слухай, Дора, а што гэта ты іво так закрываеш ад міне? Я знаю, якая ты хітрая! У мінулы раз, калі ты ў міне была ў гасцях, то ўсё хваліла капусту, а ела каўбасу. Хай бы ты душылася капустай, а ты выбрала цешыцца каўбасой! Тут што-та ні так… Я думаю, гэта чарговая хітрасць. Проста ты хаціш сабпізнуць Мейлаха. Калі ты да німу такая добрая, хай бы іму лепш зубы наладзіла, а то ён ходзіць з адным біўнем, як насарог. Ноччу нават страшна становіцца, калі выгляніш з-пад коўдры. Як, ты ні знаіш, з чыго рабіць зубы? А з таго золата, што цібе стары Абрашка аджалеў за вясёлыя паводзіны. Ты ж іму падлівала ў шкляначку віно, і сібе тое ж, што б ён ні такі страшны быў, а потым спрытней варушыўся цібе на задавальненне. Я іму гаварыла: «Ні пі, Абрамушка, а то Іванушкам станеш». Ні паслухаўся! Калі? Тады, калі звяртаўся да цібе вечарамі за пірмідонам ад галавы, а поўз раніцай, ледзь жывы, за пілюлькамі ад сэрца, пакуль, да шчасця для ніго, ні памёр. Ён ні відзіржаў, як ты ніво праз свае вальцы пракатала. Задаволіла іму «Дзявяты вал», як на паштоўцы ў Айвазоўскага, а іму нават лёгкі брыз ужо позна, укачвае па ўсякай хворасці ў такой справе. Так сказаў трупапатолаг, калі разабраўся ў яго вайнтробах. Сэрца лопнула, і ўсё. Накрыўся капутом! Я думаю, што ты Мейлаха тожа марыш пракатаць праз свае магутнасці, у выглядзе сцёгнаў, і што ў цібя тамака водзіцца каля іх… Ты, для пачатку, ніво хоць бы падрамантуй! Сібе вунь якія зубы вылепіла — любы конь пазайздросціць, а Мейлаху хоць якой дай расады на зубы. Хай з сібя адлюструе кавалера — табе будзе прыемна і міне інцірэсно, які Мейлах будзе з тваімі зубамі наперавес!

Наогул, Дора, трэба з табой разабрацца, па ўсіх справах, толькі няма часу січас…

> **Замежнікі ніколі не разумеюць галоўнага: каму ж захочацца ваяваць пасля таго, калі ўпрэш у сябе добры кавалак пальцам пханай каўбасы?**

ПЕРАКЛАД

# УСМЕШКА НА ВУСНАХ ПАВЕШАНАГА

Велямір ХЛЕБНІКАЎ



* * *

*Нем гукае лукам нёмным*
*У закрычаў'і зары.*
*Ноч раняе душам цёмным*
*Клічы даўнія: «Гары!»*
*Ды закрычаў задрыжала,*
*У тарчу змоўчанне ўзяла*
*І сталіка, і стаджала,*
*Ў цемру ваяваць пайшла,*
*Лук упаў з рукі паніклых,*
*Прамаўляе цішыня,*
*Ды ў сумяціцах дзяржаўных*
*Адлятае прэч яна.*

* * *

*З мяха*
*На падлогу павысыпаліся рэчы*
*І я думаю,*
*Што жыццё —*
*Толькі ўсмешка,*
*Што цепліцца*
*На вуснах павешанага.*

* * *

*Вечар. Кручы.*
*Сені. Гручы.*
*Мы сядзелі вечар п'ючы.*
*У кожным воку — бег гаючы,*
*У кожным узоры — стрэлаў кучы.*
*І калі ў сутонні кіпела сусветная бойка,*
*З тапчана сарвалася хлапчаня,*
*Суправаджаемае воклічам: «Гонка!»*
*І хутчэй справа, чым правы,*
*Я быў болей слова, чым злева.*

* * *

*З дзыліньканнем-свістам*
*Птушкі ўзлятаць перасталі.*
*Трапечучым лісцікам*
*Яны не лятаі.*
*Таемна цягнуліся птушкі*
*За хмары шырокім брылём*
*Уцякач навукі крывадушша,*
*Я хмары скакаў напралом.*

## Нетры

*Былі напоўнены гукам нетры,*
*Лес звінеў і стагнаў,*
*Ды вось дапетрыў*
*І звера лоўчы дзідай дaканаў.*
*Алень, алень, такія стогны*
*Кахання дзеяслоў ў рагах нясеш?*
*Страла ўстраміла медзь у сцёгны,*
*Страляў і вось, што маеш.*
*Цяпер ён зломіць ногі вобзем*
*І смерць убачыць празарліва,*
*І коні скажуць ганарліва:*
*«Не, не дарэмна стрункіх возім».*
*Няўчасна грацый ўпрыгажэнні*
*Красой нямнога дзеўяга аблічча,*
*Пазбегнуць ты імкнуўся паражэння,*
*Ды ўцекача ён дзідай кліча.*
*Ў патыліцу каней дыханне*
*І ў зямлю рог свайго гатунку,*
*І гучней лука трапятанне,*
*Няма, няма аленю паратунку.*
*Ды раптам вырастае грыва*
*Яшчэ ільвіны кіпцюр гостры,*
*І безмяцежна, і гулліва*
*Ён праявіў мастацтва монстра.*
*І без нязгоды і без крыку*
*Яны палеглі ў свае труны.*
*Ён жа стаяў як уладыка —*
*Рабы павергнуты пакінуць руны.*

* * *

*Сланы біліся біўнямі так,*
*Што здаваліся белай скалою*
*Пад рукой мастака.*
*Алені рагамі спляталіся так,*
*Што, здавалася, іх зліў шлюбны кантракт*
*З узаемапрыцягненнем*
*і ўзаемаадштурхваннем,*
*Рэкі зліваліся ў мора так,*
*Што здавалася; рукаў аднаго душыць*
*шыю другога.*

* * *

*Як двух клінкоў крывое джала*
*Ўпіліся ў неба дзве тапалі,*
*І як памёрлае, ляжала*
*Вакол шырокае там поле.*
*Пасаджаны ў змрок і сум,*
*Белы церам стаіць самотны.*
*Ды вось да золатаберага пяску,*
*Шумна. Прыстае шырокі плыт.*
*І панна абмінае пры сустрэчы,*
*Ахоплена косамі так сваімі,*
*І рукі пакладзе на плечы,*
*І смеючыся выгукваецца імя.*
*І яна яго для ласкавых гулянак*
*Зводзіць, у чырвань пакінутых прат,*
*А ранкам спіхае ў мора каханка*
*Яго радасны скрываўлены прах.*

* * *

*Снежна —магутная краса*
*З прыгожым сном раскос вачэй,*
*Твая паўночная каса*
*Паўстала тут сярод начэй.*
*Учараваны ты і чорны*
*З радасцю сплецены вянок,*
*Яго пакінуў воран горны,*
*Самоты цяжкае звяно.*
*І свету гэты чысты снег*
*Ці ж не таму надзвычай лёгкі,*
*Каб чалавеку чалавек*
*Сусвету гук быў песняй звонкі.*

* * *

*Калі канаюць коні — уздыхаюць,*
*Калі канаюць травы — жухнуць,*
*Калі канаюць сонцы — яны тухнуць,*
*Калі канаюць людзі — галосяць песні.*

## Па — людзі

*Птушка, прагнучы ў гару,*
*Ляціць да неба,*
*Дзяўчына, прагнучы ў гару,*
*Ходзіць на высокіх шпільках.*
*Калі ў мяне няма абутку,*
*Я іду на кірмаш і купляю яго.*
*Калі ў каго-небудзь няма носа,*
*Ён набывае восак.*
*Калі ў народа няма душы,*
*Ён брыдзе да суседа*
*І, страціўшы грошы, набывае яе —*
*Ён пазбаўлены душы!..*

* * *

*Ноч напоўнена сузор'яў*
*Якога лёсу, якіх зор з'яў*
*Ты так далёка зззееш, кніга?*
*Свабоды альбо іга?*
*Сцытаць якую долю трэба*
*На поўначы шырокім неба?*



Малюнак С.Бойцевай

* * *

*Сёння зноў туды пайду*
*Там, дзе кірмаш, жыццё, базар,*
*І войска песень паведу*
*З прыбоем рынка у азарт.*

## Змрочнае

*Калі сябе я не сцярплю,*
*Кінуся ў сонца залатое*
*У крыллі цесныя ступлю,*
*Распусту зблытаю й святое.*
*Памёр я, памёр я, і цячэ кроў*
*Па латах з шырокай прабоіны.*
*Ачнуўся я, інакш, ізноў*
*Азірнуў вас вокам воіна.*

## Курган

*Дзіда татар куды б не ўпала —*
*Бязвольна ўсё да долу хіліцца.*
*Разхрыстаў нашых жанчын дагала,*
*Ляціць у Сібір — Сібіры конніца.*

*Курганны воін, паміраючы,*
*Сціскаў срэбны абраз Габрэя,*
*Вакол зямля, свіст бабака, нара і —*
*Курганны дзень цячэ быстрэй.*

*Гурба лісіц уверх пысы насцярожыла,*
*Нясецца конь, украдзены цыганам,*
*Ляжыць суровы запарожац.*
*Часы стагоддзяў пад курганам.*

* * *

*Вецер—пенне*
*Каго і аб чым?*
*Нецярпенне*
*Мяча быць нічым*
*Людзі песцяць дзень смерці,*
*Як рака крыгаход,*
*У струны вялікіх, паверце,*
*Сёння трызвоніць Усход.*
*І пэўна, нам новую гордасць*
*Чарадзей ззяючых гор дасць,*
*І, шматлікіх людзей праваднік,*
*Я думы накіну, як белы ляднік.*

* * *

*Мые карэнні і ціха цячэ,*
*Блакіт-вада ў чараты.*
*Вецер кідае, гне і мяце,*
*Моўчкі стаяць нераты.*
*У цмяным паветры марыва,*
*Неяк, пазбегшы жыццёвай кручыны,*
*Смуглы хлапчына пабачыў зарыва*
*У вачах светлатварай дзяўчыны.*
*І толькі шум начной асокі,*
*Рачнога жыта тут трымценне,*
*І нехта бледны і высокі*
*Стаіць, з дубравай роўны, ценем.*

* * *

*Каму сказацейкі,*
*Як чынна жыла панначка,*
*Не, не грэчная панна,*
*А, так сказаць, жабунечка:*
*Тоўстая, нізкая і ў сарафане,*
*І сяброўства павялікае*
*Вяла з сасновымі князямі.*
*І багніска люстранoe*
*Паакрэсліла сляды*
*За гарэзлівіцай тою,*
*Дзевай веснае вады.*

* * *

*Вёсны, людзі і народы*
*Уцякаюць назаўжды,*
*Як імклівы бег вады.*
*І на люстрані прыроды*
*Зоркі — нерат, рыбы — мы,*
*Бог — як прывід ля кармы.*

* * *

*Хвілінныя хвалі*
*На возера беразе,*
*Дзе каменне — часам,*
*Дзе час — камень.*
*На берага возеры*
*Хвіліны і хвалі*
*На возера беразе*
*Святлынна шумлівыя.*

## Конік

*Крыльцыхаючы золатапісьмом*
*Танюткіх жыл*
*У конаўку чэрава конік спажыў*
*Шмат прыбярэжных траў і вер.*
*— Цінь, цінь, цінь! —*
*тарарахнуў ціньцівер.*
*О, лебядзіва!*
*О, асвяці!*

**З расійскай пераўтварыў**
**Мікола ПАПЕКА**

ЗАПІСЫ

# ТРЭЦЯЯ ВЫСНОВА

Мікола КАСЦЮКЕВІЧ



*

Рэгрэс перамагаецца прагрэсам, а небыццё і разбурэнне — стваральнай дзейнасцю.

Трэба весці толькі творчае, здзяйсняльнае змаганне з небыццём тэксту. Інакш кажучы, проста пісаць, ствараць сваё, не выносячы прысуду. Бо калі нешта (тэкст) створана ў такой «недасканалай» форме, дык можа, адумысна для некага, хто толькі ў такім выглядзе здольны цяпер успрыняць патрэбны «фрагмент праўды».

Змаганне за «прафесіяналізм» тады этычнейшае, калі наўзамен ты прапануеш сваё, лепшае, а не голае абурэнне.

P. S.

Цікава, а што лепш: цяжкачытэльная «прафесійнасць» ці стылёва бездакорнае, уежна-мудрае «аматарства».

*

За адзін радок кшталту «Птушка гібейла крычыць на дрыгве…» можна аддаць і цэлага лірыка… Не выкінуць, а запхнуць як мага далей. А можна і ўшаноўваць, і нават ставіць помнікі за такія радкі, як гэтыя: «…там лета шалела…»

*

Сапраўднае мастацтва — нескарыстаная эротыка, застыглая ў вольным выбары.

*

Розум напаўняецца нянавісцю і сэксам, калі не выдаткоўвае любасці.

*

«За тое, што паслухаўся голасу жаны сваёй і еў ад дрэва… прысуджаны да вечнай працы».

Жанчына як збавенне і неадменная спакуса, і калі чалавек слухаецца «голасу яе», тым самым змушае, прыкоўвае сябе да працы.

На працу чалавек асуджаны пры выгнанні з раю. А лучнасць з жанчынай («райская асалода», «брама раю») — усяго толькі нагадвае, «сурагаціць» рай запраўдны, ці аддаляе, глушыць «Царства Божае ў нас…» За ўсё трэба плаціць. Праца дзеля, праз і за сурагат, падробку. Дакладней — за больш танны, бляклы аналаг раю.

*

Калі рухае любасць, ці можна быць несумленным, хай толькі звонку, «фармальна», скажам хлусіць для выратавання — сябе ці іншага, рабіць інакш, ніж іншы хто хоча, насупор… Калі ўсё мае сэнс, апраўдваецца не чалавечай, а боскай логікай, дзе мінуўшчына, сучаснасць, будучыня — адно…

*

Рэрыхнутасць — эзатэрычны опіум для абраных.

*

Беларусь у гісторыі, як жанчына ў жыцці.

*

Пэўна што мы, людзі — найвялікшая Боская гульня. Невідомая вайна. Гэткі неафіцыйна бясконцы чэмпіянат сусветаў, які адбываецца на небе, а за фігуры-фішкі выступаем мы… І часам паварот гэтых партыяў бывае дужа пакручастым, а вынікі — амаль што непрадказальныя. І хоць гуляем не мы, а намі. І хоць сама гульня можа быць скончаная ў кожны момант. Усё ж яе вынікі залежаць ад нас, ад людзей… Інакш — гульня не адбылася б.

*

Галоўная бадзёрасць — памкненне заснуць.

*

Без інтэрнэту чалавечы свет парваўся б ад перанапругі.

*

Разважаць, якая можа, ці не можа, быць у Бога задума, дый усяго толькі пра нас, людзей, — значыць, змяншаць яго да сябе.

Развагі пра тое, што «негуманна» толькі частку з мноства збавіць для Вечнасці, аспрэчваюцца так: кожны дух (манада) — гэта часцінка Яго, і Ён сябе ўвесь час удасканальвае, адкідаючы няякасны інтым, як мы зразаем мазалі ці, бавячыся, змяняемся фізічна.

Яшчэ, відаць, аддаючы ў свет часціны сябе, Ён вызначае, наколькі тыя заганныя ў сваёй самастойнасці. А раз гэтыя самыя асобныя клеткі маюць розум і самастойныя, дык яны, натуральна, могуць арганізоўвацца, уяўляць пра сябе што хоця, разважаць пра «справядлівасць» і г. д. Але, так ці гэтак, мы, часцінкі, належым Богу. І Ён, адпаведна, вольны распараджацца намі, не ўзгадняючыся ані з якім, хай нават і найсамастойнейшым меркаваннем. Скажам, і журналіст можа выказвацца цалкам вольна, але да пэўнае мяжы, пакуль не знікне да яго цікавасць. Чыя?

Амёбы таксама стадамі руяцца.

Сусвет — Бог? А мы, як свет — ягонае мысленне?

*

Калі чалавек утаясамляе сябе з нечым часовым (ідэя, партыя…), ён сам становіцца часовым… і — памірае…

Галоўная абмыла нашых многіх — бачыць не сябе ў Беларушчыне, а Беларушчыну ў сабе: калі яна ўва мне, значыць я носьбіт яе і магу гаварыць ад яе імя… Павінна ж быць так: я толькі частка, служка Беларушчыны.

*

У сакральным сэнсе псеўданім ахоўвае быццё творцы ад метакармы. Але, калі чалавек падзяляе сябе і творчасць (мухі асобна, катлеты асобна), то і якасць і глыбіня творчых працэсаў зазвычай павярхоўныя, бо сілкуюцца, відаць, пераважна «менталам».

*

На прапанову закончыць фразу «Ва ўтульнай хатняй атмасферы…» выдаў: «…культурна бавіў час на порнасайце…»

*

Трагізм — гэта няздольнасць старога адпавядаць новаму, альбо, па іншаму, і хіба што слушней — разрыў паміж верай і няверай.

*

А чалавецтва знікла б, каб не было Савецкага Саюзу — у адным гістарычна-часавым месце зберці гэтулькі «выкупляных грэшнікаў», правесці адначасна і эксперымент развіцця і… карацей, СССР — своеасаблівы лакальна-сусветны патоп нашага, цяперашняга часу…

*

Творчасць — пакора перад Богам, а не перад светам, хоць часцей, на жаль, наадварот…

Найніжэйшы ровень — п'ныя вычаўплянні, найвышэйшы — творчыя засветкі, перфомансы, самарэклама, а існаць тут адна: дагадзіць свету…

*

Курэнне — найнезаўважнейшая і наймацнейшая несвабода, нястача волі як падсведамы супраціў Божай задуме пра сябе — натуральнаму, гарманічнаму выспяванню і ходу жыцця.

*

Свет — гэта Божая і, можа быць, запраграмаваная гульня. А свабода волі чалавека — наколькі ён будзе замешвацца, перашкаджаць натуральнай плыні жыцця (ды яшчэ і самаўзвялічвацца), жыць не ў згодзе з Богам, — замінаць заміж таго, каб творчымі (на ўзор і падобнасць…) здольнасцямі паляпшаць, удасканальваць нешта ў свеце (у сабе…) згодна з Задумай…

*

«Русы клін журавоў…» — нябесная мара пра галаграфічнае выяўленне энергіі дзявочых лонаў…

*

Чаму цяпер так папулярны Браўн? Чаму мажлівыя Русо, Таксілі, Яраслаўскія ды іншыя Пазаліні… Чалавеку не хочацца асабістай адказнасці перад Богам, ён чакае, прагне, каб яго настроілі, пераканалі ўва ўседазволенасці, у свабодзе, не абмежаванай жаднымі духовымі законамі («Калі Ён такое сабе дазваляў, то…».) І можна расслабіцца… даць волю свайму «Я» без Госпада. Сам сабою, і для сябе…

*

…земны максімум фашысцкай Германіі, апроч усяго іншага, відомага, нячысты яшчэ і ў плане лучнасці з акультызмам — тое самае, што і ерась у праваслаўі…

*

Вобразы — ровень малітвы ўяўлення…

*

…у вольнай плыні існавання мне захацелася сябе, і я пачаў жыць і стамляцца, спрабуючы хоць крышку пасталець…

Праз наўмыснае глупства альбо нязмушаную неахайнасць выклікаць расчараванне ці нават пагарду і ўрэшце, праз тое, знаходзіць свабоду.

Якой жа, бывае, сацыяльнай крывёй і нястачай спрыяння даецца лёгкае паветра духу…

*

«Не свая» жанчына адчувае, што губіць, і шчыра шкадуе, хінецца, аддаецца дарэшты, да канца — і губіць, губіць…

*

Нам не даецца бачыць, разумець існасць многіх з'яў і рэчаў, але ж пры тым — даецца свабода волі. І мы накідваем сваё неразуменне іншым, якія, можа, нешта разумеюць…

*

Ведама, той хто піша пра нешта, да чаго дакрануўся, малайчына. Але ж адно з заданняў паэта — калі ён адчувае патрэбу ў дачыненнях з грамадствам — данесці, расказаць пра сваё ўяўленне так, каб зразумеў чытач. Пажадана, каб усякі, хто захоча і возьмецца чытаць. Каб стаўленне да твора падзялялася на: хачу — не хачу чытаць, а не: зразумеў (разумны) — не зразумеў (дурны). Іначай, пісьменства — снабізм…

*

Вялікі жывот, як калупанне ў носе, — такая самая даравальная чалавечая слабасць…

*

Можа, перад Богам канфесія ад канфесіі не лепшая, чым жанчына ад жанчыны, і не варта мяняць канфесію дзеля жанчыны, як і жанчыну дзеля канфесіі. Ад таго і ад другога варта адмаўляцца толькі дзеля шчырасці — няшчырасці — г. зн. свайго адчування запраўднасці праз гэта перад Богам…

*

Чым прымітыўней, спрошчаней сведамасць, тым устойлівей яна ў шчыльна-фізічным жыцці. Пакрыўдзіў — забіў…

*

Мы ўспрымаем так, як нам дадзена — не больш Звыш дазволенага, і разуменне гэтае абмежаванасці — адзіна вартая падстава аптымізму. Як толькі ўсведаміў хоць нешта звыш сябе — адразу захацеў напраўду жыць…

*

Адлегласць часу — як прывязанасць да жанчыны: чым больш свабоды я шукаю, тым больш залежны ад яе. І толькі зліўшыся ў адно, я атрымоўваю незалежнасць — абсалютовую, да поўнай страты. А таму я здольны цалкам валодаць толькі тым, ад чаго зусім незалежны. Адсюль, урэшце, і трэцяя выснова: найменш падуладны і абсалютна незаўважны для нас Бог, таму мы і абсалютна падуладныя ды заўважныя, відомыя для Яго…

*

Жаданні нашы — як воля Бога, запраўдная, яна схавана ў глыбіні, пад друзам мноства іншых воляў… І пад найцяжэйшаю воляй, бо самай блізкаю, сваёй…

*

…вышэйшая ды іншыя адукацыі маюць сэнс у палепшанні чалавечае існасці, не ў вонкава-фармальным, а ва ўнутрана-якасным. Вось зараз ты прыцэньваешся да мае душы, розуму і г. д. — я табе ўжо спадабаўся, інакш бы мы не гаварылі. Але ж заразом ты не ведаеш, быў я выдатнікам у школе і ў выніку так схарашэў. Ці мо наадварот — адпачатку быў разумным, потым пайшоў у двоечнікі і дзеля здаровае «непрышыйрукаўнасці» здалеў не запсавацца…

*

Мая «няўпэўненасць» у сабе (маё мяне не абыдзе, а не маё — і не трэба…) ад давярання Богу, ад усведамлення таго факту, што мы не такія свабодныя, як сабе ўяўляем (поўная аналогія з катамі), ад няведання, колькі мне дадуць, колькі дазволяць Звыш.

*

Пласты старой беларускай міфалогіі толькі цяпер, у канодную часіну былі грунтоўна апрацаваныя, бо ўвага да іх запыняе на тонкіх роўнях тварэнне (крышталізацыю?) новай, для нас яшчэ мажлівай, сакральнасці. Таму ў час (ні раней, ні пазней) і ўзнік свой «Міфалагічны слоўнік» — з'ява ў метагісторыі Беларушчыны знакавая, сакральна-пераходная…

*

Літаратурнае маўчанне: Што здаволіла б іншых — нецікава самому, а да таго, што здаволіла б самога — яшчэ не дарос…

*

«Спрактыкаванасць дапамагае жанчыне патрапіць у шлюб, мужчыне — унікнуць шлюбу…»

*

Сярод шчырых беларусаў — ніводнага спітага, спіліся толькі тыя, што засталіся ў расейшчыне. Ну яшчэ, як вынятак, спрабаваць піць дазваляецца паэтам…

Нешта падобнае ў шчырых беларусаў і з вялікімі жыватамі — альбо яны выступаюць падмуркам агульнай магутнасці, альбо іх зусім няма…

Ну не жывуць беларусы іначай, не хочуць жыць…

*

Калі дэманічныя светы шчыльныя, дык чым не пекла ў гэтым свеце, калі душа трапляе ў камяні, цэмент, бетон?..

*

Мужчыны ўзлюбілі пяшчоту, развялі какецтва, сталі мкнуцца да пачуццёвага, уціснуліся ў дэкальтэ і, не знайшоўшы любай паловы, пачалі распранацца ў стрыптызах… Жанчыны агрубелі, адгадавалі вусікі, бародкі, найадважнейшыя абылселі і, у вольную ад клопатаў часінку, выгульваюць сваю пасію, зацугляную бояззю адзіноты, па тэатрах і рэстаранах…

*

Рамантыка войска — ад скрайняй напружанасці фізічнага свету, на мяжы парушэння запаветаў, граху і дазволенасці Звыш.

*

Наша цела — жарало радасці і слаўлення Стварца, калі бярэцца як сродак. І яно ж — выток пакутаў, калі ёсць мэтай.

*

«Прафесія» паэта — не выдумляць, памнажаючы, сваё, а перадаваць адчутую іншарэальнасць.

*

Што такое — губіць душу? Людзі ў большасці — як самапраграмныя аўтаматы ў целе, і кволая слабая душа рэагуе на словы, уздзеянні і да т. п. У адпаведнасці з уласнай ці з кімсьці закладзенай праграмай. Рэагуе, раскатурхваецца, набіраецца рознага досведу, развіваецца, сталее… Але і наадварот — развітая душа захапляецца целавым і дэградуе…

ПОСТАЦІ

# РАДАСЛАЎ АСТРОЎСКІ

## РАЗДЗЕЛ З КНІГІ «У ВІЛЬНІ І БОЛЬШ НІДЗЕ»

Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК


Фота Глабадзенкі

Леанід Дранько-Майсюк

У панядзелак 4 кастрычніка 2010 года я сядзеў у Цэнтральным дзяржаўным архіве Літвы, што знаходзіцца на забочнай віленскай вуліцы Аскара Мілаша, і тануў у акіяне мовы Пілсудскага, бо ўсе дакументы, якія гартаў, былі (ці ад рукі, ці на машынцы) напісаны па-польску.

І раптам, як і ў траўні, беларускае пісьмо!

Дзве распіскі Максіма Бурсевіча.

Першая:

«Квіт на 1070 злотых

Атрымаў з паваротам тысячу семдзесят (1070) злотых, знойдзеных у агульнай касе ў памешканьні Пасла Паўла Валошына падчас рэвізіі ў дню 15.1.1927 г. М. Бурсевіч».

І другая:

«Квіт на 150 зл.

Атрымаў з паваротам сто пяцьдзесят (150.00) злотых, адабраных у мяне асабіста з кішані падчас рэвізіі, выкананай 15.1.1927 г. у чым і квітую. М. Бурсевіч».

Нават і не думаў, што мне так пашанцуе, што знайду і такое нечаканае («бухгалтарскае»!) сведчанне таго, што ў студзені 1927 г. пілсудчыкі прыступілі да знішчэння Грамады.

Максім Бурсевіч, сын Тараса і Марыі, у свае трыццаць сем быў засуджаны на 8 гадоў турмы і сядзеў у Каранове; апеляцыйны суд зменшыў пакаранне да 6 гадоў, якія адбыць не давялося, бо ў 1930 г. быў выпушчаны на свабоду, а ў 1931 г. апынуўся ў Менску і як вынік гэтага праз два гады — у бальшавіцкай катоўні.

Чысты, як і ўсе астатнія…

Плата за палітычны наіў — смерць!..

Праўда, не ўсе былі ў нас наіўныя — той жа Радаслаў Астроўскі…

О, гэты ўмеў круціцца!

Невыпадкова ж у пачатку 1930-ых Тарашкевіч сцісла занатаваў у сваім блакноце: «Выкрыццё Астроўскага…»

Здаецца, гэта быў напамін сабе аб тым, што трэ было конча зрабіць!

Не паспеў Тарашкевіч, не паспеў…

Астроўскі ўваходзіў у склад кіраўніцтва Грамады, меў пасведчанне за нумарам 50000…

Дэман карыслівай дзейнасці, ён, здавалася, ніколі не стамляўся, браўся за любую кіраўнічую (!) пасаду, таму зусім нядзіва, калі мы чытаем, што ён і Старшыня Таварыства Беларускай Школы (ТБШ), і дырэктар Віленскай беларускай гімназіі, і Старшыня Беларускага Дабрачыннага Таварыства, і дырэктар Беларускага Банка…

На апошняй пасадзе ягоны талент у 1920-я гады найбольш расквітнеў, таму пра Беларускі Банк варта сказаць падрабязней.

Фармальна Банк узнік 14 лютага 1925 г., дзякуючы паслу Ярэмічу, аднак 9 лістапада таго ж года Ярэміча адсунулі ад кіравання, і прынята лічыць, што рэальнае жыццё гэтай кааператыўнай установы пачалося пасля вядомай Гданьскай канферэнцыі, якая прайшла ў канцы жніўня, а па іншых звестках — увосень 1925 г.

Астроўскі быў у Гданьску, — дапускаю, ён асабліва ўважліва слухаў выступленні камуністаў Ігнатоўскага, Славінскага, Ульянава, і, пэўна ж, не без яго, Астроўскага, удзелу была ўсебакова абгаворана магчымасць «канкрэтнай» дзейнасці Беларускага Банка.

І тут першую ролю адыграў Аляксандр Ульянаў — былы эсэр, магільшчык нашай інтэлігенцыі і палітычнай эміграцыі, «дыпламат», а перш за ўсё — супрацоўнік тайных бальшавіцкіх службаў.

Камінтэрн, дзякуючы Ульянаву, пачаткова перадаў на ажыўленне Банка дзве сумы: 15000 даляраў і 11750 даляраў (на цяперашні курс — гэта больш за 2 мільёны даляраў ЗША. — Л. Д-М.).

Адказным за фонды, вядома ж, прызначылі Астроўскага…

Беларускі Банк фінансаваў дзейнасць Грамады.

Як ужо было сказана, 15 студзеня 1927 г. улада прыступіла да ліквідацыі Грамады; у траўні 1928 г. у Віленскім акруговым судзе завяршыўся знакаміты працэс 56-ці, па выніках якога Астроўскі выйшаў на волю — наперадзе чакаў разгляд у апеляцыйным судзе.

І от жа з апеляцыйнай скаргі падпракурора Роберта Раўзэ, напісанай у Вільні 11 кастрычніка 1928 г., пра беларускі Банк можна даведацца, што з самага свайго пачатку ён «…завязвае адносіны з замежнай фінансавай экспазітурай «камінтэрна» — Рыжскім транзітным Банкам, прымаючы на сябе выкананне даручэнняў гэтага банка. Суд (акруговы. — Л. Д.-М.) выявіў, што пайшчыкамі Рыжскага транзітнага Банка былі: (Дзяржаўны. — Л. Д.-М.) Банк СССР, Усерасійскі Кааператыўны Банк, Маскоўскі Народ.(ны) Банк, Сел. Саюз (?), а таксама арганізацыі ўкраінскай сав.(ецкай) рэспублікі.

Аналіз бягучых рахункаў і тэрміновых укладаў паказвае: у Беларускі Банк сапраўды паступілі 15000 даляраў, якія былі абяцаны ў Гданьску, а таксама 11750 даляраў на выплаты 700 асобам па даручэнні вышэйназванага Рыжскага банка.

Акруговы Суд у матывах прысуду (старонка 39) сцвярджае: «…цяжка вытлумачыць раптоўнае ўзбагачэнне абвінавачаных у 1925-1926 годзе — асабліва кідаецца ў вочы факт адначасовых, іншы раз аднолькавых укладаў у Банк вялікіх сум некалькімі падсуднымі. Напрыклад, 16 лістапада Валошын і Тарашкевіч унеслі ў Банк 100 дал.(яраў) і 211 дал.(яраў), 17 красавіка 1926 г. Мятла і Рак-Міхайлоўскі (унеслі. Л. Д.-М.) па 300 даляраў, пры гэтым даты ўкладаў супадаюць з перыядам, у які БСРГ што раз больш становіцца залежнаю ад камінтэрна, які падтрымлівае і субсідзіруе яе».

«Аналіз рахункаў Астроўскага дае падставу лічыць: сумы, унесеныя ім у Банк (1301 даляр і 31024 п.(ольскіх) зл.(отых)), не з'яўляюцца яго ўласнасцю (тое, што ён узяў сабе пазычку ў суме 48 дал.(яраў) пры наяўнасці ўласнага бягучага рахунку — не паддаецца тлумачэнню; паясненне адваката, што гэта была аперацыя праведзеная з прычыны недакладнай дзейнасці Біндзюка (?), адпадае ў сувязі з высновамі экспертаў: нявыплата працэнтаў і г.д.)…»

…На хвіліну спыню цытаванне і для будучых біёграфаў Астроўскага зазначу: гэтыя незразумелыя 48 даляраў будучы прэзідэнт Беларускай Цэнтральнай Рады ўзяў 29 лістапада 1926 г., а наогул жа вельмі і вельмі здзіўлюся: свае грашовыя аперацыі грамадоўцы праводзілі, асабліва не блытаючы сляды — можна сказаць, з бясклапотнасцю рамантычных гімназістаў!

**Камінтэрн, дзякуючы Ульянаву, пачаткова перадаў на ажыўленне Банка дзве сумы: 15000 даляраў і 11750 даляраў**

А далей Р. Раўзэ даводзіў апеляцыйнаму суду:

«…у час заснавання філіялаў Банка ў Пінску і Глыбокім, Цэнтральная каса не мела адпаведных фондаў: напрыклад, 18 сакавіка паўстае філія ў Глыбокім, і ў той жа дзень Радаслаў Астроўскі ўносіць у Цэнтральную касу — 800 даляраў, Браніслаў Тарашкевіч — 100 даляраў; філія ў Пінску адчынена 5.04.1926 г., калі Цэнтральная каса высылае 500 даляраў. Адкуль грошы? 30 сакавіка ад Астроўскага паступае 1580 зл.(отых), Тарашкевіча — 500 дал.(яраў), ад банкаўскага бухгалтара — 500 даляраў і 1580 зл.(отых)

(От і відавочны факт «адначасовых… аднолькавых укладаў». — Л. Д.-М.)

Банкаўскія кнігі вяліся няддбайна, зрэшты, падсудны Р. Астроўскі і сам не адмаўляў, што меў «Чорную тэтрадку».

Тое, што Беларускі Банк удзельнічаў у падрыўной рабоце Грамады, кажуць у сваіх паказаннях сведкі:

Аляксандр Бабіч атрымаў з Банка пры дапамозе Астроўскага 300 зл.(отых) і спыніў сваю сувязь з камуністычнай партыяй.

Козіч даказвае: пасол Валошын паведамляў яму, што Беларускі Банк субсідзіруецца савецкім урадам; той жа Козіч плаціў камандзіровачныя грамадоўцам грашыма з Банка (паказанне Каланчынскага).

Удзельнік курсаў Грамады ў Радашковічах Тарасюк прызнаўся: Банк даў на стварэнне гэтых курсаў 600 зл.(отых) (пацвярджэнне ў паказаннях Кнапэ).

Муж Даверу Грамады ў Лідскім павеце змоўшчык Шым-



Радаслаў Астроўскі — у цэнтры

# ФРАГМЕНТЫ

кевіч, які потым уцёк у Расію, займеў з Банка 2000 зл.(отых).

Вядомы дзеяч Грамады Ігнатовіч, пра якога сведкі паведамляюць, што ён быў выбраны як будучы Беларускі Староста, забраў з Банка 180 даляраў.

Сведка Скальскі даводзіць: Банк аплачваў штрафы, накладзеныя ўладай на грамадоўцаў…»

…Зноў спыню цытаванне, каб заўважыць: сведка Скальскі — той самы падкамісар Тадэвуш Скальскі (кіраўнік памежнага камісарыята дзяржаўнай паліцыі ў Тчэве!), які 5 лютага 1931 г. у цягніку Гданьск—Мальборк затрымаў Б. Тарашкевіча… (Глядзі папярэднюю публікацыю ў «Літаратурнай Беларусі»: «Новы час», 27 мая 2011 г.)

Ужо ў Менску я сказаў пра гэта Анатолю Сідарэвічу; мы сустрэліся ў архіўным касцёле Святога Язэпа, у кабінеце прыязнай спадарыні Запартыкі; Анатоль дапамог мне расчытаць у юрыдычным творы Р. Раўзэ складаныя мясціны і са сваёй характэрнай смяшлівасцю праказаў:

— Во, які трапіўся пракурор уніклівы!

Сапраўды, дапытлівасць пана Раўзэ была на ўзроўні!

У рамане «Сустрэнемся на барыкадах» Піліп Пестрак іранічна назваў Р. Раўзэ — эрудзіраваным.

Мяркую, пан Раўзэ без ніякай сацрэалістычнай іроніі быў дасведчаны ў сваёй справе.

І зноў жа ён паведамляў, што «…Суд (акруговы. — Л. Д.-М.) устанавіў: Семашкевіч на гэту мэту (аплачваць штрафы, налажаныя на грамадоўцаў. — Л. Д.-М.) атрымаў з Банка 90 п.(ольскіх) зл.(отых).

Сведка Будзінскі паказвае: пазыкі (усяго выдадзена 12863 дал.(яры) і 3385 зл.(отых)) выдаваліся толькі чальцам Грамады; гэты сведка шмат ведаў, бо меў інфармацыю ад грамадоўца Іголкі, які пазней быў забіты па палітычных матывах.

Сведка Бялінскі сцвярджае: чалец Грамады Пятровіч звярнуўся да яго канфідэнта з прапановай займацца шпіянажам, пры гэтым зазначыў, што грошы яму будзе плаціць Беларускі Банк.

Ігнат Андзілеўка (устройшчык гуртко Грамады), які неадназова браў сумы з Банка, са слоў сведкаў Сасноўскага і Дразда, упэўнівае: яму за палітычную работу плаціць Банк, і Банк гэты мае грошы з Расіі.

Сенсацыйнае прызнанне зрабіў запасны сведка, Муж Даверу Грамады ў Браслаўскім і Дзісенскім паветах Іван Ласёнак; ён паведаміў, што па просьбе Астроўскага і Мятлы падрабляў на вэксалях жыро на імя Ліпскі і такім чынам атрымаў з Банка грошы на падрыўную дзейнасць, а менавіта:

350 зл.(отых) для развозу падрыўной літаратуры;

10 дал.(яраў) на выезд са шпіёнам Зарэкам у Расію;

33 дал.(яры) і 22 дал.(яры) за арганізацыйную работу Грамады…»

Не магу тут не сказаць: апошнія тры сумы нейкія несур'ёзныя, але тым не менш — у судзе любая драбніца мае вагу!

Далей пан Раўзэ звяртаў увагу на іншыя сферы дзейнасці Астроўскага.

Спасылаючыся на ўласнае прызнанне падсуднага, а таксама ж на паказанні сведкі Івана Савіцкага, падпракурор даводзіў, што падсудны Астроўскі, калі быў Старшынём Беларускага Дабрачыннага Таварыства, атрымаў з СССР вялікія сумы, першы раз — 4000 злотых, а другі раз — 15000 злотых.

Акрамя таго займаўся ён і мопраўскай дзейнасцю — зноў жа небескарыслівa…

Існавала такое таварыства МОПР — міжнародная арганізацыя дапамогі барацьбітам рэвалюцыі.

І былі такія беларускія людзі, якія шчыра верылі ў неабходнасць МОПРа.

У кнізе «Памяць» (Слонімскі раён) на старонцы 183 чытаю:

«…тры гады падрад (1930-1932) тайком ад паліцыі мы атрымлівалі ад рыбнай гаспадаркі 1000 злотых штогод і здавалі іх у МОПР. Гэта сума на той час была немалая. За 1000 злотых можна было купіць 500 пудоў хлеба…»

І што тут скажаш?

Хіба што адно: шкада і людское веры, і людское працы!

Пра людскія грошы — маўчу…

Праўда, нейкая дапамога вязням і іх родным усё ж такі даходзіла, таму дзякуй тым, хто дзяліў; дзякуй за тое, што ўсё сабе не забраў…

Аднак вярнуся да асноўнай (банкаўскай!) тэмы.

Падпракурор Віленскага акруговага суда Роберт Раўзэ пакінуў нам выразны, але дастаткова сухі тэкст.

Аднак жа ёсць і белетрыстыка, створаная чулым сэрцам.

Былы пасол і сенатар польскага парламента Васіль Рагуля называў Беларускі Банк Зямельным Банкам і ў сваёй цікавай кніжцы «Успаміны» пісаў:

«…сродкі былі. Адкуль? — думаю, што ад Вульянава, першага дарадчыка Палпрэдства ў Варшаве, беларуса, родам з Магілёўшчыны. Вульянаў, між іншым, выстараўся дапамогу Саветаў на адкрыццё Грамадою ў Вільні Зямельнага Банку, у вышыні 15000 дал.(яраў), у тры раты па 5000 дал.(яраў) кожная. Першую рату атрымаў я, антыкамуніст, старшыня Сялянскага



Саюзу і старшыня Беларускага Пасольскага Клюбу, але без ведама сяброў Клюбу. Чаму і як гэта сталася? Вось гэтак. Аднаго дня, у Сойме, Тарашкевіч папрасіў мяне зайсьці да яго ў габінэт. Там быў Р. Астроўскі. Яны абудва зьвярнуліся да мяне з просьбаю пайсьці ў Савецкае Пасольства і атрымаць для Беларускага Банку 5000 дал.(яраў). «За пасламі Грамады бесьперапынна сочаць дэфензыва; іх могуць накрыць, як кажуць, на гарачым учынку, а тады бывайце, даляры. Табе, які не належыш да Грамады, зрабіць гэта лягчэй», — казалі яны…»

Сенатар дапамог.

Аднак жа ён вельмі рызыкаваў, бо за свой учынак мог дастаць 12 гадоў цяжкое турмы.

Дык вось, першую рату атрымаў В. Рагуля, другую (праз Транзітны Банк у Рызе) — сам Б. Тарашкевіч, трэцюю — невядома хто.

Можна дапусціць, што Р. Астроўскі.

В. Рагуля яшчэ ўспамінаў:

«…пасьля атрыманьня першай раты, у Грамадзе паўстала пытаньне, як замаскаваць паходжаньне грошай у банкавых кнігах. Я парадзіў Рак-Міхайлоўскаму і Валошыну расьпісаць гэтую суму, як уклады паасобных, але давераных асобаў… Гэткімі асобамі ня могуць быць паслы, бо іх могуць арыштаваць, блякуючы адначасова і іх уклады. Гэтак яны і зрабілі… на імя брата Мятлы запісана 600 дал.(яраў), а на імя Р. Астроўскага (ён пасьлом не быў. —Л. Д.-М.) і ягонай жонкі — каля 1160 дал.(яраў)…

Пасьля ліквідацыі Грамады, грамадоўцы, што засталіся на волі, даручылі кіраўніцтва Банкам сэнатару Багдановічу. Ён і стаўся Дырэктарам Банку. Аднойчы ў Варшаве ён сказаў мне, што брат Мятлы і Астроўскі з жонкаю дамагаюцца выдаць ім іх «уклады»… Сам факт патрабаваньня выдачы «ўкладаў» без зазначэньня, на што яны будуць бескантрольна расходаваны, кінуў на «ўкладчыкаў» непрыемны цень і выклікаў прыгнятаючае ўражаньне сярод сяброў Пасольскага Клюбу…».

Хаця В. Рагуля раіў і, вядома ж, слушна раіў, каб на паслоў не распісвалі грошы, аднак жа распісалі й на паслоў — то-бок, на саміх сябе.

Першыя запісы ў банкавых кнігах з'явіліся 9 лістапада 1925 г., а на 1 студзеня 1927 г. склалася такая карціна: П. Мятла меў на тэрміновым укладзе 265 даляраў і 510 даляраў на бягучым рахунку; П. Валошын на тэрміновым — 305 даляраў, на бягучым — 145 даляраў; Б. Тарашкевіч на тэрміновым — 611 даляраў, на бягучым — 101 даляр; С. Рак-Міхайлоўскі на тэрміновым — 50 даляраў, менш за ўсіх, але затое на бягучым — 2275 злотых і яшчэ 889 даляраў…

**Не з'ўлялася для польскага суда аргументам і тое, што Астроўскага, як старшыню ТБШ, хваліў у Менску ў сваёй кніжцы «За Савецкую Беларусь» адзін з галоўных камуністаў Беларусі А. Чарвякоў**

Дарэчы, калі 15 студзеня 1927 г. на вакзале ў Вільні С. Рак-Міхайлоўскага арыштавалі, то пры ім было 195 злотых…

Як і прадбачваў сенатар Васіль Рагуля, па арышце паслоў налажылі забарону і на іхнія рахункі; рахункі былі далучаны да крымінальных спраў у якасці рэчавых доказаў.

27 траўня 1927 г. суддзя Віленскага акруговага суда Стэфан Паўлюць, спасылаючыся на паказанні «камунікатчыка» Міхала Гурына, пастанавіў: згаданыя грошы не з'яўляюцца прыватнай уласнасцю абвінавачаных грамадоўцаў, грошы прызначаны для камуністычных акцый і падлягаюць канфіскацыі на карысць скарбу.



Радаслаў Астроўскі. Малюнак А. Крывенкі

Мусіць жа, хуткай канфіскацыі не адбылося, таму 18 сакавіка 1929 г. адвакат Казімір Петрусевіч звярнуўся ў Віленскі апеляцыйны суд з просьбай вярнуць яму, як упаўнаважанаму П. Мятлы і С. Рак-Міхайлоўскага, іхнія ўклады (з мэтай, каб імі карысталіся сем'і асуджаных).

І ў той жа дзень і на той жа адрас К. Петрусевіч падаў яшчэ адну заяву:

«Паводле выраку Апеляцыйнага Суда 16 сакавіка 1929 г. быў апраўданы Радаслаў Астроўскі. З гэтай прычыны прашу Апеляцыйны Суд вярнуць мне, як упаўнаважанаму Астроўскага, секвестраваны і далучаны да справы ўклад Астроўскага ў Беларускім Банку ў Вільні…».

На заяве няма ніякай рэзалюцыі, таму не ведаю, ці вярнулі выдатнаму адвакату ўклад апраўданага Астроўскага (уклады ж засуджаных П. Мятлы і С. Рак-Міхайлоўскага, як і засуджаных сяброў іх, пэўна што, не вярнулі!); ведаю іншае — нягледзячы на старанную працу падпракурора Р. Раўзэ, нягледзячы на пераканаўчую логіку ягоных слоў: «…падзяляючы думку Акруговага Суда (старонка 39 выраку) «…Р. Астроўскі з'яўляецца ў беларускім грамадстве прыкметнай асобай…», здаецца сумніўным, каб ён, належачы да Грамады і маючы прыязныя адносіны або знаёмствы з яе правадырамі, не быў імі паінфармаваны пра істотныя мэты і намеры БСРГ — лічу апраўдальны вырак Суда (акруговага. — Л. Д.-М.) у адносінах да Астроўскага няслушным…» — дык вось, нягледзячы на гэта, апеляцыйны суд пакінуў у сіле пастанову акруговага суда.

Суддзі ведалі, што ў Астроўскага не проста прыязныя адносіны з правадырамі Грамады, а ён меў вялікі ўплыў на Тарашкевіча.

Красамоўны й той факт, што 15 студзеня 1927 г. Тарашкевіч быў арыштаваны не ў сваёй кватэры, а ў віленскім асабняку Астроўскага!

Паводле запаснога сведкі Стэмпля, калі арыштоўвалі Тарашкевіча, Астроўскі ў гэты час паліў грамадоўскія паперы…

Суддзі зналі, што з яго ведама і ў яго доме адбываліся сходы цэнтральнага камітэта камуністычнай партыі Заходняй Беларусі!

Пра гэта сведчыў усё той жа раскольнік і камунікатчык, былы член ЦК КПЗБ М. Гурын.

Аднак жа апеляцыйны суд, а засядаў ён з 28 лютага па 16 сакавіка 1929 г., адкінуў гэта сведчанне: мауляў, нельга верыць, бо сведка М. Гурын ужо не належаў да КПЗБ і мог атрымліваць ад якой-небудзь няпэўнай асобы недакладную інфармацыю!

Калі суддзі не паверылі знанаму сведку М. Гурыну, то, вядома ж, не прыслухаліся яны й да паказанняў нейкага там Васілеўскага, які даводзіў пра тое ж: Радаслаў сын Казіміра Астроўскі ў сваім доме па адрасе: Вільня, Чыгуначная Калонія 62 — спрыяе камуністам!

І, вядома ж, не з'ўлялася для польскага суда аргументам і тое, што Астроўскага, як старшыню ТБШ, хваліў у Менску ў сваёй кніжцы «За Савецкую Беларусь» адзін з галоўных камуністаў Беларусі А. Чарвякоў.

Словам, не суд у бальшавіцкім разуменні, а святая прастата!

А бальшавікі бачылі ў Астроўскім родную душу!

Гэта бясспрэчна.

Чалавек не стомлены прынцыпамі, — Радаслаў Астроўскі заўсёды быў там, дзе былі грошы.

І пасля таго, як Беларускага Банка не стала, усё адно фінансы шырокай ракой плылі ў яго рукі, і ён распісваў іх на сваю жонку, на сваю дачку, на сябе…

От жа чытаю ў судовай паперы за 27 траўня 1927 г., што Астроўскі мае на тэрміновым укладзе 100 даляраў, а на бягучым рахунку 498 даляраў і 6699 злотых…

**9 чэрвеня 2011. Чацвер.**
**Менск.**

**Цалкам кнігу можна будзе прачытаць у часопісе «Дзеяслоў»**

ВІДАРЫСЫ

# ДРЭВА, або ШТО БЕЗ КОРАНЯ — НЕ РАСЦЕ

Алесь ПАШКЕВІЧ

## А

…У класе чацвёртым ці пятым атрымаў я двойку. Першую і, спадзяюся, апошнюю ў жыцці. Двойку па мове.

Пачыналася вясна, абуджалася зяленіва, і ў слупок з адушаўлёнымі назоўнікамі я шчодра ўпісаў і бярозу з дубам. А яны, аказваецца, як цвердзіла школьная грамата, прадметы неадушаўлёныя, г.зн. нежывыя.

Аніяк не цяміла мая галава, чаму яно так і чаму назоўнік «труп», наадварот, — адушаўлёны…

Калі не вядома, што з'явілася першым — яйка ці курка, дык у супастаўленні чалавек/дрэва ўсё зразумела. Таму, натуральна, хто ўжо злез з апошняга.

А першымі тое, па-мойму, зрабілі друіды — паэты-жрацы старадаўніх кельтаў. І з тысячагоддзе не дажылі, каб спартызаніць немцаў-нацыстаў, па загадзе якіх выразалі сотні дубоў за вёскай маіх набушаўскіх дзядоў, а разам з тымі нацыстамі дапартызаніць і дрэвасекаў развітога сацыялізму, якія збаёдалі не адну прыпяцкую дуброву.

Друіды нашмат болей за нашых настаўнікаў кумекалі і ў пытаннях педагогікі, хоць — па шчырасці — іхнія альмаматэры праходзіць не хацелася б: кандыдатаў у друідскую касту чакала ў пагудасе-лесе выпрабаванне адзінотай (каля 20 гадоў жылі і навучаліся яны ў святых пушчах). Затое з маіх мрояў аніяк не можа выблытацца сухаваты белабароды жрэц, які на шосты дзень маладзіка вядзе да аграмаднага вяза двух белых быкоў, завязвае ім рогі і ўзлазіць на вузлаватыя галіны; залатым сярпом — як месяцам — зразае крыважэру-амялу, кладзе ў свой белы хітон; злятае на зямлю і ў спевах суродзічаў тым жа сярпом перацінае быкам гарлякі. Змочаная ў ахвярнай крыві амяла пасля таго станавілася цудадзейнымі лекамі, магла ратаваць нават ад наймоцнай атруты, толькі ж мне трызніцца іншае: барадаты друід пытлюе той амялой-венікам то немцаў-нацыстаў, то дрэвасекаў развітога сацыялізму, то маю настаўніцу мовы, а то і — часцей — мяне самога…

Хрысціянства таксама паўставала на дрэве. Крыж, на які распялі Збаўцу, асіна, на якой павесіўся Юда…

І ўсё жыццё чалавек — з пакалення ў пакаленне — з дрэвам і ў дрэве: ад матчынай калыбкі да лёсавай труны.

І радавод ягоны — ад каранёў да кроны — таксама выяўляецца ў форме дрэва.

## Б

У ВЁСЦЫ мы патанаем у садах, кустах, лясах, аднак не заўважаем дрэў — як тое, што было, ёсць і будзе. Не вітаем тых, якія не прыносяць пладоў. Гонім іх (нібыта ў нас абуджаецца цяжкая памяць трыполля, калі далёкія продкі мусілі адваёўваць у лясоў сваю жыццёвую плошчу: рэзаць, карчаваць, паліць — і вырошчваць на тым хлеб). Старая суседка, якая адолела за зіму два інсульты, з цяжкасцю даклыпала да майго плота і, заўважыўшы каля яго мятровы дубец клёна-самаростка, шчыра-клопатна раіць: «Абламі яго, а то вырасце»…

Мы не заўважаем іх — акрамя, хіба што, некаторых знакавых, памятных. Як тыя два вязы, пасаджаныя каля маёй бацькоўскай хаты яшчэ маім прадзедам. Іх два аграмадныя маякі доўга паказвалі мне дарогу на родны прычалпадворак. Адхаваўшы пад сваім летнім ценем чатыры пакаленні Пашкевічаў і адспяваўшы ім пад акампанемент зімовых завей начныя калыханкі, яны памерлі. Памерлі таксама — як і належыць — знакава і памятна. Бацькі пераехалі жыць да майго брата, падворак асірацеў, і ў бязветраную ноч адзін з вязоў…

«Школьная» мова не дазваляе развесці іх па полавай прыналежнасці, хоць я з маленства атаясамліваў тыя дрэвы і па роду (за што мог бы «схлапатаць» яшчэ адну двойку). Атаясамліваў і дзяліў іх на «яна» і «ён». Яна — вязыня — была больш шацістая, а знізу, паміж ствалом і карэннем, мела глыбокае дупло, у якое я доўга баяўся што-небудзь хаваць… Пазней даведаўся, што ў вязавай сям'і — некалькі дзясяткаў відаў, а ў свеце іх наогул завуць па-рознаму: ільм — ад яшчэ кельцкага «elm», па-латыні ulmus; на славянскішчыне яшчэ — і берэст, і карагач, і ільмавік. Але мова чамусьці не развяла дрэвы па полавай прыналежнасці, не падзяліла (як і большасць раслінаў) на пары. Хай бы б, здавалася, кветкі гермафрадзіцыліся сабе ў песціках ды тычынках… А дрэвы? Ці ўсё ж не мова ў тым вінаватая, а — закладзеная ў ёй міфалагічная памяць? Мама сполашна забараняла мне, падлетку, садзіць меншыя за мяне дрэвы-«мужчыны» (клён, дуб…), бо — казала — яны забіраюць рост. Тады я не вызначаўся даўжынёй, і — як ні карцела — не парушаў загад.

Мова вінаваціць ва ўсім прыроду, у сваё апраўданне прыводзячы зборна-сямейныя супрацьпастаўленні: яна-хвоя — ён-хвойнік; ён-дуб — яна-дуброва; яна-бяроза — ён-беразняк…

…Дык вось, калі набушаўскі падворак асірацеў, у бязветраную ноч вязыня ўпала. Акурат на комін, пасярод даху. І разваліла б сваім шматтонным целам хату, калі б не вяз, які рос на крокаў пятнаццаць бліжэй да сцяны. Ён і прыняў сяброўку на свае стогадовыя рукі ды на развітанне абняў яе — так моцна, што ў самага магутнага раённага крана, калі сіліўся падняць і пакласці вязыню на вуліцу, зламалася страла.

А вяз засох у адзіноце на другую вясну — і яшчэ доўга раскідваў над вёскай свае безлісцёвыя галіны, пакуль знайшліся штукары распілаваць яго ды спусціць на зямлю.

Ані каліва ягонага я не змог ні парэзаць, ні спаліць…

## В



У ГОРАДЗЕ мы не тонем у садах, кустах ды парках, аднак бачым дрэвы — як тое, чаго не было, няма і не будзе…

Першую сваю кватэру «па чарзе» ў Саюзе пісьменнікаў у 1996 годзе я атрымаў ад бацькі-прэзідэнта. Так, гэта раней ва ўсёй гісторыі СП яго членам жыллё давала дзяржава: ці сталічнагарадское, ці сібірска-барачнае. А цяпер першы прэзідэнт Рэспублікі Беларусь распарадзіўся забраць дом, які будаваўся для парламентарыяў, і аддаць яго творчым работнікам. Не толькі распарадзіўся, але і асабіста прымаў яго «здачу». Сам зайшоў праверыць — акурат у мой будучы пад'езд — якасць тынкоўкі ды паклейкі шпалераў. А з ім — і тагачасны міністр культуры з драўляна-памятным прозвішчам Сасноўскі. Міністр у прапагандысцкім запале доўга распавядаў журналістам пра незвычайныя дзівосы ўбачаных ім «творчых» кватэраў: «усё новенькае, усё зіхціць… нават замочкі на паштовых скрынях з ключыкамі…».

Мой родны бацька пасля таго быў перакананы, што паркет на сынавых метрах як мінімум пазалочаны, аднак не бедаваў, убачыўшы звычайную старую планіроўку ды мутнаваты лінолеум. Ані грама, дапіваючы на ўлазінах з сябрамі трохлітровік вясковай самагонкі, не шкадаваў аб тым і я. І быў, натуральна, удзячны ўсім — ад бацькі роднага да бацькі прэзідэнцкага (хоць і ведаў, што дом у аніякіх парламентарыяў не адбіраўся, як потым пацвердзіў тагачасны спікер Вярхоўнага Савета Мечыслаў Грыб; народным абраннікам узвялі даміну зусім па іншым праекце над Свіслаччу — нашмат бліжэй да цэнтра, там тая «прэзідэнцкая» ў Малінаўцы). Быў, паўтараюся, удзячны, хоць размова — не аб тым.

А — пра дрэвы. Якія аж трашчалі ў колішняй вёсцы Малінаўка і якіх не стала ў новаўзведзеным на тым месцы аднайменным мікраraёне. Зрэзалі старыя сады ды прысады — і каля новых каменных сценаў і цяпер — праз дзесяткі гадоў — анічога толкам не расце. Збульдозерылі пласт вясковага чарназёму, угноены вясковым клопатам і потам — а на пустым пяску нават кусты не галіняцца. Як і тыя дубцы, якія будаўнікі ці жэсаўцы, дачуўшыся пра прэзідэнцкую праверку, імпэтна садзілі ў замерзлую зямлю. Перад домам ломам прабівалі дзіркі ды, як аловак завастрыўшы ствол ік клёніка ці ліпкі, уганялі ў жоўты гравій. А вясной навасёлы дзівіліся, чаму ўраз тыя прысады засохлі. Некаторыя неразумныя апазіцыянеры (і такія прабіліся тады ў кватэрную чаргу па ордэры) зубаскалілі, што дрэўцы кеўкнуліся ад злоснага вока высокага інспектара, але ж мы яшчэ са школы ведаем: тое, што без кораня — не расце…

Не расце ўжо і яблыня-малінаўка над вырытым катлаванам, з якога пачалося будаўніцтва чарговага шматкватэрніка побач. Высільвалася па вясне яшчэ накінуць на сябе хаўтурны вэлюм з квецені — ды так і абвалілася ў кар'ер-дамавіну. У якую я паспеў укінуць свой амаль школьны вершык:

*Кар'ера вузкая дамоўка*
*уаксамічана зімой.*
*Старая яблыня-вяскоўка*
*укленчыла перада мной…*

*Вакол — хрыбты мікраraёна,*
*выратавальны сонца круг*
*і госці: хворая варона*
*ды адзінокі вецер-зух.*

*А ноччу — сніць каля магілы,*
*як малады ійшчэ гаспадар*
*на месяца двузубец-вілы*
*збірае копы вогкіх хмар, —*

*нябёсы знічкамі засее*
*і жменю зорачак-зярнят*
*малінаўкі мядова-спелай*
*пасадзіць ля каменных хат.*

Сны — снамі, а ў рэчаіснасці бульдозеры дабраліся і да высозных вербаў ды алешын за недалёкай кальцавой. А яшчэ нядаўна з іх травеньскіх шатаў да вокнаў маёй малінаўскай кватэркі даносіліся салаўіныя спевы! Аднак не да пацераў… То бок — не да спеваў, калі дарогу пашыраюць…

Адляцелі салаўі, а за імі і я — на іншую кватэру, крыху большую, цішэйшую ды бліжэйшую да цэнтра. І пакуль «чэсныя» сарокі на сваіх руплівых хвастах разносяць чуткі аб тым, што я пабудаваў пентхаўз у элітным раёне (з гаражом і саўнай) ды з паркетнага кабінета скваліна пазіраю на пасольскія асабнякі, пад маімі лоджыямі на чацвёртым паверсе шыхтом-ланцугом растуць і пераўзыходзяць паверх злева направа: нестары вяз (з падрэзанымі жэсаўскай пілой галінамі), задуменная ліпа, падшыванец ясень, дзве гонкія бярозы, каржакавата-разлапістая акацыя (белая), пенсіянерка-вярба, апатычная сліва, абрыкос-асілак, два двухпавярховыя букеты бэзу (белы і фіялетава-ружовы) ды дванаццацімятровая елка (каржакаватыя дубцы туі, вішні ды язміну не згадваю). Растуць яны сабе хораша ды мяне цешаць. А яшчэ — і некаторых прадстаўнікоў нашага мірнага электарату, якім заманецца то бэзу адламаць, а то — як у вясковым садзе — натрэсці на закусь абрыкосаў: балазе растуць яны, не раўнуючы, з кулак.

А дзякуючы прэзідэнту і ягонаму штодзённаму клопату аб дабрабыце мінчанаў неўзабаве недалёка ад дома з абрыкосам з'явіцца новая станцыя метро. І салаўі зноў збіраюцца ў эміграцыю, перад якой паспелі наспяваць мне аб тым, што каля Адміністрацыі прэзідэнта з каштанаў дбайныя зелянгаспаўцы зразаюць квецень. Маўляў, дбаюць пра чысціню ходнікаў. Бо напачатку асыпаюцца — куды вецер вее — пялёсткі, а за імі — і каштаны-лімонкі…

Думаю, што гэта — яшчэ адна вылазка ці дрэвавікоў-нацыстаў, ці лесасекаў так і не развітага сацыялізму, пра што збіраюся неадкладна напісаць кіраўніку дзяржавы. Ён, колішні вясковец, павінен пашкадаваць пасаджаныя яшчэ ці не пры Машэраве каштаны, з якіх па загадзе ягоных зялёншчыкаў-апрычнікаў робяць гермафрадытаў, ці па-сучаснаму — кастратаў. Калі ж той ліст не перададуць адрасату альбо паважаны рэспандэнт не пачуе мой клопат — і ім прысніцца сівы друід з вострым сярпом.

Бо хто нішчыць кветкі — не прычакае пладоў.

## …Я

Калі ад аднаго з кіраўнікоў «чэснага» Саюза пісьменнікаў пачуў плётку аб маім хатнім кабінеце з выглядам на дыпламатычны корпус, чамусьці ўсплыла згадка пра апеты Адамам Міцкевічам у «Пане Тадэвушу» кабінет майго даўняга аднафамільца пісьменніка і краязнаўцы канца XVIII — пачатку XIX стагоддзяў Дзяніса Пашкевіча, абсталяваны ў жарале паганскага дуба, у якога было нават сваё імя:

*Маёй радзімы дрэвы!*
*Неба мо адкрые*
*Яшчэ мне к вам дарогу.*
*О, сябры старыя,*
*Ці вас тады застану?*
*Помню, як раслі вы,*
*А я вакол вас поўзаў у свой час*
*шчаслівы.*
*Ці той Баўбліс расце,*
*старэча дуплаваты,*
*Ў якога ў жарале, не меншым*
*добрай хаты,*
*Дванаццаць чалавек за стол*
*сядала ўкола?*
*Ці ёсць Міндоўгаў гай ля фарнага*
*касцёла?*
*(Пераклад Пятра Бітэля.)*

На жаль, разам з касцёламі і цэрквамі на нашай з Міцкевічам радзіме нішчылі і гаі з пушчамі. А таму ў класе чацвёртым ці пятым атрымаў я двойку. Першую і, спадзяюся, апошнюю ў жыцці. Двойку па мове, калі адушаўлёнымі назваў і дрэвы. Аднак і дагэтуль упарта ўважаю не сваёй ці не найвышэйшай адзнакай. Прынамсі, у тым не запярэчылі б мне і пракаветныя друіды, і мае набушаўскія дзяды.

І я, супакоены тым — цьфуцьфу — стукаю па дрэве…

2010

РОЗДУМ

# ПРАГА СВЯТЛА І ВЫСОКАГА СЭНСУ

Вераніка СТРАЛЬЦОВА

**Ала СЯМЁНАВА. У святой краіне выгнання: імпрэсіі, адлюстраванні / Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка», выпуск 10. — Мінск: «Кнігазбор», 2011. — 488 стар.**




...«Імпрэсіі і адлюстраванні» — вольнае вызначэнне жанравай прыроды кнігі паводле самога аўтара. Белетрызаваная аўтабіяграфія «Святло загадкі» — узор арганічнага спалучэння псіхалагічнай, інтэлектуальнай і дакументальнай прозы.

Нягледзячы на бясспрэчную аўтабіяграфічную аснову, было б памылкова расцэньваць фактычныя сыходжанні ў кнізе літаральна: лініі лёсу галоўнай гераіні і аўтара далёка не заўсёды супадаюць. Белетрызацыя тэксту адбываецца за кошт злучэння біяграфічных рэалій з элементамі мастацкай апавядальнасці. Адзінствам аўтарскай задумы знітаваны розныя спосабы светаспасціжэння: сюжэтны і аналітычны, спавядальны і нораваапісальны, а вынаходлівыя пераключэнні з вобразнага плана ў паняційны, з адцягненага ў побытавы надаюць твору аб'ём і глыбіню. Яго жанравая прыналежнасць досыць няўлоўная. Сапраўды, як згарнуць у адно вызначэнне калаж факта і роздуму? У ім спалучаюцца публіцыстыка і лірычна-паэтычныя замалёўкі, алюзіі і ўласныя назіранні з галіны псіхалогіі і сацыялогіі, чыстыя і схаваныя цытаты, эстэтычна-філасофскія моманты і блізкія да нарысаў нораваў побытавыя замалёўкі. А. Сямёнава шырока выкарыстоўвае магчымасці эсэістычнай прозы, але арыентуецца яна не на ўсходнееўрапейскую і нават не на агульнаславянскую, а на заходнееўрапейскую традыцыю, звязаную з імёнамі Г.Гесэ, А.Маруа, Д.Ійеша. Гэты (міжрэгіянальны) тып мастацкага ўзаемадзеяння досыць рызыкоўны, бо часта вядзе да «правалаў» у эклектыку. Але аўтар, здаецца, шчасліва ўнікае гэтай небяспекі. Не апошнюю ролю тут адыгралі, відаць, асаблівасці выхавання самой пісьменніцы, яе сямейныя карані, якія абумовілі арыентацыю не толькі на беларускі і расійскі, а і на польскі варыянт культуры, і на заходнееўрапейскі — у яго, так бы мовіць, рознакалёрных і рознасвядомасных варыяцыях.

Як вядома, лепш за ўсё пра пісьменніка могуць расказаць яго кнігі. І гэта абсалютна справядліва ў адносінах да «Святла загадкі». Адмысловая мазаіка ўражанняў юнай гераіні — гэта, відавочна, перш за ўсё вопыт дзіцячых перажыванняў самой аўтаркі. Паходзячы з сям'і юрыстаў і па волі лёсу маючы ў сваім штодзённым асяродку людзей тонкай душэўнай арганізацыі (маці, арыстакратычна-вытанчаная пані Магда, законніца-назарэтанка сястра Малгажата і інш.), пісьменніца з ранняга дзяцінства атрымала досыць рэдкую на той час магчымасць сістэматычнага маральнага і культурнага настаўніцтва.

Уводзячы чытача ў свет сваёй гераіні, аўтар з першых жа старонак пераходзіць да адкрытага разгляду пытанняў духоўнага жыцця, веры і веравызнання. Гераіня А.Сямёнавай (размова ідзе пра пасляваенныя гады) зусім непадобная на знаёмых нам па творах сацыялістычнага рэалізму ваяўнічых змагароў за шчасце і лепшую долю. Сапраўды, з пункту гледжання псіхалогіі ўчынку і дзеяння вельмі дзіўнай выглядае такая вось мадэль паводзін: «Трымайся!» — згадвала Дана пані Магду, калі было скрушна і крыўдна, калі рамантычныя мроі раструшчваліся безапеляцыйнай рэчаіснасцю. І брала мудрую кнігу і чытала. Відавочна, што гераіня А. Сямёнавай — перш за ўсё чалавек думкі, сузірання, якому чужая агрэсія спрошчаных уяўленняў пра сутнасць светапабудовы і для якой галоўная кніга — Біблія.

Аповесць-эсэ «Святло загадкі» — вельмі важная з'ява ў творчай біяграфіі А.Сямёнавай. Менавіта тут — ключ да разумення гэтай неардынарнай мастацкай індывідуальнасці. І хаця твор не вырашае ніякіх праблем, не заклікае да спрэчак, ён запрашае да роздуму. Аптымістычны лейтматыў абумоўлены настроем думкі аўтара. Менавіта гэта жывіць і акрыляе тэкст. А ўдала выкарыстаныя гумар і іронія дазваляюць пераканаўча прымеркаваць высновы духу да зямной рэчаіснасці. А.Сямёнава змагла ўбачыць у канкрэтным — сімвалічнае, у асабістым — агульназначнае. Здолела быць адначасова ў будзённасці — і над ёй. І сказаць пра ўнутраны свет чалавека сваё і па-свойму.

Падкрэсліваючы выразны інтэлектуальны пачатак твораў пісьменніцы, нельга не сказаць: проза А. Сямёнавай — гэта яшчэ і эстэтычная проза. З'ява, якую не пабаюся назваць даволі рэдкай у нашым нацыянальным прыгожым пісьменстве. Філасофія, мастацтва, літаратура, тэатр, кінематаграфія, гісторыя, архітэктура, пластыка, феерверкі імёнаў, назваў, напрамкаў і стыляў — адмысловае, нетутэйшае вязьмо, на якім трымаецца твор — безумоўна, чытво не для кожнага. У А. Сямёнавай свой чытач. І чытач зусім не масавы. Элітарны...

**З героямі сваёй эсэістычнай прозы і крытыкі Ала Сямёнава шукае праўду чалавечай душы, якая выпрабоўвае глыбіні і вышыні чалавечай існасці**

Героі аповесцяў і апавяданняў А. Сямёнавай упарта шукаюць адказы на пытанні духоўнага парадку, і зусім зразумела, што гэта тая быційная сфера, якая нязменна прысутнічае ў штодзённым жыцці аўтара. А інакш — ці магло б, напрыклад, з'явіцца на свет эсэ «Ззянне праўды», напісанае з нагоды выхаду ў свет беларускага перакладу кнігі-дыялогу «Пераступіць парог надзеі» (перакладчык Хрысціна Лялько)? У гэтым выключным па сваёй значнасці выданні змешчаны адказы Папы Яна Паўла ІІ на пытанні вядомага італьянскага журналіста Вітторыё Мэссоры. Узяўшыся за вырашэнне адказнай і складанай задачы: сказаць свае слова пра тэкст надзвычай высокага парадку і ўзроўню, А.Сямёнава відавочна рызыкавала: «ўзяць» такую вяршыню, ды ўпершыню ў беларускай літаратуры, сапраўды няпроста. (Першадрук рэцэнзіі належаў штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», калі галоўным рэдактарам быў светлай памяці сапраўдны паэт і бліскучы эсэіст Алесь Пісьмянкоў). А пісьменніца справілася з задачай, чарговы раз прадэманстраваўшы сурёзную філасофскую і тэалагічную дасведчанасць, уменне арганічна спалучаць магчымасці тэарэтычнага, аналітычнага і вобразнага мыслення.

Эсэ, пра якое ідзе размова, пазней было ўключана ў кнігу прозы «Таямніцы пакутны колер», што выйшла ў выдавецтве «Про Хрысто». Духоўная дамінанта гучыць у кожным творы гэтай кнігі. І той, што выйшла пазней — «Перад геніем лёсу», і той, што цяпер перад намі — «У святой краіне выгнання». Усё той жа сэнсавы рэфрэн, найперш самавызначэнне духоўнае, імкненне да святла, да высяў Нябёс. Здаецца, водгалас чароўнай нетутэйшай музыкі чуецца нават у саміх назвах твораў: «Тэрцыны траўня», «Я кварту восені вып'ю...»...

Можа, асабліва акрэслена гэтае самавыяўленне прачытваецца ў змешчаным у кнізе дыялогу з Галінай Шаблінскай. Пытанні вымагаюць адпаведных адказаў. І атрымоўваюць іх. (Нездарма, мабыць, у эфіры канала «Культура» дыялог быў паўтораны шэсць разоў!) У дыялогу вядзецца размова пра трывала выснаваную ў творчасці А. Сямёнавай лірычна-філасофскую канцэпцыю, паводле якой гармонія дадзенага не адмяняе гармоніі прымысленага, а хараство матэрыяльнага, рэчаўнага, прадметнага несупярэчліва суіснуе з хараством адчутага і прачутага на ўзроўні. Свет герояў А.Сямёнавай — не прагматычны. У ім няма «патрэбных» людзей, кан'юнктуры, кантактаў паводле карысці і разліку. Але відавочна існуюць тут кантакты духоўныя, інтэлектуальныя, знешне нібыта нічым не абумоўленыя, спарадычныя. Выпадковыя, выбуховыя. Але — прадвызначаныя глыбінным «кодам» асобы. Аўтара цікавяць не столькі факты, колькі актыўная духоўнасць, якая на ўзроўні тэксту праяўляе сябе як плынь свядомасці ці ўнутраны маналог. Падзейная лінія часта паслаблена, перавага аддаецца сутнасным дамінантам. У цэнтры ўвагі — хараство натуры, прыгажосць, створаная чалавекам, высакародныя, знешне і ўнутрана «паўнавартасныя» героі — часта ў няроўнай бойцы з драпежнай сілай прагматычнага, прымітыўна матэрыялізаванага свету. І — быццё як свята будзённага дня, у якім раскрываюцца глыбіні чалавечага існавання.

Гэта ў роўнай ступені датычыць і прозы, і эсэістыкі, і крытычных нарысаў А.Сямёнавай. Імпрэсіі і адлюстраванні... Можна ўявіць, як складана было аўтару выбраць у кнігу тэксты з крытычнай «дзялянкі»: У.Караткевіч, А.Адамовіч, Н.Мацяш, Р.Барадулін, Я.Чыквін, А.Разанаў, У.Арлоў, С.Дубавец, А.Пашкевіч, С.Пятровіч. Літаратары розных пакаленняў, розных творчых кірункаў. Побач з імі — людзі мастацтва, культуры, медыцыны. Напрыклад, Арыядна Ладыгіна — філасоф-эстэтык, спадчынніца старадаўняга добрага роду, пляменніца спявачкі Ларысы Александроўскай, альбо вядомая піяністка, лаўрэат шматлікіх міжнародных конкурсаў Ірына Шуміліна, ці таленавіты экскурсавод (некалі прызнаны як лепшы ў Беларусі), аўтар кніг і нарысаў па краязнаўству Анатоль Варава, побач з імі Тамара Кур'яновіч — не проста ўрач, а лекар ад Бога...

Розныя постаці, розныя творчыя малюнкі. І тая самая, ужо памянёная духоўная дамінанта. Мабыць, ёсць яшчэ адно, што лучыць некаторых з герояў А. Сямёнавай — рамантызм. Уласцівы самой пісьменніцы не толькі ў прозе, але і ў крытыцы. І ў гэтай кнізе выяўлены ў многіх творах, ці не найбольш пранізліва-шчымліва ў эсэ «На лініі далягляду, на вышыні палёту...», прысвечаным памяці мужа...

Шчырая зацікаўленасць жыццём нацыянальнай літаратуры была адпачатку ўласцівая творчай натуры Алы Сямёнавай. Крытыка для яе ніколі не была спосабам заробку ці палітыкай прадуманых кан'юнктурных хадоў. Зусім не. Яна — аўтар надзвычай незалежны. Можа, менавіта ў гэтым трэба шукаць разгадку таго, што апошняя кніга крытыкі (пры актыўным удзеле аўтара ў літаратурным працэсе) выйшла чвэрць века таму. Новая кніга яе літаратурна-крытычных эсэ «Гульні эпохі» толькі падрыхтавана да друку. Будзем спадзявацца — знойдзецца і выдавец...

А пакуль (ці затое?) мы маем гэтыя імпрэсіі і адлюстраванні — нядаўна выдадзеную кнігу «У святой краіне выгнання». Розныя жанры, разнастайная творчая палітра. Разам з героямі сваёй эсэістычнай прозы і крытыкі Ала Сямёнава шукае праўду чалавечай душы, якая выпрабоўвае глыбіні і вышыні чалавечай існасці. «Кожны з нас, — разважае Ала Сямёнава, — так ці інакш — спасцігае таямніцу Быцця: задумваючыся над вялікай загадкай ці падсвядома далучаючыся да яе. Святло гэтай загадкі — можа, найбольш яркае і незамглёнае ў дзяцінстве і юнацтве. Але промні таго святла адчуваюцца ўсё жыццё...».

Гэтыя промні свецяць і нам. Кнігі Алы Сямёнавай цікава чытаць і хочацца перачытваць. У іх — прага Святла і Высокага Сэнсу, якія шукае і па якіх сумуе жывая чалавечая душа.

ІНТЭРВ'Ю

# Віталь Рыжкоў: «МОЙ ШЛЯХ САМУРАЯ»

**Віталь Рыжкоў — паэт, перакладчык. Фіналіст конкурсаў Беларускага ПЭН-цэнтра, прысвечаных стагоддзю газеты «Наша Ніва» (2007), конкурса імя Карласа Шэрмана (2009). Пераможца трох паэтычных слэмаў у Беларусі і Украіне, лаўрэат прэміі часопіса «Дзеяслоў» «Залаты апостраф» (2008), літаратурнай прэміі «Дэбют» імя Максіма Багдановіча, заснаванай Саюзам беларускіх пісьменнікаў і Беларускім ПЭН-цэнтрам. Аўтар кнігі паэзіі «Дзверы, замкнёныя на ключы». Жыве ў Мінску.**

**Увазе чытачоў «Літаратурнай Беларусі» прапануюцца фрагменты дзьвюх гутарак паэта — магілёўскаму сайту www.222.by і бюлетэню «Кнiганоша».**



***www.222.by: — Твая першая аўтарская кніга, зборнік вершаў «Дзверы, замкнёныя на ключы». Якая яна?***

**Віталь Рыжкоў:** — Кніга мае назву «Дзверы, замкнёныя на ключы» — па назве аднаго з тэкстаў, што ў ёй змяшчаюцца... Да папяровай версіі дададзены аўдыёдыск з запісамі выбраных вершаў і перакладаў, зрэжысаваны Дзмітрыем Дзмітрыевым. У яе афармленні ўзялі ўдзел два мастакі: беларуска Васіліса Паляніна зрабіла ілюстрацыі да некаторых вершаў, амерыканец Біл Карман дазволіў выкарыстаць свае малюнкі для вокладкі. Як і любая першая кніга, яна, можа быць, дастаткова няроўная: вершы, абраныя для яе, былі напісаныя ў перыяд з 2002 па 2010 год. Па вялікім рахунку, гэта дзве мае кнігі ў адной — не толькі праз наяўнасць аўдыёдадатку: мае вершы падзеленыя на дзве часткі (трэцюю склалі пераклады іншых паэтаў). Першая — вершы, напісаныя ўжо ў Мінску, другая — тое, што не раз чулі ў Магілёве, а трэцяя — харошыя паэты ў маіх перакладах (Сяргій Жадан, Гага Нахуцрышвілі, Рышард Крыніцкі, Уістан Х'ю Одэн ды іншыя).

***www.222.by: — А чым матываванае ўключэнне ў кнігу блоку перакладаў? Здавалася б, першая аўтарская кніга... Не было жадання выдаць больш сваіх рэчаў?***

**В.Р.:** — Усё проста: калі ты не толькі паэт, але і перакладчык, ты і друкуеш не толькі ўласныя вершы, але і пераклады. З уласнага матэрыялу, сабранага за восем гадоў, было выбрана для кнігі каля паловы — 35 тэкстаў, толькі найлепшае; не варта паддавацца кепскай тэндэнцыі публікаваць у кнігах сваю кожную патрэбу распісаць асадку! (смяецца)

***www.222.by: — А з якой мэтай зроблены мультымедыйны дадатак? Ці моцна адбілася яго наяўнасць на цане кнігі? І калі пайшла пра гэта гаворка, ці могуць набыць выданне ў абласных крамах і колькі грошай ім для гэтага спатрэбіцца?***

**В.Р.:** — Час не стаіць на месцы: аўдыёкнігі ўжо даўно занялі сваю нішу сярод спажывецкай літаратуры. Не паглыбляючыся асабліва ва ўсе «за» і «супраць», скажу, што лепей так, чым аніяк. Як у аўтара, што даволі шмат выступае ўжывую з вершамі і перакладамі, у мяне абсалютна не было ваганняў — быць альбо не быць дыску пасля паступлення прапановы. Істотнага павелічэння цаны дыск не стварае, бо каштуе літаральна каля 10% ад агульнай сумы. Што да беларускіх кнігарняў, тут праблемы: у іх у асноўным трапляюць кнігі толькі «правільных» беларускіх пісьменнікаў — па лінейцы распаўсюду «Белкнігі». Незалежная літаратура ў нас распаўсюджваецца, як марыхуана ў Еўропе — поштай, у незалежных распаўсюднікаў і з рук у рукі на прэзентацыях :).

***www.222.by: — Ты даволі малады аўтар, аднак вядомы шырока... Ёсць куча паэтаў, якія могуць толькі марыць пра гэта. Дык што гэта — проста ўдача, нечаканы паварот лёсу ці вынік праведзенай працы? Як трэба «стаць» маладому аўтару, каб адноўчы патрымаць у руках сваю кнігу?***

**В.Р.:** — Мне складана даваць нейкія парады — універсальнай формулы тут не можа быць, і гэта добра. Мой шлях самурая, як на мяне, даволі дзіўны і выпадковы. У 2002-м (да гэтага яшчэ гады тры па-руску) я пачаў пісаць па-беларуску так, як умеў і як падабалася найперш мне самому, але ў мяне і думкі не было, што гэта калі-небудзь каму-небудзь спатрэбіцца. Так гэтыя вершы ляжалі сабе ціха-ціха ў маёй памяці да 2005-га, пакуль я ў пэўным сэнсе выпадкова і даволі ўдала не ўзяў удзел у паэтычным конкурсе для пачаткоўцаў... Тады неяк усё завярцелася-закруцілася — прычым у асноўным неяк па-за маім удзелам, я толькі прыходзіў і чытаў вершы ў розных месцах. Праз год чытаў вершы ў Мінску, праз два — у Маскве і Кіеве, праз тры — у Вільні. Вядома, за гэта ўсё я ўдзячны добрым людзям, якім падабалася тое, што я пішу...

***www.222.by: — У Беларусі, калі я правільна разумею, два паралельныя літаратурныя працэсы: афіцыйны і рэальны. Афіцыйны, падобна, застаўся нам ад саўка, пераняўшы ўсе яго механізмы: чэргі на выданне, саюзы пісьменнікаў і г.д. Нават не ведаю, ці даюць ім пуцёўкі на якія-небудзь пісьменніцкія дачы. А рэальны літаратурны працэс — нейкі стыхійны рух, плынь выводзіць на паверхню нечаканыя для афіцыйнай літаратуры імёны. Не было жадання стаць прызнаным у гэтай «афіцыйнай» літаратуры? Не хацелася мець права разлічваць на дывідэнды ад дзяржавы?***

**В.Р.:** — Так, Беларусь — краіна двух пісьменніцкіх саюзаў. Дзяржаўны пад кіраўніцтвам Чаргінца і недзяржаўны на чале з Алесем Пашкевічам, ёсць яшчэ Беларускі ПЭН-цэнтр і «Полоцкая ветвь». Справядліва будзе заўважыць, што рэальны літаратурны працэс так ці інакш адбываецца па ўсіх франтах — гэта складаны кактэйль па формуле «маем тое, што маем». Ёсць харошыя творцы і рускамоўныя, і беларускамоўныя, і ў дзяржаўным, і ў недзяржаўным саюзах — я б не наважыўся займацца сегрэгацыяй па партыйных упадабаннях, маўляў, хтосьці займаецца літаратурай, а хтосьці сядзіць на дачы. У любым разе, я на дадзены момант не з'яўляюся сябрам ніводнай з пералічаных арганізацый і не збіраюся; хоць і зразумела, з якімі з іх я, скажам, салідарны — мая хата не на ўскрайку стаіць, калі казаць пра эстэтычную і грамадзянскую пазіцыі. Недзе з год таму я апынуўся ў кампаніі шведскіх пісьменнікаў — сябраў міжнароднага ПЭН-клуба — сябраў Саюза Пашкевіча і сябраў Беларускага ПЭН-цэнтра, дзе акурат паўстала пытанне пра ўступленне ці неўступленне ў аб'яднанні. (Моладзь цяпер і ў Еўропе не жадае нікуды ўступаць — і старэйшых літаратараў гэта бянтэжыць). Дык вось, пытанню, якое магло б прагучаць і з маіх вуснаў: «А што мне дасць уступленне ў саюз — як гэта палепшыць якасць маёй літаратуры альбо жыцця?» — супрацьстаяла жорсткае: «Ты павінен думаць, што ТЫ дасі саюзу!». Робіцца сумна ад думкі, што ўсе твае творчыя эксперыменты і напрацоўкі насамрэч — унёсак не ў літаратуру, а ў штосьць іншае. Як, напрыклад, ты не можаш ажаніцца з дзеўкай па каханні праз тое, што ты радыкальна іншага веравызнання — вось і кахаешся з ёй дзеля Кахання паза шлюбам :). Але хто ведае, што мне стукне ў галаву, калі я буду не такі малады і дзёрзкі? :)

### «АЎДЫЁДЫСК — ДРУГАЯ КНІГА...»

***Алесь САЧАНКА, «Кнiганоша»: — Шаноўны Віталь, віншуем з атрыманнем літаратурнай прэміі Саюза беларускіх пісьменнікаў і Беларускага ПЭН-цэнтра «Дэбют» імя Максіма Багдановіча ў намінацыі «Паэзія» — за дэбютны зборнік! Што, на вашую думку, гэтая прэмія дае маладым літаратарам?***

**Віталь Рыжкоў:** — Дзякуй за віншаванні. Маладым літаратарам, якія не атрымалі прэмію, гэта дае (часам — патрэбны, часам — не) імпэт, каб выдаць першую кнігу, бывае, што дае белую альбо чорную зайздрасць (залежыць ад літаратара) да тых, хто яе атрымаў. Апошнім — (камусьці патрэбныя, камусьці — не) увагу, грошы і думкі пра тое, як і што рабіць далей.

***«Кнiганоша»: — У вашую дэбютную кнігу «Дзверы, замкнёныя на ключы» ўвайшлі вершы, напісаныя за 8 гадоў. Чаму вы так доўга не адважваліся выдаць першую кнігу і як адбіралі вершы для яе?***

**В.Р.:** — Калісьці я паабяцаў сабе выдаць кнігу, якой буду задаволены як мінімум на 90 адсоткаў. Ну а далей такая схема. У пэўны момант высветлілася, што ёсць каля 20 вершаў, якімі я быў збольшага задаволены. Праз год ад іх засталося каля 10. Потым яшчэ менш. Так адбывалася некалькі гадоў. Нельга сказаць цяпер, што матэрыял кнігі задавальняе мяне на тыя 90 адсоткаў. Але кніга выдадзеная і прадаецца — гэта важная прыступка, пасля якой многія знаходзяцца ў чымсьці накштталт канфузіі.

***«Кнiганоша»: — У кнізе ёсць аўдыёдадатак. Якую «функцыю» выконвае ён? У адным з інтэрв'ю Вы сказалі: «Думаю яшчэ пра музычную творчасць і раблю нават нейкія захады. Пакуль жа скааперуюся з цікаўнымі людзьмі, каб зрабіць беларускамоўны рэп, адрозны ад таго, што ёсць у Беларусі цяпер». Ці рэалізоўваецца гэтая задума? Калі чакаць дэбютны дыск?***

**В.Р.:** — Аўдыёдадатак выконвае функцыю другой кнігі, з адрознай кампазіцыяй і спосабам перадачы інфармацыі.

Задума з музыкай цяпер рэалізоўваецца пакрысе, але не ўсё ідзе так, як планавалася — што там атрымаецца, яшчэ пакуль няясна. Трэба як мага хутчэй спекчы свой «першы блін» і спакойна рухацца далей. Нейкія папярэднія вынікі будуць бачныя і, магчыма, прадстаўлены ўвосень. Але, як прынята ў музыцы, пад творчым псеўданімам; ды і я прывык раздзяляць усё ж розныя кірункі сваёй «дзейнасці» адно ад аднаго.

***«Кнiганоша»: — Ваш «Чарнабелы верш» даўпачатак цікаваму відэапраекту пад такой назвай, што рэалізуецца пад дахам грамадска-культурніцкай кампаніі «Будзьма». З'ява для нас новая і незвычайная. А якія яшчэ ідэі вы плануеце ажыццявіць у бліжэйшай будучыні?***

**В.Р.:** — Я збіраюся ўсё ж напісаць кнігу, якая мяне будзе задавальняць на 90 адсоткаў.

ВОДГУК

# АД МІСТЫКІ ДА ПОСТМАДЭРНІЗМУ

**Ірына Шаўлякова. Сапраўдныя хронікі Поўні. Артыкулы і рэцэнзіі. Мінск, Літаратура і Мастацтва, 2011.**

Гэта кніга крытыкі з тых, што чытаецца, як інтэлектуальная проза. Ірына Шаўлякова мае свой непаўторны, пазнавальны стыль, вобразны, нават барочны, і ясную мэту: даказаць, што беларуская літаратура цікавая і канкурэнтаздольная. Пасля прачытання яе артыкулаў у гэтым сумнеў не ўзнікае.

Распавядае аўтар пра літаратурны працэс першага дзесяцігоддзя XXI стагоддзя, гэта значыць пра самае новае і цікавае, што адбываецца ў нашай літаратуры і пра што абсалютная большасць, на жаль, не падазрае. Нездарма Шаўлякова параўноўвае актуальнае беларускае літаратуразнаўства з... уфалогіяй. Сярод герояў кнігі – прадстаўнікі абдзеленага ўвагай крытыкі пакалення 40-гадовых: Алесь Бадак, Алесь Наварыч, Анатоль Казлоў, Андрэй Федарэнка, пакаленне 1990-х – Альгерд Бахарэвіч, Вера Бурлак, Віктар Жыбуль, Зміцер Вішнёў, Сяргей Прылуцкі...

Ад містыкі і гістарычнага рамана да постмадэрнізму і яго паслядоўнікаў. Аўтар упісвае ўсё гэта ў кантэкст сусветнай літаратуры, шчодра цытуючы філосафаў і паэтаў, дадаючы вобразнасці і парадаксальнасці ад сябе...

Сумна вам не будзе: сярод прычын, дзеля чаго трэба выдаваць такія зборнікі, названы пункт: «камусьці гэта прыносіць адрэналіну не менш, чым прагляд крымінальнай.

Л. Р.

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 2 верасня, пятніца

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.05** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Меладраматычны серыял «Маруся. Вяртанне» (Украіна). Заключная серыя.
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Меладраматычны баявік «Рысь».
**13.55** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультсерыял «Гара Самацветаў».
**16.00** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**16.50** Серыял «Маршрут літасці» (Расія). Заключная серыя.
**17.40** «Францыск, сын Скарынаў». Дакументальны фільм («Беларусьфільм»).
**18.40** Ведай нашых.
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** «Маладзечна-2011». Рок-канцэрт.
**23.20** Дзень спорту.
**23.30** Камедыйная драма «Залатая моладзь» (Вялікабрытанія).

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсерыйны фільм.
**12.05** «Дэтэктывы».
**12.40** «Таямніцы патанулых караблёў».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**19.00** «Хай кажуць».
**20.00** Нашы навіны.
**20.20** Футбол. Адборачны матч чэмпіянату Еўропы. Беларусь - Боснія і Герцагавіна.
**22.25** Фільм «Гол».
**00.30** Фільм «Апошні кадр».
**02.05** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**09.00** Фільм «Знаёмцеся: Дэйв». ЗША, 2008г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Халасцякі». Серыял. Закл. серыя.
**14.40** «Забойная сіла 6». Серыял.
**15.40** «Насланне». Серыял.
**16.50** «Я-вандроўца».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Кінаспатканне». ЗША - Швейцарыя, 2006 г.
**22.20** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** Фільм «Шызафрэнія». Расія, 1997 г.
**02.10** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Фільм «Вось і лета мінула…» («Беларусьфільм»).
**10.20** «Пра тое, як Колька і Пецька лёталі ў Бразілію». Кароткаметражны фільм («Беларусьфільм»).
**10.45** Гаспадар.
**11.10** «Проста хлеб». Дакументальны фільм.
**11.45** Час футболу.
**12.25** Рэальны свет.
**13.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
**15.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.30** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргенціна).
**17.25** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21. Адборачны раўнд. Беларусь - Боснія і Герцагавіна. Прамая трансляцыя.
**19.30** Лірычная камедыя «Прывітанне ад Чарлі-трубача» (Расія).
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.10** Трылер «Гульні д'ябла» (ЗША-Вялікабрытанія).
**00.10** Дыялогі аб рыбалцы.

**РОССИЯ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Прэм'ера. Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Галубка».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Прамы эфір».
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**21.30** Прэм'ера. «Юрмала-2011». Фэст гумарыстычных праграм.
**23.10** Навіны - Беларусь.
**23.20** Фільм «Моцная слабая жанчына». 2010 г.

**НТВ**

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «І зноў добры дзень!».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Вочная стаўка».
**11.15** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Таўро».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** «Пракурорская праверка».
**17.35** Прэм'ера. «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Вострасюжэтны серыял «Марскія д'яблы».
**21.20** Вострасюжэтны фільм «Дэн».
**23.10** Дакументальны цыкл «СССР. Крах імперыі».
**00.05** Прэм'ера. Баявік «Шлях клінка».

**EUROSPORT**

**04.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 7-ы.
**06.30** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 4-ы.
**08.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 4-ы.
**11.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 7-ы.
**11.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 6-ы.
**12.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 7-ы.
**15.45** Футбол. Еўра-2012. Навіны.
**16.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 13-ы этап.
**18.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень Агляд.
**20.15** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 5-ы.
**02.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 5-ы.
**03.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 8-ы.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** «Сонечная дзіда», серыял: 1 серыя.
**07.50** «Папялушка», тэлесерыял: 9, 10 серыі.
**08.40** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**08.55** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**09.25** Два на два (тэледыскусія): Віктар Марціновіч і Вячаслаў Бабровіч.
**09.50** «Генерал Клеэбэрг і яго жаўнеры», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**10.45** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**11.00** «Бяссрэбранікі», дак. фільм, 2009 г., Вялікабрытанія.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 4 серыя.
**12.35** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Першы дзень», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**13.00** «Сонечная дзіда», серыял: 1 серыя.
**13.25** «Папялушка», тэлесерыял: 9, 10 серыі.
**14.15** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.45** Два на два (тэледыскусія): Віктар Марціновіч і Вячаслаў Бабровіч.
**15.10** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**15.30** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**15.50** «Бяссрэбранікі», дак. фільм, 2009 г., Вялікабрытанія.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Чароўнае дрэва», серыял.
**17.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.45** Форум (ток-шоу): «Чаму маладыя людзі эмігруюць?».
**18.35** «Генерал Клеэбэрг і яго жаўнеры», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.05** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.40** Хто ёсць кім?: «Кастусь Шыдлоўскі».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Справа Фэрўэла», дак. фільм, 2009 г., Францыя: ч. 2, «Шпіён веку».
**22.20** «Пітбуль», серыял: 25 серыя.
**23.05** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.15** Аб'ектыў.

## 3 верасня, субота

**07.00** Існасць.
**07.25** Добрай раніцы, Беларусь!
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.40** «Славянскі базар-2011».
**10.50** «Сваты-3». Камедыйны серыял.
**12.10** Камедыйная меладрама «Афоня».
**13.50** Сінематэка.
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**16.50** Дак. цыкл «Атлас «Дыскаверы».
**17.40** Відэафільм АТН «Кармянская скарбніца» цыклу «Зямля беларуская».
**17.55** Ваша лато.
**18.45** Латарэя «Піцёрачка».
**19.20** Ведай нашых.
**19.30** Месца сустрэчы.
**21.00** Панарама.
**21.40** «Маладзечна-2011». Адкрыццё.
**23.25** Фантастычны трылер «Чацвёрты від « (ЗША-Вялікабрытанія).
**01.00** «Сваты-3». Камедыйны серыял.

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** Асяроддзе пасялення.
**12.10** «Ала Пугачова. Жыццё пасля шоў».
**13.10** Фільм «Восеньскі марафон».
**15.00** «Яўген Лявонаў. Страх адзіноты».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Ералаш.
**16.45** Фільм «Феномен-2».
**18.20** «Творчы вечар Ігара Мацвіенкі».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Здань оперы».
**22.15** Фільм «Уварванне».
**00.20** Фільм «Лепшы сябар майго мужа».

**07.15** «Анфас».
**07.30** «Гарачы лёд».
**08.00** Фільм «Кінаспатканне». ЗША - Швейцарыя, 2006 г.
**09.30** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**09.40** «Чыстая праца».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.00** «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**11.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**13.20** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.55** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**14.05** Фільм «Будзьце маім мужам». СССР, 1981 г.
**15.40** «Ваенная таямніца».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.35** Фільм «Жонка па кантракце». Расія, 2008 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**20.20** Фільм «Няверная». ЗША - Германія - Францыя, 2002 г.
**22.35** Фільм «Пікок». ЗША, 2009г.
**00.10** «Зорны рынг».
**01.10** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

**06.05** Прыгоды Агента 007. Фільм (ЗША-Вялікабрытанія).
**08.20** Жансавет.
**09.00** Дача здароўя.
**09.40** Лірычная камедыя «Прывітанне ад Чарлі-трубача» (Расія).
**11.20** Тэлебарометр.
**11.25** Нашы тэсты.
**12.00** Дыялогі аб рыбалцы.
**12.35** «Наша савецкае дзяцінства». Дакументальны фільм.
**13.10** Серыял «Маргоша» (Расія).
**16.55** Хакей. Кубак Беларусі. Фінал. Прамая трансляцыя.
**19.15** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
**21.00** КЕНО.
**21.05** Тэлебарометр.
**21.10** Прыгоды Агента 007. Фільм (ЗША-Вялікабрытанія).
**23.30** Канцэрт Celine Dion «Taking Chances World Tour».

**РОССИЯ**

**07.00** «Уся Расія».
**07.10** «Юрмала-2011». Фэст гумарыстычных праграм.
**08.50** Фільм «Шосты».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Моцная слабая жанчына». 2010 г.
**13.30** «Відавочнае-неверагоднае».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў». Аўтарская праграма.
**14.45** «Гарадок». Дайджэст.
**15.40** «Улада факту».
**16.25** Фільм «Тарпеданосцы».
**18.10** «Суботні вечар».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.40** Фільм «Лясун. Працяг гісторыі». 2010 г.
**00.20** Фільм «Чырвоны лотас». 2008 г.

**НТВ**

**07.35** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Выратавальнікі».
**08.50** «Медыцынскія таямніцы».
**09.25** «Увага: вышук!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**15.05** «Крамлёўскія дзеці».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Таямнічая Расія».
**17.25** «Вочная стаўка».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.25** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.05** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.00** «Ты не паверыш!».
**22.55** «Апошнее слова». Вострасюжэтнае ток-шоў.
**23.55** Крымінальны трылер «Законапаслухмяны грамадзянін».

**EUROSPORT**

**04.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 8-ы.
**06.00, 08.00, 09.30** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 5-ы.
**11.00, 12.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 8-ы.
**11.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 7-ы.
**15.45** Футбол. Еўра-2012. Навіны.
**15.55** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 13-ы этап.
**17.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 14-ы этап.
**18.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 8-ы. Агляд.
**20.15** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 6-ы.
**02.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 6-ы.
**03.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 9-ы.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** «Чароўнае дрэва», серыял.
**07.55** Калыханка для самых маленькіх.
**08.20** «Генерал Клеэбэрг і яго жаўнеры», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**09.15** Праект «Будучыня».
**09.45** «Справа Фэрўэла», дак. фільм, 2009 г., Францыя: ч. 2, «Шпіён веку».
**10.40** Форум (ток-шоу): «Чаму маладыя людзі эмігруюць?».
**11.30** «Забойства напярэдадні вясны», дак. фільм, Польшча-Беларусь.
**11.55** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**12.05** «Чароўнае дрэва», серыял.
**12.30** Калыханка для самых маленькіх.
**13.00** «Генерал Клеэбэрг і яго жаўнеры», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**13.55** Праект «Будучыня».
**14.25** МакраФон: «Басовішча-2007», канцэрт гурта «Крамбамбуля»: ч. 1.
**14.55** Хто ёсць кім?: «Кастусь Шыдлоўскі».
**15.10** «Згубленыя вакацыі», дак. фільм, 2006 г., Чэхія.
**16.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 3 сезон, 13 серыя.
**18.00** «Справа Фэрўэла», дак. фільм, 2009 г., Францыя: ч. 2, «Шпіён веку».
**18.50** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**19.20** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Англійская для дзяцей.
**19.45** Госць «Белсату».
**20.05** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** «Лебядовыя гады», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**21.50** Суботні сеанс: «Увага, дзверы зачыняюцца», маст. фільм, 1998 г., Вялікабрытанія–ЗША.
**23.25** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 1 серыя.
**00.10** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**00.20** Аб'ектыў.

## 4 ВЕРАСНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**07.05** Дак. фільм «Кандрат Крапіва».
**07.35** «Расклад на паслязаўтра» («Беларусьфільм»).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**09.55** Фартыфікацыя.
**10.35** Відэафільм АТН «Кармянская скарбніца « цыклу «Зямля беларуская».
**10.50** «Сваты-3». Камедыйны серыял.
**12.10** Меладрама «Мужыкі» (СССР).
**13.55** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Прэм'ера. «Аўгустоўскі канал». Дакументальны фільм.
**15.50** Меладрама «Чужыя душы» (Украіна).
**17.30** Відэафільм «Белаграпрамбанку» - 20 гадоў».
**18.10** Суперлато.
**19.20** Камедыйны баявік «Таксі-2» (Францыя).
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** «Маладзечна-2011».
**23.45** «Сваты-3». Камедыйны серыял.
**00.45** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** «Фазэнда».
**11.40** Фільм «Запаветнае жаданне».
**13.15** «Зачараваны хлопчык». Анімацыйны фільм.
**14.00** «Святлана Кручкова. «Я навучылася проста, мудра жыць…».
**15.00** «Забойная сіла». Шматсер. фільм.
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Фільм «Звычайны шпацыр у парку».
**17.55** Фільм «Знак».
**20.00** Контуры.
**21.05** Трылер «Таямнічы лес».
**23.00** Драма «Тарас Бульба».

**07.05** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**07.30** Фільм «Няверная». ЗША - Германія - Францыя, 2002 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**13.20** «Добры дзень, доктар!».
**13.55** Фільм «Мы з джазу». СССР, 1983 г.
**15.35** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Геніяльны шпік».
**17.45** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Турэцкі гамбіт». Расія - Балгарыя, 2005 г.
**23.00** Прафесійны бокс.
**23.55** Фільм «Любоўны настрой». Францыя - Ганконг, 2000 г.
**01.35** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

**06.45** Прыгоды Агента 007. Фільм (ЗША-Вялікабрытанія).
**09.00** «Правы чалавека». Аўтарская праграма.
**09.15** Дабравест.
**09.45** Мір вашай хаце.
**09.55** Відэафільм аб намінантах на прэміі Саюзнай дзяржавы ў вобласці літаратуры і мастацтва.
**10.05** Тэлебарометр.
**10.10** Камедыя «Паўлінка».
**11.40** Нашы тэсты.
**12.20** Рэальны свет.
**12.55** «Страсці па культуры».
**13.40** Серыял «Маргоша» (Расія).
**17.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
**20.00** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**20.15** Жывы гук.
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.15** Навіны надвор'я.
**21.40** Прыгоды Агента 007. Фільм (ЗША-Вялікабрытанія).
**00.00** Трылер «Душа» (Францыя-Аўстралія-Вялікабрытанія).

**07.00** «ХА». Маленькія камедыі.
**07.15** Фільм «Лясун. Працяг гісторыі». 2010 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.00** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**12.30** Фільм «Каманда «33».
**14.00** Весткі.
**14.15** «З новай хатай!».
**14.45** «Гарадок». Дайджэст.
**15.35** «Рамантыка раманса».
**16.20** Камедыя «Паласаты рэйс».
**18.00** «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Фільм «Калі квітнее бэз». 2010 г.
**22.45** Фільм «Тэрапія каханнем». 2009 г.

**07.35** Дзіцячая раніца на НТБ-Беларусь.
**08.00** Сёння.
**08.20** «У зоне асаблівай рызыкі».
**08.45** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**10.55** «Дачны адказ».
**12.00** «Развод па-руску».
**13.00** Сёння.
**13.20** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**15.05** «Крамлёўскія дзеці».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Следства вялі…».
**17.25** «І зноў добры дзень!».
**18.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.45** «Цэнтральнае тэлебачанне». Першае інфармацыйнае шоў.
**21.55** «Наталля Гундарава. Асабістае жыццё акторкі».
**23.00** «Нтвшнікі». Арэна вострых дыскусій.
**00.00** Фільм «Гаспадар».
**01.45** «Нерэальная палітыка».

**04.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 9-ы.
**05.30, 06.00, 08.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 6-ы.
**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Кваліфікацыя (Валенсія, Іспанія).
**10.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Warm-Up (Валенсія, Іспанія).
**10.30** Аўтаспорт. Аўта ГР (Валенсія, Іспанія). Гонка 2-я.
**11.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 8-ы.
**12.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 9-ы.
**15.15** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг» (Валенсія, Іспанія). Раўнд 17-ы.
**15.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг» (Валенсія, Іспанія). Раўнд 18-ы.
**16.45** Супербайк. Чэмпіянат свету. (Нюрбург, Германія). Заезд 2-і.
**17.30** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 15-ы этап.
**18.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Дзень 9-ы. Агляд.
**20.15, 02.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 7-ы.

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 3 сезон, 13 серыя.
**08.00** Калыханка для самых маленькіх.
**08.35** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**09.00** Еўропа сёння.
**09.25** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 1 серыя.
**10.15** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**10.40** Госць «Белсату».
**11.00** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**11.10** «Лебядовыя гады», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**11.40** «Бульбаны», мультсерыял.
**11.50** «Праваслаўныя манастыры ў Польшчы», дак. фільм, 2006 г., Польшча: 3 серыя.
**12.15** «Увага, дзверы зачыняюцца», маст. фільм, 1998 г., Вялікабрытанія–ЗША.
**13.50** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.20** «Справа Фэрўэла», дак. фільм, 2009 г., Францыя: ч. 2, «Шпіён веку».
**15.10** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**15.35** «Новы час», дак. фільм, Боснія і Герцагавіна.
**16.10** МакраФон: «Басовішча-2007», канцэрт гурта «Крамбамбуля»: ч. 2.
**16.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.00** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**17.20** «Праведнікі», тэлесерыял: 6 серыя.
**18.05** «Георгі і матылі», дак. фільм, 2004 г., Балгарыя–Канада–Фінляндыя–Галандыя–Нарвегія–Брытанія.
**19.00** «Бульбаны», мультсерыял.
**19.10** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Англійская для дзяцей.
**19.50** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**20.00** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.35** Без рэтушы: «Быць беларусам, быць аптымістам», рэпартаж, 2009 г., Польшча.
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Размовы эксперта (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**21.50** Фільматэка майстроў: «Мы тут больш не жывем», маст. фільм, 2004 г., ЗША.
**23.25** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.35** Тыдзень у «Аб'ектыве».

## Шаноўныя чытачы!

**На жаль газету «Новы час» не магчыма купіць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў, афоміўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанк», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый.
Бабруйск:(8 029) 628 75 01, Вольга
Мінск: (8 029) 178 31 68, Вольга
Слуцк 8-044 755 66 48 Марына

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ____________
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ____________

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

### Паважаныя чытачы!

Падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.
**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ________
Кассир Всего ________

Для тых, хто прымае рашэнні!

НОВЫ ЧАС

www.novychas.org

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ЧАТЫРЫ МІФЫ ПРА ПРАВАКАТАРА

Таццяна ШАПУЦЬКА

**Удзельнік Плошчы–2010 Уладзімір Хамічэнка (празваны ў народзе «Навушнікам») стаў, бадай, ледзь не больш медыйнай за экс-кандыдатаў у прэзідэнты персонай. Ягоныя дзеянні на Плошчы, арышт і нядаўняе вызваленне пачынаюць абрастаць разнастайнымі міфамі і домысламі, якія замінаюць разабрацца, што ж гэта за чалавек, і ці адыграў ён нейкую ролю ў выбарчых падзеях. Высветліць, што ёсць праўдаю, а што — выдумкамі, дапамагае юрыст праваабарончага цэнтра «Вясна» Наста Лойка.**





## Міф №1. Хамічэнка правакаваў на біццё шкла ў Доме ўраду

Як вынікае са шматлікіх відэазапісаў і інфармацыі, агучанай на судовым працэсе над Хамічэнкам, ён далучыўся да групы людзей, што білі дзверы Дома ўраду, праз 15–20 хвілін пасля першага разбітага шкла. Ды і цяжка назваць гэта «далучэннем», бо Хамічэнка стаяў збоку ад дзвярэй, а не ў асноўнай масе людзей. Такім чынам, біццё шкла распачаў дакладна не ён. Тады незразумела, у чым крыецца сутнасць ягонай «правакацыі». Можна было б меркаваць, што ён мусіў «закласці» іншых пратэстоўцаў, але і гэты варыянт не падыходзіць: на судзе Хамічэнка засведчыў, што людзі былі настроены мірна, і ён не бачыў аніякай зброі ці прыладаў, каб біць шкло, у руках мітынгоўцаў.

**Каментар юрыста:** У афіцыйным абвінавачанні Уладзіміра Хамічэнкі гучала, што ён наносіў удары з 22 да 23 гадзінаў, як і яго паплечнікі па судовай лаве Андрэй Пратасеня, Зміцер Дрозд, Павал Вінаградаў і Алесь Кіркевіч. Да таго ж, удары ён наносіў ужо па бітым шкле рукамі і нагамі, і толькі пазней у яго з'явіўся ледаруб, якім ён здзейсніў 2 удары. У сваім аналітычным аглядзе ПЦ «Вясна» звяртаў увагу, што яго дзеянні не могуць кваліфікавацца, як «удзел у масавых беспарадках» (падрабязней азнаёміцца з аналітычным аглядам можна на сайце «Вясны» http://spring96.org/be/news/43169).

## Міф № 2. У Хамічэнкі быў начэплены навушнік

Калі паглядзець поўны відэазапіс дзеянняў Хамічэнкі на плошчы Незалежнасці 19 снежня (відэа можна знайсці тут: http://www.youtube.com/watch?v=aDur_kYZ0kQ&feature=player_embedded# — Хамічэнка, у чорным паліто і рознакаляровай шапцы, у левым ніжнім куце), дык бачна, як ён здымае шапку, а пад ёй на вушах… нічога! Ніякага навушніка з дротам, што звычайна выкарыстоўваюць чэкісты для каардынацыі сваіх дзеянняў, няма! Выказваліся меркаванні, што Хамічэнка размаўляе ў мікрафон, схаваны ў рукаве, але гэтая версія не больш праўдападобная за тлумачэнні самога Хамічэнкі — маўляў, спаў на бетоне, адмарозіў вуха, яно балела, вось за яго і трымаўся. Дарэчы, амаль усе відэа з Хамічэнкам былі выдаленыя з відэасэрвісу YouTube, кім і чаму — незразумела.

**Каментар юрыста:** Вельмі шкада, што прэзумпцыю невінаватасці ігнаруюць сёння не толькі супрацоўнікі органаў бяспекі і ўнутраных спраў, а нават і людзі, якія прызнаюць каштоўнасці дэмакратыі і прававой дзяржавы. Не злоўлены — не злодзей, як гаворыцца ў прымаўцы. Самога навушніка ніхто не бачыў, а домыслы дазволілі даць чалавеку нават такую мянушку. Мы лічым Уладзіміра Хамічэнку такім жа палітвязнем, як і іншых асуджаных па падзеях 19 снежня.

## Міф № 3. Хамічэнку вызвалілі датэрмінова перад прэзідэнцкімі выбарамі

Уладзімір Хамічэнка сапраўды выйшаў на свабоду 6 снежня, але датэрміновае вызваленне тут ні пры чым. За некалькі месяцаў да выбараў Хамічэнка спрабаваў скрасці мех бульбы, але троху неданёс — яго затрымалі, завялі крымінальную справу. Да суду ён практычна 3 месяцы знаходзіўся ў следчым ізалятары. За спробу крадзяжу суд прысудзіў тыя самыя 3 месяцы арышту, з якіх сядзець яму засталося 3 дні. Так і выпала, што тэрмін адбыцця арышту Хамічэнкі скончыўся напачатку снежня.

**Каментар юрыста:** Нам невядомыя падрабязнія акалічнасці мінулай крымінальнай справы. З прысуду за «масавыя беспарадкі» толькі ведаем, што — цытата — «ранее судимы па прысудзе суда Аршанскага раёна і г. Оршы ад 3 снежня 2010 г. па ч.1 арт. 14 — ч. 2 арт. 205 КК да пакарання ў выглядзе арышту на тэрмін 3 месяцы». Падчас судовага пасяджэння агучваўся факт, што свой тэрмін ён адбыў цалкам, а не вызваляўся датэрмінова.

## Міф № 4. Хамічэнка абсалютна здаровы

На судовым працэсе было засведчана, што Уладзімір Хамічэнка мае псіхічныя адхіленні (пацверджана псіхіятрычнай экспертызай, агучанай у закрытым рэжыме падчас суду) і не можа паўнавартасна асэнсоўваць падзеі. Такія людзі часта не могуць аддзяліць рэчаіснасць ад таго, што яны пабачылі/прачыталі/пачулі. А таму ўспрымаць усур'ёз байкі Хамічэнкі нельга. Многім запалі ў памяць сведчанні тых, хто адбываў адміністрацыйнае пакаранне за Плошчу разам з Хамічэнкам, пра яго дзіўныя і супярэчлівыя аповеды, але для чалавека такога тыпу падобныя паводзіны традыцыйныя і звычайныя.

**Каментар юрыста:** Заключэнне эксперта №870 ад 1 красавіка 2011 года было насамрэч агучана ў закрытым судовым пасяджэнні, паколькі магло нанесці шкоду асабістым інтарэсам Уладзіміра. Але згодна рашэнню комплекснай псіхолага-псіхіятрычнай экспертызы, стан яго псіхікі — цытата з прысуду — «абмяжоўваў здольнасць Хамічэнкі да сэнсавай ацэнкі сітуацыі і валявога кантролю сваіх дзеянняў, у выніку чаго ён не мог у поўнай меры разумець значэнне сваіх дзеянняў і кіраваць імі». Больш за тое, па рашэнні суда ў дачыненні да абвінавачанага ўжываліся прымусовыя меры бяспекі і лекавання — атрымалася падвоенае пакаранне.

**Урывак з прысуду:** *«В соответствии с заключением эксперта № 870 от 01 апреля 2011 года амбулаторной комплексной судебной психолого-психиатрической экспертизы Хомиченко В.Н. в период инкриминируемого деяния обнаруживал болезненное психическое расстройство в форме органического расстройства личности с когнитивным снижением и эмоционально-волевой неустойчивостью [...] вследствие чего он не мог в полной мере сознавать значение своих действий и руководить ими. Хомиченко В.Н. нуждается в применении принудительных мер безопасности и лечения. У Хомиченко диагностируется синдром зависимости от алкоголя (т. 3 л.д. 186-1)».*

Выбары–2010 пакідаюць шмат пытанняў, адказы на якія нам яшчэ трэба будзе шукаць. Адно з галоўных пытанняў — кім жа былі сплянаваны падзеі на плошчы Незалежнасці? Магчыма, да гэтага неяк быў датычны і Уладзімір Хамічэнка, а магчыма — і любы іншы з ліку тых, хто зараз знаходзіцца за кратамі. Дарэчы, многіх з палітвязняў (напрыклад, Алега Федаркевіча ці Віталя Мацукевіча), таксама адразу залічвалі ў шэраг «правакатараў». З часам гэтае таўро з іх знялі, а вось з Хамічэнкі — не. Можа, таму, што ён з тых, каго мы называем маргіналамі? Сірата, з псіхічнымі адхіленнямі, без сталага месца жыхарства і схільны да пляшкі. Маючы стэрэатыпныя ўяўленні пра людзей такога кшталту, нам сапраўды цяжка даць яму веры. Але ж мы людзі здаровыя, а таму ў стане аддзяліць рэчаіснасць ад таго, што пабачылі/прачыталі/пачулі. Тым болей, гэта так неабходна, каб разабрацца ў тым, што ўсё ж такі было 19 снежня на Плошчы.

СІСТЭМА

# ВЯЗНІ СКАРДЗЯЦЦА, ЧЫНОЎНІКІ АДМОЎЧВАЮЦЦА

Вольга ХВОІН

**Інфармацыйна-асветніцкая ўстанова «Платформа» ў сааўтарстве рыхтуе даклад у Камітэт супраць катаванняў ААН, які будзе разглядацца ў кастрычніку. Усе вядомыя факты катаванняў у адносінах да вязняў беларускіх турмаў абяцаюць адлюстраваць у дакуменце.**

Дырэктар інфармацыйна-асветніцкай установы «Платформа» Андрэй Бандарэнка (сябра Аб'яднанай грамадзянскай партыі, па абвінавачанні ў эканамічных злачынствах адбыў два гады турмы, сёлета суд прызнаў адсутнасць складу злачынства, і Андрэй быў вызвалены з-пад варты) займаецца праблемамі ў пенітэнцыярных установах Беларусі. Ён ужо некалькі разоў агучваў інфармацыю пра збіццё зняволеных.

Напрыканцы ліпеня сваякі вязняў і вязні, якія выйшлі на свабоду, расказвалі, што ў Глыбоцкай папраўчай калоніі былі факты збіцця зняволеных. І апошнія на знак пратэсту нават рэзалі сабе вены і жываты. Цяпер з просьбай пра дапамогу ў інфармацыйна-асветніцкую ўстанову «Платформа» з аналагічнай нагоды звярнулася маці асуджанага Раміза Мамедава, які адбывае пакаранне ў Івацэвіцкай калоніі.

Як і ў выпадку з калоніяй у Глыбокім, кіраўніцтва пенітэнцыярнай установы ў Івацэвічах гэтую інфармацыю абвергла. З патрабаваннем правесці праверку названых фактаў і прыцягнуць да адказнасці вінаватых «Платформа» зноў звярнулася ў Генеральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь, Дэпартамент выканання пакаранняў і ўпраўленне ўласнай бяспекі МУС.

Пашкоджанне ўласнага цела — выпадак не рэдкі ў турмах і калоніях краіны. Звычайна вязні ідуць на такі крок, каб прыцягнуць увагу да грубага парушэння сваіх правоў. «Пашкоджанне свайго цела ў вязняў выклікана выключна адносінамі адміністрацыі, ціскам, катаваннямі і гэтак далей, — расказвае былая медсястра Рэспубліканскай турэмнай бальніцы Алёна Красоўская-Каспяровіч, прадстаўніца «Платформы». — Гэта апошняя спроба звярнуць на сябе ўвагу, на сваю праблему. Калі пашкоджанні цела сур'ёзныя, то гэта дае магчымасць выехаць з тэрыторыі калоніі ў вольную ці рэспубліканскую бальніцу, і там вырашаць свае праблемы з адміністрацыяй, бо па-іншаму гэта рабіць папросту немагчыма. Людзі, якія гэта робяць, цалкам разумеюць, што іх могуць і не ўратаваць. Гэта моцныя людзі. Уявіце сабе, што вам трэба вывернуць вантробы на падлогу».

Павел Сапелка доўгі час працаваў адвакатам, у тым ліку займаўся «палітычнымі» справамі, цесна супрацоўнічае з праваабарончым рухам і цяпер. «Сістэма выканання пакаранняў вельмі закрытая, і атрымаць нейкую праўдзівую інфармацыю, калі ты не з'яўляешся службовай асобай, практычна не магчыма. Дэпартамент выканання пакаранняў — закрытая ўстанова, у адрозненні ад большасці органаў кіравання, якія хацяб ствараюць бачнасць адкрытасці. Дэпартамент не мае нават сайту, сваіх выданняў, таму нейкай аб'ектыўнай інфармацыі, нават адфільтраванай, ад дэпартаменту атрымаць немагчыма. Што тычыцца рэальнага становішча вязняў — яно бядотнае. Нягледзячы на тое, што наша пенітэнцыярнае заканадаўства ў нейкай ступені стала прадуктам уліку міжнародна-прававых нормаў, калі яно распрацоўвалася, тым не менш многія яго палажэнні супярэчаць гэтым прынцыпам, а тыя, што прадэкляраваныя, не заўсёды выконваюцца. Усім добра вядомая праблема перапоўненасці турмаў, я маю на ўвазе і турмы, і калоніі, і іншыя месцы прымусовага ўтрымання», — заначае юрыст.

▸ ГАДАВІНА

# ПАДПОЛЬНЫ СССР

Алег НОВІКАЎ

**Нягледзячы на тое, што Савецкі Саюз фармальна сканаў 20 гадоў таму, дагэтуль існуюць арганізацыі, якія прэтэндуюць на тое, каб лічыцца пераходным савецкім урадам.**

Галоўным падмуркам для існавання такога кшталту «ўрадаў» з'яўляецца прававы нюанс, звязаны з сакавіцкім рэферэндумам 1991 года. Тады грамадзянам СССР па ініцыятыве Гарбачова прапанавалася адказаць на пытанне: «Ці лічыце Вы неабходным захаванне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік як абноўленай федэрацыі раўнапраўных суверэнных рэспублік, у якой будуць у поўнай меры гарантавацца правы і свабоды чалавека любой нацыянальнасці?»

У рэферэндуме, які адбыўся 17 сакавіка 1991 года, з 185,6 мільёна (80%) грамадзян СССР з правам голасу прынялі ўдзел 148,5 мільёна (79,5%); з іх 113,5 мільёна (76,43%) сказалі «так». Ідэю не падтрымалі прыбалты і грузіны. Рэферэндум байкатавалі малдаване. У любым выпадку, большасць была відавочна за СССР, што некаторым чынам супярэчыла прынятым пасля правалу путчу рашэнням рэспубліканскіх парламентаў пра выхад іх рэспублік са складу «адзінага і магутнага».

Палітолагі налічваюць 3–4 арганізацыі, якія прысвойваюць сабе функцыі часовага ўраду СССР. Найбольш сістэмна тут працуе Рух грамадзян СССР, створаны ў 1995 годзе на базе Усесаюзнай камуністычнай партыі бальшавікоў Ніны Андрэевай.

Вось галоўныя тэзы ўстаноўчай Дэкларацыі Руху грамадзян СССР: «Вярхоўным носьбітам улады і дзяржаўнага суверэнітэту ў СССР з'яўляўся (і працягвае заставацца) савецкі народ як супольнасць грамадзян СССР. З моманту самаліквідацыі апошняга па часе саюзнага кіраўніцтва, — якая з'явілася вынікам яго ўласных здрадлівых учынкаў, — улада і суверэнітэт у СССР належаць непасрэдна савецкаму народу. Інстытутамі, якія ўяўляюць у дадзены момант Савецкі народ, з'яўляюцца З'езд грамадзян СССР і ўтвораныя ім органы, роўна як органы Савецкай улады, што аднаўляюцца на месцах і ў цэнтры ў адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР. Акты, якія выдаюцца З'ездам грамадзян СССР і яго выканаўчымі органамі, абавязковыя для канструктыўнага разгляду ўсёй сусветнай супольнасцю, усімі суб'ектамі міжнароднага права, што прызнавалі СССР і мелі з ім звычайныя міждзяржаўныя зносіны. Сказанае адносіцца таксама да рэжымаў кіравання, якія ўзніклі на тэрыторыі СССР».

Дэкларацыя заканчваецца заклікам: «Савецкія людзі, аб'ядноўвайцеся! Пры Руху існуе Вярхоўны Савет СССР, які рэгулярна збіраецца і нават прымае законы».

Аднак найбольш прыкметная групоўка, якая лічыць сябе савецкім урадам, — Пастаянны прэзідыум З'езда народных дэпутатаў СССР (ППСНД СССР) — палітычная грамадская арганізацыя, якая прэтэндуе быць вышэйшым органам улады аднаўленага ў будучым СССР.

Арганізацыя была створана 17 сакавіка 1992 года на так званым «VI З'ездзе народных дэпутатаў СССР», на якім прысутнічала меней за 200 з 2250 народных дэпутатаў СССР, як «орган улады» Савецкага Саюза, які не прызнае Белавежскія дамовы.




Старшынёй Пастаяннага прэзідыума была абрана вядомая напачатку 1990-х Сажы Умалатава. Магчыма, некаторыя дасюль памятаюць Умалатаву — чачэнку, электразваршчыцу па прафесіі, дэпутата Вярхоўнага Савета СССР двух апошніх скліканняў. Яна запомнілася сваім выступам 17 снежня 1990 года на 4-м з'ездзе народных дэпутатаў СССР, калі падвергла рэзкай крытыцы палітыку прэзідэнта СССР і генеральнага сакратара ЦК КПСС Міхаіла Гарбачова і звярнулася да яго з заклікам сысці ў адстаўку. У 1991 годзе Умалатава выступіла супраць абрання Барыса Ельцына прэзідэнтам РФ. У 1993-м яна была сярод абаронцаў Вярхоўнага Савета. Сярод іншых прыкметных лідараў ППСНД СССР Алксніс і Макашоў.

Нягледзячы на тое, што да пачатку нашага стагоддзя Пастаянны прэзідыум практычна згарнуў працу, ён прапісаўся ў аналах гісторыі. Усё дзякуючы ўзнагароднай дзейнасці.

У канцы 1980-х і пачатку 1990-х гадоў недзяржаўныя арганізацыі РФ атрымалі права заснoўваць уласныя ўзнагароды, узнагароджваць імі каго заўгодна. Свае ўзнагародныя сістэмы стварылі казацкія аб'яднанні, цэрквы, палітычныя партыі, культурныя саюзы і г.д. Гэтыя ўзнагароды ў пераважнай большасці не ўступалі ў супярэчнасць з дзяржаўнай узнагароднай сістэмай РФ. Яны, як грамадскія ці ведамасныя падсістэмы, толькі канкрэтызавалі і дапаўнялі яе.

Пад старшынствам Умалатавай ППСНД СССР кінуў выклік рэжыму Ельцына, аднавіўшы ўзнагароджанні знакамі з сімволікай дзяржавы, якая спыніла сваё існаванне. З іншага боку, афіцыйныя ўлады РФ, замест таго, каб спыніць альтэрнатыўную ўзнагародную дзейнасць, «не заўважалі» аж да 2002 года. У выніку на фоне безуладдзя праваквалася імітацыя двоеўладдзя.

З 1994-га да канца 1999 года Умалатава ўзнагароджвала ордэнамі і медалямі СССР, якія захаваліся на манетных дварах (маркуючы па ўсім, яны былі выкуплены ППСНД СССР), а таксама прысвойвала грамадзянам РФ ганаровыя званні СССР, напрыклад, «Народны артыст СССР». Калі ордэны, медалі і знакі савецкай чаканкі скончыліся, пачалі чаканіць іх копіі з некаштоўных металаў. Так адбылося, напрыклад, з ордэнам Леніна.

На гэтым актыўнасць Умалатавай і яе кампаніі не прыпынілася. Былі заснаваныя 14 экзатычных юбілейных медалёў. Вось некаторыя іх назвы: «80 гадоў ВЧК-КДБ», «120 гадоў І.В. Сталіну». У дадатак прэзідыум ахвотна раздаваў вайсковыя званні.

Трэба прызнаць той факт, што шматлікія ветэраны вайны і працы з радасцю прымалі ўзнагароды ППСНД СССР і пры гэтым часам адмаўляліся ад дзяржаўных узнагарод РФ. І наадварот, некаторыя ветэраны сталі звяртацца ў Мінюст і Генпракуратуру за растлумачэннямі, мяркуючы, што дзейнасць ППСНД СССР дыскрэдытуе савецкую ўзнагародную сістэму і вядзе да абясцэньвання ўзнагарод, выдадзеных у часы СССР. У выніку ў красавіку 2002 года Мінюст РФ накіраваў прадстаўленне ў Генпракуратуру з просьбай прыняць меры. Мінюст РФ паведаміў, што Пастаянны прэзідыум З'езду народных дэпутатаў СССР з'яўляецца «незарэгістраванай грамадскай арганізацыяй». Умалатава была папярэджана пра недапушчальнасць далейшай узнагароднай дзейнасці ППСНД СССР.

Пры ўсім сваім настальгічным утапізме, у 1990-я дзейнасць ППСНД СССР не была пазбаўлена грамадскага значэння. Аднак са зменай палітычнай кан'юнктуры шматлікія сябры Пастаяннага прэзідыума сталі пуціністамі. Так, Умалатава ў 2001 годзе падтрымала палітыку прэзідэнта РФ Уладзіміра Пуціна, стварыўшы Агульнарасійскі грамадскі Рух у падтрымку палітыкі прэзідэнта Расійскай Федэрацыі.

Цяперашні юбілей развалу СССР, безумоўна, стане імпульсам актывізацыі груповак, але надоўга куражу махаць сцягамі СССР у іх наўрад ці хопіць.




## ▼ ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Патрэбна на тое, што перспектыва набыцця расійскага газу па меншым кошце стала для беларускіх улад дадатковым аргументам на карысць таго, што нічога ў эканоміцы змяняць не трэба. Прэзідэнт Лукашэнка паляцеў на адпачынак у Сочы. А важныя рашэнні адносна далейшай эканамічнай стратэгіі, якія ўрад абяцаў прыняць да 15 жніўня, дагэтуль не апублікаваныя. Пры гэтым толькі запланаванае памяншэнне газавых тарыфаў для Беларусі абыдзецца «Газпраму», па розных ацэнках, у суму ад 1,5 да 3 мільярдаў долараў штогод. Дык што гэта, калі не чарговыя датацыі? Але за такую шчодрасць давядзецца плаціць. Верагодна, так званы «інтэграцыйны каэфіцыент» апроч іншага прымусіць Мінск быць больш падатлівым у пытаннях удзелу расійскага капіталу ў прыватызацыі беларускіх дзяржпрадпрыемстваў.

**«Deutche Welle» (Германія)**

Сёння Расія аб'яднаная ў Мытны саюз з Беларуссю і Казахстанам, і вельмі недалёка час, калі ў гэтых краін будзе аднолькавая валютная адзінка. Характэрна, што на сёння ў Масквы пад ціскам таксама і Кіеў. Яна хоча, каб да гэтага аб'яднання далучылася і Украіна. Нягледзячы на гэта, апошняе прызнанне Уладзіміра Пуціна пра намер уключыць Беларусь у склад Расіі не вельмі спадабаецца Лукашэнку і беларускай адміністрацыі. Пасля таго, як Ельцын нечакана для ўсіх перадаў кіраванне Уладзіміру Пуціну, Лукашэнка ўсё часцей стаў казаць пра нацыянальны суверэнітэт, і нават назваў незалежнасць «святой справай».

**«Presa» (Грузія)**

Сярод усходнеславянскіх дзяржаў Беларусь першай стала на шлях аўтарытарызму і дыктатуры, утрымліваючы і сёння гэта сумнае лідарства. Нават пуцінская Расія, не кажучы ўжо пра Украіну, у параўнанні з Беларуссю здаецца аазісам дэмакратыі. Склаўшы сакрэтны кантракт з уласным народам і забяспечыўшы прымальны ўзровень сацыяльных гарантый у краіне, Лукашэнка, гэты саўгасны дырэктар-дыктатар, які стане калісьці карыкатурным героем аперэт, стварыў магутны рэпрэсіўны рэжым, які можа яшчэ на некаторы час забяспечыць «бацьку» знаходжанне ва ўладзе. Але рэсурс гэтага рэжыму і гэтай мадэлі развіцця цяпер амаль вычарпаны.

**«Укррудпром» (Украіна)**

З'яўляецца вельмі рызыкоўнай і неапраўданай ідэя ўвядзення ў Беларусі расійскага рубля, пра што ўсё часцей на афіцыйным узроўні кажуць у Мінску. Такі сцэнар мае шанцы на жыццяздольнасць толькі пры поўнай адмове Беларусі ад эмісійных паўнамоцтваў і перабудове сваёй квазісацыялістычнай эканомікі. Прадпрыемствы стануць працаваць толькі на рынак, а не на склад. Банкі пачнуць крэдытаваць толькі плацежаздольных пазычальнікаў, якія абапіраюцца на рынкавыя рэсурсы. Пенсіянеры, бюджэтнікі і льготнікі пяройдуць на расійскія, у цэлым ніжэйшыя сацыяльныя стандарты. Не пацягне расійскі бюджэт і цяперашні беларускі ўзровень бюджэтных субсідый мяса-малочнай галіны, неймаверны нават па еўрапейскіх мерках. Гэта будзе азначаць рынкавы шок для гаспадаркі краіны — з немінучым беспрацоўем і падзеннем узроўню жыцця. А да такога сцэнару не гатовыя ні Лукашэнка, ні грамадзяне яго краіны.

**«Итоги» (Расія)**

ВЫБАРЫ

# БІТВА ЗА БЕРЛІН

**18 верасня адбудуцца выбары ў парламент Берліну, якія шматлікія СМІ называюць рэпетыцыяй выбараў у Бундэстаг у 2013 годзе. Пра ход кампаніі журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з нямецкім журналістам Маціясам Кабенам.**



***— Наколькі варта верыць палітолагам, паводле меркавання якіх, вынікі галасавання 18 верасня фактычна назавуць прозвішча наступнага канцлера?***

— Наўрад ці пасля 18 верасня мы дакладна даведаемся, хто стане пераемнікам Ангелы Меркель. Па вялікім рахунку, нівodная з вядучых партый дасюль не вызначылася з кандыдатам на пасаду канцлера. Аднак з вялікай верагоднасцю мы зможам казаць пра тое, прадстаўнік якой з апазіцыйных партый — Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі (SPD) або Зялёных — стане кіраўніком ураду. Па ўсіх апытаннях, менавіта гэтыя палітычныя сілы будуць кіраваць краінай пасля наступных выбараў. Аднак пакуль не зразумела, хто ў гэтым тандэме будзе выконваць вядучую ролю, а хто стане малодшым кааліцыйным партнёрам.

***— Адпаведна апублікаваным 20 жніўня ў газеце «Der Welt» вынікам сацыялагічнага даследавання, Зялёныя яўна не здольныя канкураваць з эсдэкамі. У эколагаў 20 працэнтаў падтрымкі, а ў ружовых — 29 (у кансерватараў той жа вынік). Ці значыць гэта, што пасада будучага канцлера ўжо зараз гарантавана SPD?***

— Электаральныя сімпатыі немцаў апошнім часам мяняюцца вельмі хутка. Прыкладна год таму рэйтынг Зялёных быў вышэй за эсдэкаў (24 і 23 працэнта адпаведна). Таму за пару гадоў, якія засталіся да выбараў, можа адбыцца ўсё што заўгодна. І самае трывожнае для сацыял-дэмакратаў — грамадства паступова прызвычаецца да думкі, што эколагі могуць быць кіруючай партыяй. Заўсёды ў гісторыі ў створаных з сацыял-дэмакратамі кабінетах яны былі малодшымі партнёрамі. Упершыню традыцыя была парушаная пасля сакавіцкіх выбараў у зямлі Бадэн-Вюртэмберг. Там Зялёныя абышлі сацыял-дэмакратаў і ўзначалілі ўрад. Калі ў Берліне яны зробяць дубль, іх больш не будуць асацыяваць з партыяй другога эшалону. Псіхалагічна выбаршчыкі гатовыя прызнаць у іх галоўную сілу левай апазіцыі.

***— Наколькі нямецкае грамадства гатовае да таго, каб даверыцца Зялёным?***

— З улікам сацыяльных працэсаў гэта выглядае цалкам рэальна. Тэмы экалогіі і здароўя сталі нейкім жупелам для вялікай часткі нямецкага грамадства. Адначасова губляецца інтарэс да царквы і прафсаюзаў — інстытутаў, вакол якіх аб'ядноўваліся былыя партыі-мастадонты. Аднак зялёная ідэнтычнасць фармуецца не так хутка, як хацелі б Зялёныя. Відавочна, што без катастрофы на Фукусіме перамагчы ў Бадэн-Вюртэмбергу ім было б складана. Тое ж адбываецца ў Берліне. У сакавіку Зялёныя былі на галаву папулярнейшымі за сацыял-дэмакратаў. Зараз эсдэкі імкліва вяртаюць згубленыя пазіцыі.

***— Што за асоба Рэната Кунаст, якая хоча адабраць у эсдэкаў пасаду бургамістра?***

— Кунаст паходзіць з Дзюсельдорфа. Пасля заканчэння ўніверсітэта яна доўгі час працавала сацыяльным дарадчыкам у берлінскіх турмах. Была адвакатам. Яна была адным з піянераў партыі Зялёных, створанай у 1980-м. Па іх спісу трапіла ў Бундэстаг. У час прэм'ерства Шродэра была міністрам абароны правоў спажыўцоў.

***— Якія асаблівасці цяперашняга выбарчага працэсу ў Берліне?***

— Берлін — гэта мультыкультурны горад з моцнымі левымі традыцыямі. Гэта выражаецца хаця б у тым, што бургамістру Клаусу Ваверайту нават прабачылі апошні рост кошту арэнды. Аднак парламенцкай большасці ні ў эсдэкаў, ні ў Зялёных, а тым больш у левых (нашчадкі былых камуністаў Усходняй Германіі) не будзе. Таму пытанне пытанняў — у якім фармаце будзе створаная будучая кааліцыя. Эсдэкі яўна будуць намагацца захаваць цяперашнюю формулу: яны плюс левыя. Аднак у абодвух партый толькі 44 працэнты агулам. Найбольш рэалістычны варыянт — эсдэкі плюс Зялёныя. Або наадварот.

***— А калі Зялёныя адмовяцца ад таго, каб быць малодшымі партнёрамі пры Ваверайце? Ці могуць яны ўзгадаць прыклад Гамбургу, дзе Зялёныя блакіраваліся ва ўрадзе разам з хрысціянскімі дэмакратамі?***

— Магчыма, блок Зялёных і хрысціянскіх дэмакратаў — гэта адна з самых правакацыйных тэмаў у палітычных каментарах. Зялёныя, як вядома, паўсталі як партыя радыкальнай апазіцыі да кансерватараў і іх каштоўнасцяў. Аднак, думаю, у Берліне такі варыянт не спрацуе. Гэта вялікая рызыка для іміджу партыі. «Берлін — гэта левы горад, і левыя партыі маюць тут абсалютную большасць. Таму ўрад, які заслугоўвае давер народу, павінен быць выключна левым», — увесь час кажа лідар фракцыі Зялёных у берлінскім сенаце. Хаця спакуса стаць мэрам Берліну у Кунаст, думаю, вельмі вялікая.

***— Якая з іншых з партый можа зрабіць сюрпрыз на выбарах?***

— Калі Франц Хенкель — лідар берлінскіх кансерватараў — зможа абыйсці Кунаст і зрабіць Саюз хрысціянскіх дэмакратаў (CDU) другой партыяй у сталіцы (шансы ў яго ёсць), ён здзейсніць сапраўдны палітычны цуд. Нечакана для ўсіх рэальныя шансы атрымаць мандаты маюць «піраты» — партыя, якая выступае за вольны софт і супраць аўтарскага права ў інтэрнэце. Мяркую, што ўсім будзе цікава, колькі атрымаюць створаныя ў апошні час выразна ісламафобскія партыі, кшталту Freiheit. Гэта можа даць адказ на пытанне, ці магчыма з'яўленне ў Германіі ўплывовай партыі, больш правай за Саюз хрысціянскіх дэмакратаў.



## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ЭВА МАРАЛЕС



Першы прэзідэнт-індзеец у гісторыі Балівіі, які раней фактычна ўзяў курс на ператварэнне Балівіі ў краіну, дзе індзейцы — дамінуючы этнас, нечакана з тымі самымі індзейцамі пасварыўся. Ён даў згоду на будаўніцтва газавага трубаправоду ў амазонскай сельве, якая належыць мясцовым індзейскім плямёнам. Трубапровод замовіла адна з бразільскіх кампаній. План праекту выклікаў бунт мясцовых кланаў, якія арганізавалі марш на сталіцу правінцыі. Бо газаправодная сістэма можа знішчыць унікальныя мясцовыя флору і фауну. Некаторыя індзейскія плямёны падтрымалі пратэсты, паколькі баяцца, што Маралес гэтак жа можа знішчыць і плантацыі кокі — традыцыйнай індзейскай культуры. У сваю чаргу ўрад кажа, што будаўніцтва патрэбнае для стварэння адзінай нацыянальнай інфраструктуры. Пакуль канфлікт працягваецца. Пратэстуючыя абяцаюць правесці праз 30 дзён нацыянальную маніфестацыю ў сталіцы. Адначасова аналітыкі пішуць пра вялікі крызіс даверу да прэзідэнта ў асяроддзі індзейцаў. Самыя смелыя нават кажуць пра правал папулярнай калісьці канцэпцыі стварэння ў Балівіі першай у сучаснай гісторыі дзяржавы індзейцаў.

### МІХАІЛ ФАРМУЗАЛ



Лідар Гагаузскай аўтаноміі Малдовы нечакана заклікаў Уладзіміра Філата, цяперашняга прэм'ера ад ліберал-дэмакратычнай партыі, якая ўваходзіць у прazаходнюю кааліцыю «Еўрапейскі альянс», балатавацца на пасаду прэзідэнта. Справа ў тым, што Гагаузія традыцыйна лічыцца вотчынаю камуністаў, якія зараз у апазіцыі. Зараз прэзідэнта ў краіне няма — для яго абрання патрэбна дзве трэці галасоў дэпутатаў парламенту, якіх у «Еўрапейскага альянсу» няма. Прэзідэнта будзе працей абраць, калі Канстытуцыйны суд дазволіць яго абіраць простай большасцю галасоў дэпутатаў. Зараз суд думае наконт такога варыянту. Тым часам, здаецца, камуністы намагаюцца як мага хутчэй разваліць адзінства «Еўрапейскага альянсу», робячы стаўку на амбіцыі Філата. Ходзяць чуткі, што чырвоныя гатовыя падтрымаць Філата падчас галасавання наконт прэзідэнта ў абмен на пасаду прэм'ера для свайго чалавека. Зараз большасць у «Еўрапейскім альянсе» бачаць на пасадзе прэзідэнта не яго, а лідара дэмакратаў Марыяна Лупу. Калі 20 верасня суд пагодзіцца на новы фармат выбараў прэзідэнта, Філат у кантэксце прапановы Фармузала павінен будзе зрабіць фатальны выбар.

### ВАЦЛАЎ КЛАУС



Прэзідэнт Чэхіі праявіў сябе вялікім арыгіналам на фоне іншых еўрапейскіх палітыкаў. Ён адкрыта выступіў супраць удзельнікаў гей-параду, які 21 жніўня прайшоў у Празе. «Я баюся гомасэксуалізму, як і любога іншага «ізму», — сказаў Вацлаў Клаус. Словы прэзідэнта сталі знакам, каб палітычная эліта таксама стала казаць, што яна думае пра сэксуальныя меншасці. Так, мэр сталіцы, хаця і даў згоду на марш, назваў гомасэксуалістаў «тупіковай галіной эвалюцыі». На думку шматлікіх назіральнікаў, менавіта словы Клауса выклікалі пачуццё рашучасці ў чэшскіх ультраправых, якія паспрабавалі гвалтоўнымі сродкамі сарваць мерапрыемства. У выніку кампанія супраць гей-параду, здаецца, адлюстравалася на колькасці яго ўдзельнікаў. Замест сямі тысяч чалавек, якія чакаліся на акцыі, парад наведалі толькі паўтары тысячы. Самае смешнае ва ўсёй гэтай гісторыі — тое, што чэшская прэса даўно займаецца спекуляцыямі вакол сэксуальнай арыентацыі прэзідэнта краіны.

МЕМУАРЫ

# ПЕРАБУДОВА ЯК ФАКТАР БЕЛАРУСКАГА АДРАДЖЭННЯ

◂ Працяг. Пачатак у №30.

Леанід ЛЫЧ

**Дваццаць гадоў таму ў лексіконе народаў СССР, бадай, не было больш папулярнага слова, чым «перабудова». Паступова прывыклі і пачалі ўжываць яго і іх калегі з Беларусі. Але калі сур'ёзна разабрацца, тут фактычна і не было чаго перабудоўваць.**

## Жыццё патрабавала перамен

У Беларусі належала не перабудоўваць, а будаваць нанава, ледзь не з самых азоў, беларускае нацыянальна-культурнае жыццё. Будаваць не па навязаных, занесеных знадворку пачатках, а на сваіх уласных, прыродных, хоць і моцна разбураных у выніку шматгадовай дзяржаўнай русіфікатарскай палітыкі царскай імперыі і бальшавіцкага СССР.

Ад першых дзён перабудовы ў ёй зусім заслужана вядучае месца заняў нацыянальны фактар. Да гэтага вымушала нестабільнае, даволі напружанае становішча ў сферы міжнацыянальных дачыненняў, пра што добра ведаў ідэалагічны апарат ЦК КПСС з самых розных крыніц інфармацыі і асабліва з вялікай колькасці лістоў з саюзных і аўтаномных рэспублік. Маўчала толькі ледзь не дашчэнту зрусіфікаваная інтэлігенцыя Беларусі, спакойна сузіраючы, а то і садзейнічаючы паглыбленню працэсаў рускай культурна-моўнай асіміляцыі, якая пачала па-сапраўднаму ўладарыць ужо і ў сельскай мясцовасці. Каб не дапусціць узнікнення зусім рэальнага ў той час канфлікту на нацыянальнай глебе, партыйны цэнтр у Маскоўскім Крамлі ўзяў на сябе ініцыятыву па нармалізацыі сітуацыі ў гэтай складанай сферы грамадскіх узаемадачыненняў. Гарбачоў вельмі ахвотна агучваў новыя — і трэба сказаць даволі прагрэсіўныя — устаноўкі ідэалагічнага апарату па нацыянальным пытанні.

Варта адзначыць, што да абрання на пасаду генеральнага сакратара ЦК КПСС М. Гарбачоў вельмі рэдка закранаў гэты аспект, а калі і закранаў, дык толькі ў пазітыўным плане. Тут можна спаслацца на яго выступленне 10 снежня 1984 года на Усесаюзнай навукова-практычнай канферэнцыі «Удасканаленне развітога сацыялізму і ідэалагічная работа партыі ў святле рашэнняў чэрвеньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС». Ён аднёс да вялікіх заваёваў СССР «дасягненне фактычнай роўнасці нацыяў і народнасцяў, іх далейшае ўсебаковае развіццё і збліжэнне», непарушную брацкую дружбу, «глыбокае пачуццё сям'і адзінай, утварэнне новай




гістарычнай супольнасці — савецкага народа».

У звыклым для бальшавіцкай ідэалогіі тоне гаварылася пра нацыянальную палітыку ў падрабязным «Палітычным дакладзе Цэнтральнага Камітэта КПСС XXVII з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза» ад 25 лютага 1986 года, які быў прачытаны М. Гарбачовым. Адзначалася, што ў апошняй «яшчэ не зжыты і часам хваравіта заяўляюць аб сабе імкненне да нацыянальнай замкнутасці, месніцтва, утрыманскія настроі». Выказвалася асцярога, «каб здаровая цікавасць да ўсяго каштоўнага, што ёсць у кожнай нацыянальнай культуры, не ператваралася ў спробы адгарадзіцца ад аб'ектыўнага працэсу ўзаемадзеяння і збліжэння нацыянальных культур».

Гарбачоў не раз заяўляў пра неабходнасць далейшага ўзмацнення інтэграцыйных працэсаў у складзе новай гістарычнай супольнасці людзей — савецкім народзе. Ідэалагічны апарат КПСС асаблівыя прыярытэты надаваў сціранню ўсяго таго, што адрознівала савецкія нацыі і народнасці адну ад адной. Як і ва ўсіх іншых выпадках, такі курс у нацыянальнай палітыцы імкнуліся падмацаваць адпаведнымі спасылкамі на Уладзіміра Леніна.

Словам, стаўленне КПСС да нацыянальнага пытання ў сярэдзіне, на пачатку другой паловы 80-х гадоў было такім, як пры Мікіце Хрушчове, Леанідзе Брэжневе, Юрыі Андропаве, Канстанціне Чарненку. Партыя выступала за перабудову, паскарэнне працэсаў у эканамічным, сацыяльна-палітычным жыцці, але пакуль што нічога не збіралася мяняць у сферы міжнацыянальных дачыненняў, паколькі яе цалкам задавальнялі вынікі інтэрнацыяналізацыі культуры савецкіх народаў з непазбежным узмацненнем у ёй ролі рускага фактару.

## Тварам да нацыянальнага пытання

З такім ходам падзей у нацыянальным жыцці ніяк не маглі пагадзіцца здаровыя нацыянальныя сілы саюзных і аўтаномных рэспублік. На гэты раз знайшліся яны і ў Беларусі. Прыкладна праз дзесяць месяцаў пасля XXVII з'езда КПСС і восем месяцаў пасля Чарнобыльскай катастрофы на імя генсека ЦК КПСС М. Гарбачова 28 прадстаўнікоў творчай і навуковай інтэлігенцыі Беларусі накіравалі ліст з падрабязным аналізам яе жахлівага нацыянальнага жыцця і канкрэтнымі прапановамі яго аздараўлення. Ліст падпісалі такія вядомыя ў рэспубліцы людзі, як пісьменнікі В. Адамчык, Р. Барадулін, Я. Брыль, В. Быкаў, народная артыстка БССР С. Станюта, мастак Л. Шчамялёў, шэраг супрацоўнікаў Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР, сярод якіх і аўтар гэтага артыкула. Ліст з'явіўся падставай паслання ў Мінск камісіі ЦК КПСС для вывучэння сітуацыі на месцы і сустрэчы з падпісантамі. Яна адбылася ў будынку ЦК КПБ. Размова вялася ў карэктным тоне, без усялякіх пагроз. У канцы яе члены камісіі прызналі наяўнасць нацыянальнай праблемы на Беларусі, асабліва ў незбалансаваным выкарыстанні беларускай і рускай моваў у грамадскім жыцці.

Аднак якіх-небудзь канкрэтных крокаў па развязванню нацыянальнай праблемы ў БССР не рабілі ні Масква, ні Мінск, што, аднак, не ў стане было затрымаць адраджэнскія працэсы. Да іх далучаліся ўсё новыя і новыя сілы. Іншым разам у гэтым была і заслуга самога генсека ЦК КПСС. Нацыянальна самасвядомым беларусам не маглі не імпанаваць і многія палажэнні з яго даклада на студзеньскім (1987) Пленуме ЦК КПСС, з якіх вынікала, што на практыцы яшчэ не ўсюды з належнай павагай ставіліся да гістарычных, духоўных традыцый савецкіх народаў.

Высокае партыйнае кіраўніцтва Беларусі, будучы найбольш асіміляваным, адарваным ад роднай зямлі ў параўнанні з іншымі коламі грамадства, упарта не жадала ўносіць якія-небудзь карэктывы ў сваю нацыянальную палітыку. Больш за тое, у сакавіку 1987 года першы сакратар ЦК КПБ Я. Сакалоў з трыбуны пленума ЦК КПБ заявіў, што няма аніякай патрэбы штосьці мяняць у культурна-моўнай сферы. Нацыянальна-патрыятычным колам нічога не заставалася рабіць, як зноў звярнуцца да М. Гарбачова з лістом аналагічнага зместу. Яго за подпісамі 134 асобаў паслалі ў Маскву 4 чэрвеня 1987 года. Рэагаванне аказалася нулявым. Партыя пакуль што яшчэ не жадала ці не была гатова ўносіць якія-небудзь істотныя карэктывы ў сваё гістарычнае тварэнне — «ленінскую нацыянальную палітыку».

**Якіх-небудзь канкрэтных крокаў па развязванню нацыянальнай праблемы ў БССР не рабілі ні Масква, ні Мінск, што, аднак, не ў стане было затрымаць адраджэнскія працэсы**

Хаця для нацыянальнай палітыкі КПСС час сапраўднай перабудовы не надышоў, усё ж такі яна дазваляла заклапочаным лёсам беларускай культуры людзям штосьці канструктыўнае рабіць па яе выратаванні ад русіфікацыі. Пачалі ўзнікаць, асабліва сярод моладзі, рознага роду нефармальныя арганізацыі нацыянальнага арыенціру, галоўным зместам працы якіх з'яўлялася скіраваць маладыя пакаленні беларусаў да ўдзелу ў духоўным адраджэнні роднай Бацькаўшчыны. За дзеяннямі такіх арганізацый пільна сачылі партыйныя органы і адданыя ім спецслужбы, але на прыняцце якіх-небудзь сур'ёзных рэпрэсіўных акцый ужо не адважваліся. Якніяк у краіне ішла перабудова.

У пераважнай сваёй большасці творчая інтэлігенцыя прыхільна ставілася да выказаных М. Гарбачовым поглядаў на перабудову грамадскага жыцця, бо спадзявалася, што яна зможа паспрыяць і спыненню працэсаў дээтнізацыі беларускага народа, выкліканай стратнай для яго нацыянальнай палітыкай КПСС. Настрой такой інтэлігенцыі так перадаў паэт Пімен Панчанка ў адным са сваіх вершаў:

*Не хапае ўсім харчоў,*
*Кормімся валютаю...*
*Дарагі наш Гарбачоў,*
*Трэба рэвалюцыя!*

Натуральна, пад рэвалюцыяй паэт разумеў не паўтор кастрычніцкага перавароту 1917 года ў Расіі, а выказаў у вершы сваё жаданне перш за ўсё на карэнныя перамены палітыкі ў нацыянальна-культурнай сферы, дзе так шмат было адмоўнага. Як майстра мастацкага слова, яго найбольш непакоіць трагічны стан беларускай мовы. Гэта выразна вынікае з такіх яго вершаваных радкоў:

*А мову ледзь не затапталі*
*І асмяялі, як раней.*
*А вы ў народа запыталі,*
*Якая мова нам радней?*

Многія верылі — і яны не памыліліся, — што перабудова вось-вось перакінецца і на сферу міжнацыянальных дачыненняў. Сур'ёзнай падставай прыняцця ўвагі партыйнага Цэнтра да іх стала святкаванне ў 1987 годзе ў краіне 70-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Пышнымі фразамі пра канчатковае развязванне ў СССР нацыянальнага пытання афіцыйны друк, як гэта назіралася раней падчас такіх юбілеяў, ужо не затуманьваў галовы сваіх чытачоў. Адчувалася, што ў бліжэйшы час ідэалагічны апарат ЦК КПСС намерваецца сказаць пра гэта пытанне нешта зусім іншае. Было сказана такое ў чэрвені 1988 года на XIX Усесаюзнай канцэпцыі КПСС.

Для многіх было нечаканым, што галоўнай тэмай канферэнцыі з'яўлялася праблема нацыянальна-культурнага развіцця савецкіх народаў. Так грунтоўна, як на гэты раз, яе разглядалі ажно ў сакавіку 1921 года на дзясятым з'ездзе РКП(б). І праз такі працяглы час яна зноў усплыла на паверхню! Зразумела, не выпадкова. Накіраваная на збліжэнне і зліццё культур народаў СССР палітыка моцна падарвала нацыянальныя асновы іх духоўнага жыцця за кошт празмернага ўзмацнення ў ім ролі рускага фактару.

З усіх савецкіх народаў найбольш панеслі стратаў ад русіфікацыі беларусы. Патлумачыць гэта можна дзвюма асноўнымі прычынамі: блізкасцю беларускай і рускай культур і моваў, злачыннай нацыянальнай палітыкай партыйнага кіраўніцтва БССР. Яно нават не знайшло ў сабе смеласці даць на XIX Усесаюзнай канферэнцыі КПСС крытычную ацэнку сваёй палітыцы ў сферы нацыяльна-культурнага будаўніцтва.

Як нічому іншаму, удзельнікі канферэнцыі шмат увагі надалі рэальнаму стану нацыянальных моваў. І гэта лагічна, бо іх сацыяльная роля істотна знізілася з-за шырокага ўкаранення ва ўсе сферы дзейнасці чалавека рускай мовы, што ў найбольшай ступені дасягалася планамерным правядзеннем адпаведных адміністрацыйных захадаў. Пахвальна, што была падкрэслена неабходнасць больш клапаціцца пра стан родных моваў тытульных нацый саюзных і аўтаномных рэспублік. І з гэтым нельга не пагадзіцца. Бо калі на іх тэрыторыі знікне мова той ці іншай этнічнай групы, то вялікай трагедыі не адбудзецца, паколькі яе мова застанецца ў сваёй краіне — метраполіі. А вось калі такое здарыцца з мовай тытульнага народа — гэта ўжо катастрофа. Тут ніякая дыяспара не ў стане выправіць становішча. Мова найлепш за ўсё пачувае сябе на сваёй этнічнай радзіме. Зразумела, калі ў гэтым зацікаўлены ўлады, само грамадства. Такое ў найбольшай ступені было характэрна для прыбалтыйскіх і закаўказскіх рэспублік. Заварушылася і Малдавія. 26 студзеня 1989 года Прэзідыум ВС гэтай рэспублікі прыняў пастанову, якой даручалася пастаянным камісіям да сакавіка распрацаваць праекты законаў «Аб статусе малдаўскай мовы» і «Аб функцыянаванні малдаўскай, рускай і іншых моваў на тэрыторыі Малдаўскай ССР». І ў кабінетах самых высокіх партыйных і савецкіх органаў Беларусі гэтае пытанне ўсё часцей і часцей ставілася на парадак дня.

**Заканчэнне ў наступным нумары**

СПАДЧЫНА

# ЛЕГЕНДАРНЫ ДОКТАР УСЕВАЛАД ШЫРАН

Сяргей ЧЫГРЫН

**Польскі штогоднік «Rocznik Parafii Swetego Krzyza» за 1991–1993 гады апублікаваў вынікі пяцігадовых пошукаў ахвяр Беразвечча (беларускай Катыні) на Віцебшчыне. Сярод іх быў і наш зямляк з Беласточчыны доктар Усевалад Шыран.**



Штогоднік пісаў, што 13 красавіка 1991 года адбылася ўрачыстая імша ў Беразвеччы па бязвінна закатаваных суайчынніках. Такое ж ушанаванне ахвяр НКУС адбылося і ў вёсцы Мікалаёва каля Улы Бешанковіцкага раёна. У той 1939 год, калі Заходняя Беларусь адышла да Усходняй, было арганізавана каля 200 турмаў, якія сталі месцам дзікіх злачынстваў. Там закатавалі насмерць каля 1000 чалавек.

Усевалад Шыран нарадзіўся 11 сакавіка 1906 года ў вёсцы Лась Мазавецкага ваяводства (па іншай інфармацыі, ён нарадзіўся ў вёсцы Лапы) на Беласточчыне. Спачатку вучыўся ў Ломжынскай гімназіі, а потым працягваў вучобу ў Навагрудскай гімназіі імя Адама Міцкевіча, якую скончыў 9 чэрвеня 1925 года.

Пасля заканчэння Навагрудскай гімназіі Усевалад Шыран паступіў у Віленскі ўніверсітэт імя Стэфана Баторыя на медыцынскі факультэт. Ужо на трэцім курсе ён пачаў працаваць на кафедры ў якасці малодшага асістэнта апісальнай анатоміі, самастойна праводзіў навуковыя даследаванні. Адначасова Усевалад пачаў цікавіцца і палітыкай. Яго хвалявалі пытанні нацыянальнай і сацыяльнай справядлівасці, адраджэнне нацыянальнай беларускай самасвядомасці.

13 сакавіка 1932 года юнак з Беласточчыны выдае на беларускай мове ў Вільні першы нумар палітычнага і літаратурнага «Часопіса для ўсіх» накладам 2 тысячы асобнікаў. Але польская паліцыя хутка тыраж часопіса ліквідавала, а далейшае яго выданне забараніла. Сам рэдактар быў адпраўлены ў Лукішкі. У гэтым выданні непасрэдны ўдзел прымаў і Максім Танк, якога таксама хутка арыштавала дэфензіва і пасадзіла ў Лукішкі.

Нядаўна Андрэй Майсяёнак, прафесар з Гродна, перадаў мне копію пісьма Максіма Танка да яго. Пісьмо было напісана 27 лютага 1988 года. Спадар Майсяёнак цікавіўся тады Усеваладам Шыранам і пытаўся ў Танка пра яго. Народны паэт Беларусі пісаў: «На вялікі жаль, вельмі мала захавалася ў маёй памяці звестак пра Усевалада Шырана, бо з таго часу, калі я з ім сустракаўся, мінула больш за 50 год. Пазнаёміў мяне з ім адзін з кіраўнікоў камуністычнага падполля вясной 1932 года. Шыран тады збіраўся выдаваць прагрэсіўны журнал «Часопіс для ўсіх». У гэтым часопісе, які адразу быў канфіскаваны польскай цэнзурай, былі змешчаны мае апавяданні і вершы. З таго часу сувязі з маім рэдактарам на нейкі час перарваліся. І толькі вясной 1933 года, калі я працаваў у падполлі, я зноў сустрэўся з Усеваладам Шыранам у Лужках на Дзісненшчыне…»

Сапраўды, калі наш зямляк трапіў у турму, ён ужо меў дыплом урача Віленскага ўніверсітэта. Але прафесія — прафесіяй, а палітыка — палітыкай. Менавіта палітыка перашкодзіла Усеваладу Шырану застацца працаваць ва ўніверсітэце, займацца навуковай дзейнасцю. 1 мая 1932 года ўсе планы маладога ўрача рухнулі.

Ратаваць аднакурсніка і сябра, а пазней мужа, пачала яго сяброўка па жыцці Браніслава Смольская. Дзякуючы ёй, Усевалада вызвалілі пад заклад. Дапамаглі гэта зрабіць прафесары з Вільні Сенгалевіч і Райхер, якія пазычылі спадарыні Смольскай 300 злотых. А 30 верасня 1933 года Віленскім следчым аддзелам справа была закрытая з-за недастатковых доказаў.

Пасля турмы Усевалад Шыран разам з Бранілавай Смольскай вырашылі пакінуць Вільню і паехаць дзесь у глыбінку. Месцам працы яны выбралі вёску Лужкі на Дзісненшчыне. Там іх мясцовая ўлада сустрэла не вельмі добра. Але Бранілава Смольская ўладкавалася працаваць у бальнічную касу, а Усевалад Шыран захапіўся прыватнай медыцынскай практыкай. І ў яго атрымалася даволі паспяхова. Слава пра доктара Шырана хутка разышлася па ўсім Дзісненскім і суседніх паветах. З пісьма Максіма Танка да Андрэя Майсяёнка: «Відаць, з Усевалада Шырана быў харошы доктар, бо слава аб ім ішла далёка па ўсіх суседніх гмінах, бо ён, як тады казалі, лячыў ад усіх хвароб…»

І гэта было так. Доктар мог абыходзіцца практычна без спецыялістаў і выконваў самыя складаныя хірургічныя, акушэрскія, афтальмалагічныя і отларынгалагічныя аперацыі. На свае ўласныя грошы ён купіў і меў у Лужках медыцынскае абсталяванне, даволі дарагое па тым часе. Гэта расказаў мне Андрэй Майсяёнак, які меў сустрэчу пры жыцці з Бранілавай Людзвікаўнай Смольскай і якая яму распавядала пра дзіўны дар Усевалада Шырана як гісторыка, літаратара, публіцыста і медыка. А да таго яшчэ і выдатнага пчалавода і селекцыянера, які вырошчваў незвычайныя гатункі кветак і кавуноў.

Але мясцовыя польскія дактары ім былі незадаволеныя, бо яны страчвалі пацыху сваю кліентуру. Ды і паліцыя за Шыранам пільна сачыла. Таму ў 1937 годзе ён з сям'ёй пакідае Дзісненшчыну і пераязджае ў Высока-Літоўск.

З архіўных дакументаў, якія захоўваюцца ў Брэсцкім абласным архіве, можна даведацца, што Усевалад Шыран польскімі ўладамі падазраваўся ў дзейнасці, накіраванай супраць тагачаснага ўрада Польшчы. Шлях у афіцыйныя дзяржаўныя ўстановы яму быў закрыты, таму і ў Высока-Літоўску наш зямляк займаўся прыватнай медыцынскай практыкай. Не забываў ён і Лужкоў, куды зрэдзь часу наведваўся, лячыў людзей, даваў кансультацыі.

Там, у Лужках, ён сустрэў і 17 верасня 1939 года. З прыходам савецаў, ён з сям'ёй зноў вярнуўся на Дзісненшчыну. У маёнтку Гарадзец Усевалад Шыран з жонкай Бранілавай разгарнуў узорны стацыянар на 100 ложкаў, куды прывёз усё прыватнае медыцынскае абсталяванне. У той час не хапала медыцынскіх кадраў, таму доктар Шыран арганізаваў курсы медыцынскіх сясцёр.

Той жа Андрэй Майсяёнак пра доктара Шырана ў шаркаўшчынскай раённай газеце «Кліч Радзімы» ў 1988 годзе пісаў: «Вельмі хутка ўзрасла актыўнасць Лужкоўскай бальніцы. Медыцынская сітуацыя стала хутка паляпшацца. Таленавіты хірург змог арганізаваць правядзенне ў мясцовых умовах складаных хірургічных аперацый, а таксама дэталёвы догляд у пасляаперацыйным перыядзе. Цікава, што менавіта ў гэты час ён шырока карыстаўся «стацыянарам на даму», аб якім так многа размоў сёння. Ён шчодра дзяліўся сваімі ведамі з прадстаўнікамі савецкай аховы здароўя, прапаноўваў арыгінальныя метады лячэння розных захворванняў, аб чым пісаў у рэдакцыю ўсесаюзнай газеты «Медицинский работник», актыўна ўдзельнічаў ва ўсіх мерапрыемствах савецкай улады. Не застаўся забытым і выведзены гатунак кавуноў — ён быў прапанаваны Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках. Савецкія даследчыкі з разуменнем і ўвагай аднесліся да яго».

Яшчэ ў сярэдзіне 1930-х гадоў Усевалад Шыран друкаваў у заходнебеларускіх часопісах свае вершы, якія змяшчаліся побач з вершамі Міхася Машары. Ды справа была далёка не ў літзаслугах, а ў незалежных паводзінах нашага доктара пры паляках і папулярнасці яго як лекара. Як чалавека знанага на Дзісненшчыне, родам з Беласточчыны, яго ў 1939 годзе дэлегавалі на Народны сход у Беластоку, які фармальна вырашаў лёс Беларусі. Дэпутатам Народнага сходу быў абраны і Міхась Машара, які першым з заходнебеларускіх паэтаў напісаў хвалебны верш пра Сталіна.

Вершаў Сталіну Усевалад Шыран не пісаў і не думаў пісаць. У чэрвені 1941 года яго арыштавалі органы НКУС. Савецкай уладзе значна больш, чым польскай, мог не падабацца яго нонканфармізм і нацыяналізм. Можа, былі і якія-небудзь іншыя прычыны, адзін Бог ведае. Але пасля арышту ў спешцы супрацоўнікі НКУС легендарнага доктара Усевалада Шырана расстралялі.

Працуючы над пошукамі звестак пра нашага земляка, напісаў ліст да даследчыка заходнебеларускай літаратуры і культуры Арсеня Ліса і спытаўся ў яго, што ён ведае пра Усевалада Шырана. Арсень Сяргеевіч адказаў: «Рады, што вы, руплівы шукальнік і вярталънік нашай спадчыны, хочаце вырваць з цемры забыцця імя Усевалада Шырана. Калісь у маладосці сустракаў яго вершы ў часопісе «Шлях моладзі» за другую палову 1930-х гадоў. У «Калоссі», праўда, хоць поўны камплект не трапляў, здаецца, публікацый яго з чатыры было. Вершы не зрабілі ўражання. Але, пачуўшы ад светлай памяці Яўгена Іванавіча (маецца на ўвазе Максіма Танка — С.Ч.) пра яго гвалтоўную смерць у чэрвені 1941 года, быў узрушаны. Даведаўся, што Усевалад Шыран быў папулярны на Дзісненшчыне як доктар, лекар і як чалавек незалежных поглядаў, асоба. Фота, на жаль, яго падабізны нідзе не даваліся бачыць. Думаю, што можна знайсці ў Вільні. Напэўна, ён заканчваў медыцынскі факультэт пры ўніверсітэце, і там захавалася яго асабістая справа, куды звычайна далучалі фотакартку. Відаць, ёсць яна і ў справе, якая захоўваецца ў Мінску ў архіве КДБ, але цяпер той архіў недаступны. Вось і ўсё, што магу вам сказаць пра Усевалада Шырана».

АБ'ЯВА

Пасольства Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь, Польскі Інстытут у Мінску, Літаратурны музей імя Адама Міцкевіча ў Варшаве, Беларускі ПЭН-Цэнтр маюць гонар запрасіць на міжнародны фестываль

**«ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ПАЭЗІІ», прысвечаны 100-годдзю нобелеўскага лаўрэата Чэслава Мілаша**

**(Мінск, 8–9 верасня 2011)**

Наталля Гарбанеўская (Польшча/Францыя/Расія), Рышард Крыніцкі, Яцэк Гутараў, Кшыштаф Чыжэўскі (Польшча), Эўгеніюс Алішанка, Вітас Дэкшніс, Данатас Пятрошус (Літва), Марыяна Кіяноўская, Алег Лышэга (Украіна), Уладзімір Арлоў, Ігар Бабкоў, Марыя Мартысевіч, Алесь Разанаў, Віталь Рыжкоў, Андрэй Хадановіч (Беларусь)

**8 верасня, 18.30**

Адкрыццё выставы «Чэслаў Мілаш»

Прэзентацыя беларускага чатырохтомніка Чэслава Мілаша: «Вяртаванне», «Даліна Ісы», «Родная Еўропа» і «Зямля Ульра».

Паэты-ўдзельнікі фестывалю, перакладчыкі мілашаўскай паэзіі і акторы Купалаўскага тэатра чытаюць творы Мілаша на сваіх мовах.

Прэзентацыя аўдыёкнігі Чэслава Мілаша «Чалавек шматпавярховы»: Андрэй Хадановіч і гурт «Рацыянальная дыета».

Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі (вул. Інтэрнацыянальная, 30).

**9 верасня**

11.00. Круглы стол «Мілаш шматпавярховы» з удзелам паэтаў, перакладчыкаў, інтэлектуалаў з Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны. Галерэя «Ў нескладовае» (прасп. Незалежнасці, 37а). 19.00. Паэты-ўдзельнікі фестывалю чытаюць свае вершы. У межах імпрэзы: прэзентацыі кнігі Марыі Мартысевіч «Амбасада» і Віталя Рыжкова «Дзьверы, замкнёныя на ключы».

Таццяна Беланогая спявае свае песні на словы Чэслава Мілаша.

Дом культуры ветэранаў (вул. Я. Купалы 21).

Уваход на ўсе імпрэзы фестывалю вольны.

ЦІКАВА

# АЛЕГ СКРЫПКА Ў «КАМЯНІЦЫ»

**З верасня пад Мінскам адбудзецца фолк-фэст «Камяніца». Мерапрыемства ўзначаляць беларускія гурты «Троіца», «Osimira», а таксама лідар украінскага рок-гурта «Воплі Відаплясава» Алег Скрыпка.**

Фэст адбываецца ўжо трэці год запар у Музеі народнай архітэктуры і побыту на тэрыторыі якога знаходзіцца ўнікальная калекцыя аўтэнтычнай беларускай драўлянай архітэктуры. Мэта мерапрыемства — прапаганда беларускай культуры і дапамога музею. Усе грошы за ўваход ідуць на рахункі гэтай установы, дапамагаючы захоўваць экспанаты.

Для кожнага з хэдлайнераў фестывалю выступ на сёлетняй «Камяніцы» будзе знакавым. Этна-трыа «Троіца» ўпершыню прадставіць у Беларусі на вялікай сцэне свой ухвалены крытыкамі новы альбом «Зімачка». Магілёўскі гурт «Osimira», які добра ведаюць у Расіі, Украіне і Польшчы, выступіць у Мінску ўпершыню ад 2007 года. А для лідара «Воплі Відаплясава» Алега Скрыпкі гэта першы ў Беларусі выступ з фолк-праграмай.

«Алег Скрыпка — не толькі знакаміты рок-музыка, але і вядомы прапагандыст украінскай культуры, у тым ліку народнай. Напрыклад, ён з'яўляецца заснавальнікам і кіраўніком вядомага ўкраінскага фолк-фэсту «Краіна мрій» і розных яго адгалінаванняў, — распавядае каардынатар «Камяніцы» Сяргей Чыгрынец. — Яму цікава паказаць беларускай публіцы сваю фолкавую праграму, паглядзець, як гэта адбываецца ў нас, знайсці нейкія новыя гурты для свайго фэсту. Нам вельмі прыемна, што гэта не проста нейкія грашовыя стасункі».

Уваход будзе адбывацца па квітках музею, якія каштуюць 10 тысяч рублёў для дарослых і 5 тысяч рублёў для школьнікаў. Наведнікі будуць мець магчымасць не толькі паслухаць музыку, але і паглядзець усю экспазіцыю. Папярэдні продаж квіткоў — вул. Кальварыйская, 17 – 614, тэл.: (017) 209 41 63. Даведка: (029) 670 13 30.

КІНО

# КОНАН У ТАМАЦЕ

Андрэй КРЫНІЦЫН

**Паўтор фантазійнага эпасу пра варвара Конана вылучаецца працьмай мярзотных сцэнаў і адсутнай акцёрскай гульнёй. Пластыкавы «Конан-варвар» Маркуса Ніспэла атрымлівае паўтары зоркі з пяці.**




У далёкія дагістарычныя часы варвар Конан нарадзіўся падчас бітвы. Калі ён быў падлеткам, чорны маг Халар Зім забіў ягонага бацьку і спаліў родную вёску. Пасталеўшы, Конан марыць адпомсціць і шукае старога ворага. Герой знаходзіць яго, калі выратоўвае прыгажуню Тамару. Маг палюе за прыгажуняй, каб скарыстаць яе ў крывавым рытуале ажыўлення памерлых. Але на шляху чорнага мага стане Конан.

Фэнтэзі Маркуса Ніспэла — яшчэ адна варыяцыя на тэму Конана-варвара, прыдуманага ў 1932 годзе Робертам Говардам. Самым знакамітым Кананам-варварам быў Арнольд Шварцэнегер, які сыграў яго трыццаць гадоў таму. Распаўсюднікі новай версіі рэкламуюць карціну як галоўную сёлетнюю кінападзею, што мусіць засланіць стары фільм кампутарнымі і 3D-эфектамі. Эфекты, сапраўды, маюцца, але што да зместу, формы і сэнсу, дык гэта нудная крывавая мясакрутка, дзе дабро па садызму пераплюне любое зло.

Конан з асалодай катуе ворагаў, тыкае пальцамі ў крывавую дзірку ад носа, кідае людзей катапультамі. Стужку са Шварцэнегерам абвінавачвалі ў жорсткасці, але карціна Маркуса Ніспэла, які пачынаў кар'еру з паўтору «Тэхаскай разні», — гэта жорсткасць шчодрымі пластыкавымі вёдрамі. Мазгі выбіваюцца на буйным плане, раны зззяюць, скура лопаецца. Але, акрамя гучных адмысловых эфектаў, у фільме адсутнічае акцёрская гульня і хоць нейкая харызма галоўнага героя. Рон Перлман (бацька Конана) і Роўз МакГонан (шальная прынцэса-ведзьма) пераігрываюць белазубага Джэйсана Мамоа (Конана) адной левай. У прынцыпе, яго магла сыграць шафа.

Паказальна, што Мамоа ненавідзіць коней, таму замест яго катаўся дублёр.

Фальшываму кіно — фальшывае выкананне.




Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.
ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284—85—11.
ВЫДАВЕЦ: Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1-1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81
novychas@gmail.com; www.novychas.org
НАДРУКАВАНА ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.
Замова № 899

Падпісана да друку 26.08.2011. 8.00.
Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацтва творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.